№ 47 (453) 16 сьнежня 2005 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

**Каб гарантавана чытаць «Нашу Ніву» пасьля Новага году, 1) дашліце на адрас Рэдакцыі свой дакладны паштовы адрас і тэлефон, 2) пералічыце на рахунак «Нашай Нівы» ахвяраваньне на выхад газэты з разьліку 18 000 рублёў на квартал.** «Саюздрукі» разарвалі дамовы на распаўсюд «НН», «Белпошта» не ўключыла газэты ў падпісны каталёг. З 1 студзеня вы больш ня купіце газэты сваёй душы ў шапіках. У такой сама сытуацыі апынуліся 16 іншых выданьняў. Дасылайце ў Рэдакцыю адрас, на які мусіць дасылацца/дастаўляцца газэта, паштовы індэкс, пры наяўнасьці — код пад'езду, пры магчымасьці — нумар тэлефона. Асаблівая просьба да тых, хто разьлічвае з Новага году чытаць «НН» у Інтэрнэце: таксама дасылайце ахвяраваньні. Бяз збору грошай газэце не захаваць сваёй якасьці. Грамадзтва ня можа нармальна разьвівацца без свабодных СМІ. Рэжым паказаў, што яму гэта няважна. Цяпер адказ за вамі. **Блянкі ахвяраваньняў — на старонцы 3.**

## У НУМАРЫ

**Бюджэт-2006: ні праўкі**
У панядзелак палата прадстаўнікоў прыняла ў першым чытаньні закон аб бюджэце на наступны год, ня ўнёсшы ў пададзены прэзыдэнтам праект ніводнае праўкі. **Старонка 6.**

**Расея абвясьціла Ўкраіне газават**
З Украіны патрабуюць 220 даляраў за тысячу кубоў газу, тады як зь Беларусі — 46. **Старонка 2.**

**Героі побач**
Зайздрасьць не дае нам убачыць нашых надзвычайных людзей. Хаця беларускія героі жывуць побач з намі. Сядзяць на «хіміях», вывешваюць сьцягі, аднаўляюць спадчыну, пішуць кнігі, выдаюць газэты. Урэшце, проста размаўляюць па-беларуску. Піша Руслан Равяка. **Старонка 5.**

**Глючны Магілёў**
Неймаверная энэргетыка новага магілёўскага року. **Старонка 9.**

**Уладзімер Кушаль: «Мае бацькі ў нацыянальным пытаньні аказаліся наіўнымі»**
Упершыню даў інтэрвію сын Натальлі Арсеньневай і Франца Кушаля. **Старонка 16.**

**Рукі прэч ад Лукіча!**
Гастранамічнае апавяданьне Сяргея Астраўца. **Старонка 18.**

# Нацыю ўратуюць кніг@ношы

А галоўны кніганоша — Інтэрнэт? Старонка 13.




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Мілінкевіч сьпіць у мікрааўтобусах

Паездкі новага лідэра апазыцыі па краіне выклікаюць шаленства ўладаў і бурчаньне зайздросьнікаў. Ці ёсьць ад паездак толк? Старонка 12.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Ахвяраваньні ад падпісчыкаў

Дзякуем Сяргею А. зь Менску, які ахвяраваў на выхад газэты 500 тысячаў рублёў, Анатолю В. зь Менску, які ахвяраваў на выхад газэты 100 тысячаў рублёў, В.Ш. зь Менску, які ахвяраваў 86 тысячаў, Таісе М., якая цяпер у Маскве, якая ахвяравала на выхад газэты 215 тысячаў рублёў. Дзякуем таксама

Іосіфу Дз. з Гарадзенскага р-ну,

Г.Г., Яўгену Б. зь Берасьця,

Уладзімеру Ц., Анатолю П. з Салігорску,

Тацяне М., Сяргею Т., Барысу В. з Баранавіч,

Уладзімеру Д. з Чэрвеньскага р-ну,

Надзеі Л. зь Пінску,

Аляксандру Б. з Капыльскага р-ну,

Івану Л. зь Вялейскага р-ну,

Аляксандру П., Анатолю С. з Мазыра,

Леаніду Л. з Маладэчна,

Мікалаю В. з Пружанскага р-ну,

Людміле Л. з Крычаўскага р-ну,

Людміле Г. з Маладачанскага раёну,

Т.П. з Гарадоцкага р-ну,

Уладзімеру М., Паўлу С., Івану В., Дзьмітрыю П. зь Менскага раёну,

Алегу Ш. з Шаркаўшчынскага р-ну,

Д.Р., Але П., Аляксею П., Ч-ру Я., Вользе С. з Горадні,

В.Ш. з Круглянскага р-ну,

Анатолю А., Веры К., Любові Л., Аляксандру Л., Кацярыне П., Францу С., Леаніду Д., Аляксандру Л. зь Віцебску,

Аляксандру Б. з Полацку,

Алене Б., Сяргею П., Уладзімеру С., Алене Б., Кірылу Г., Канстанціну П., Валер'ю Г., Лідзіі С., Сяргею П., Міхасю Г. з Гомелю,

Міхайлу Т. з Слуцку,

**Працяг на старонцы 3.**

**Вельмі просім чытачоў, якія маюць намер ад Новага году чытаць «НН» у Інтэрнэце, а не на паперы, таксама дасылаць прыватныя ахвяраваньні з разьліку 6000 на месяц з пазнакай: «за Інтэрнэт». Бяз збору грошай газэце не захаваць якасьці.**

# Расея абвясьціла Ўкраіне газават

«Газпром» адмовіўся прадаваць газ Украіне па $50 за тысячу кубамэтраў, як раней. З 1 студзеня паліва для Ўкраіны па сярэднеэўрапейскай цане — $220—230 за тыс. кубамэтраў. У сераду ААТ «Газпром» вуснамі сваёй прэс-службы абвінаваціла ўкраінскія ўлады ў тым, што Кіеў наўмысна зацягвае перамоўны працэс: «Сёньня відавочна, што Ўкраіна ўпусьціла час, калі ўзровень цаны ў $160 за тысячу кубамэтраў газу можна было лічыць рынкавым».

Аднак кіраўнік праўленьня «Газпрому» Аляксей Мілер ў этэры тэлеканалу «Russia Today» заявіў, што «Газпром» гатовы пайсьці на кампраміс з Украінай ў пытаньні паставак газу, прапануючы супрацоўніцтва ў сфэры транспарту газу праз газатранспартны кансорцыюм. У якасьці прыкладу «пазытыўнага супрацоўніцтва» Мілер назваў Беларусь.

У сераду першы намесьнік старшыні праўленьня кампаніі «Нафтагаз Украіны» Андрэй Лапушынскі заявіў журналістам, што «Газпром» прапанаваў Украіне разглядзець пытаньне пра супольнае выкарыстаньне газатранспартнай сыстэмы Ўкраіны. (Сетка «Ўкртрансгазу» складае 36 тыс. км газаправодаў, 71 кампрэсарную станцыю, 12 сховішчаў газу.)

«Украіна ня мае намеру кіраваць сваёй газатранспартнай сыстэмай разам з Расеяй. Гэтае пытаньне ня можа нават абмяркоўвацца. Гэта стратэгія Ўкраіны», — заявіў Лапушынскі, таксама зазначыўшы, што «Нафтагаз» адкідае абвінавачаньні, што Ўкраіна парушае ўмовы транзыту і аплаты расейскага газу.

У сераду ў Кіеве прайшло пасяджэньне Рады нацыянальнай бясьпекі і абароны, дзе было прынята рашэньне цераз МЗС разаслаць ноты ў эўрапейскія краіны, дзе расказаць пра сытуацыю вакол блакітнага паліва.

Віктар Юшчанка прапанаваў «Газпрому» не прыбягаць у газавым пытаньні да палітычных спэкуляцый.

Нават у Расеі многія называюць крокі «Газпрому» шантажом, падкрэсьліваючы, што Ўкраіну «замовіў» Пуцін і што зроблена гэта перад вырашальнымі парлямэнцкімі выбарамі, што пройдуць у сакавіку. «Гэта на першы погляд здаецца, што і Расея, і «Газпром» выйграюць ад падвышэньня цэнаў на газ для Ўкраіны, — кажа кіраўнічы дырэктар East European Gas Analysis Міхаіл Карчомкін. — Цяпер нішто не замінае Ўкраіне падняць транзытны тарыф да ўзроўню, пры якім яна зможа купляць на даход ад транзыту столькі газу, колькі ёй неабходна... У выніку «Газпром» ня толькі не атрымае прыбылі, а наадварот — прайграе».

«Газпром» хоча паставіць Украіну на калені. Але імаверна, што непрыкрыты эканамічны шантаж зробіць Маскве больш шкоды ў выглядзе страты рэпутацыі на міжнароднай арэне, чым карысьці. Як кажа расейская прымаўка: насільна міл ня будзеш.

**Мікола Бугай**

## «Белгазета»: няма газэтаў — няма праблемы

Неўключэньне ў падпісны каталёг шаснаццаці незалежных газэтаў і выгнаньне іх з «Саюздруку» — адна з найважнейшых падзеяў лістапада-сьнежня. Дзяржаўная прэса пра яе, зразумела, ні словам не абмовілася. Зьвернем ўвагу, што сытуацыю цалкам замаўчала і «Белгазета». Чаму? — запыталіся мы.

Намесьнік галоўнага рэдактара Канстанцін Міхееў адмовіўся камэнтаваць, спаслаўшыся, што паўтара месяца хварэў. Ягоны калега Віктар Марціновіч патлумачыў, што ня мае паўнамоцтваў камэнтаваць рэдакцыйную палітыку, параіўшы зьвярнуцца да галоўнага рэдактара. Ігар Высоцкі, галоўны рэдактар: «Усё гэта хлусьня. Мы пісалі пра татальную зачыстку інфармацыйнай прасторы некалькі тыдняў таму. Ня памятаю, хто з журналістаў пісаў». Мы шукалі: тры нумары таму знайшліся гутаркі з Паўлам Якубовічам і Рамуальдам Уланам пра агульныя праблемы з свабодай прэсы, пра ўсё харошае. Без інфармацыі, аднак. Гэта ня першы выпадак, калі «Белгазета» абыходзіць вострыя тэмы. Былая супрацоўніца «Белгазеты» Ірына Чарняўка з скрухаю ўспамінае: «Падчас працы я сутыкалася з выпадкамі, калі матэрыялы пра перасьлед журналістаў незалежных выданьняў ці пра сытуацыі зь Леванеўскім, Барыс не друкаваліся. Галоўны рэдактар такое ігнараваньне тлумачыў «адсутнасьцю інтарэсу ў чытачоў да тэмы». Для журналісткі такі падыход быў непрымальны, і яна спыніла супрацоўніцтва з выданьнем. «Новая назва — старыя прынцыпы», як гаворыць рэкляма выданьня.

Сама «Белгазета» праблемаў з распаўсюдам праз падпіску ці шапікі ня мае.

**Сямён Печанко**



Юлія Дарашкевіч

**Галоўная ялінка краіны. Менск. Кастрычніцкі пляц.**

## УЛАДЗІМЕР ЛОБАЧ

БРАТУ

Нас стваралі багі не з вады,
Нас бацькі зачынялі ня ў клетках —
Гэта нашыя гарады!
Гэта нашы з табой палеткі!

Тут ляжаць у курганах дзяды
Пад крыжамі і зорнай паветкай —
Гэта нашыя гарады!
Гэта нашы з табой палеткі!

Мы сьмяёмся гады ў рады,
Ды ня нам шчыраваць на аб'едках —
Гэта нашыя гарады!
Гэта нашы з табой палеткі!

І ты помні, што мы — браты,
Як на брата пацягнуць ў сьведкі, —
Гэта нашыя гарады!
Гэта нашы з табой палеткі!

На памінках вусатай бяды
Разаб'юцца гіпсовыя зьлепкі —
Гэта нашыя гарады!
Гэта нашы з табой палеткі!

Для сяброў адкаркуем мяды
І жанчынам падорым кветкі —
Гэта нашыя гарады!
Гэта нашы з табой палеткі!

І ў свой час, на сваёй зямлі
Ўнукі нас пахаваюць і дзеткі,
Бо ГЭТА НАШЫЯ ГАРАДЫ!
ГЭТА НАШЫ З ТАБОЙ ПАЛЕТКІ!

**Вершы Ўладзімера Лобача — старонка 19.**

## Наступны нумар «НН» — Калядны

У ім «НН» традыцыйна падсумоўвае вынікі году, а таксама друкуе падборку «Сем апавяданьняў на сем калядных вечароў». У Калядным нумары — асобы году, кадры году, кнігі году, песьні году і шмат іншага. Гэта апошні нумар, які можна атрымаць праз падпіску «Белпошты» й купіць у шапіках «Белсаюздруку». Далей усё залежыць ад вас. Не забудзьцеся даслаць Ваш адрас у Рэдакцыю і перакаказаць ахвяраваньне праз банк ці пошту.


## ПРАЦА




Газэта «Наша Ніва» шукае кур'ера-распаўсюдніка для працы з 1 студзеня. Праца для мужчыны, найлепш — з уласнаю машынаю. Аплата высокая. Зьвесткі пра сябе дасылайце на э-адрас nn@promedia.by, факс 284-73-29 або паштовы адрас а.с.537, 220050 Менск.


## АНОНС

**У № 1 за 2006 год**

**«Палямон. Коды легенды».** Палямон ня быў рымлянінам, толькі грэкам, ды яшчэ й жыдаватым. А аўтарам легенды пра Палямона быў... вы ведаеце гэтага чалавека! Гістарычную таямніцу разгадаў гісторык Алег Латышонак.

**«Шлях дробнай сволачы».** «НН» пачынае друкаваць аповесьць Евы Вежнавец.

# Дзякуй за ахвяраваньні на выданьне «НН»:

**Працяг са старонкі 1.**

Віктару А., Алене А. з Магілёва,

Сяргею А., яшчэ аднаму Сяргею А., Ільясу Х., В.А., Нэлі А., Вользе Б., Л.Г., Андрусю Дз., Алесю Дз., Сьвятлане Д., Міхаілу З., Ігару З., Андрэю К., Аляксею К., Уладзімеру Л., Георгію М., Барысу М., Уладзімеру Н., Зьмітру П., Паўлу П., Аляксандру П., Крысьціне П., Сьвятлане Р., Уладзімеру С., Зьмітру С., Але С., Алегу Ф., Сяргею Ц., Паўлу Ч., Мікалаю Ш., Лявону Б., Аляксандру К., Анатолю А., Алесю К., Вользе Я., Вадзіму Г., Аўгіньні Б., Паўлу І., Валянціну Л., Настасьсі Т., Юр’ю Г., Ігару П., Сьвятлане Ш., Яніне Г., Уладзімеру К., Т.Е., А.Л., Марыне Б., Л.Ж., Дзьмітрыю Г., Андрэю Ю., Натальле Ж., Леаніду Г., Аляксандру Д., Міхаілу Ш., Міхаілу Ж., Ігару Х., І.П., Тацяне М., Сьвятлане Р., Дыяне Д., Анатолю З., Эдуарду С., Тацяне М., Эдуарду П., Анатолю Г., Аляксандру М., Сяргею Я., Уладзімеру К., Тацяне В., У.М., Марыі С., Юр’ю Б., Раісе К., Фёдару П., Паўлу П., Генадзю Б., Ганьне Д., Алене Т., Эрнэсту Г., Аляксандру С., В.М., А.К., Зьмітру В., В.Ш., Ігару С., Н.З., Мікалаю Ж., Аляксандру П., Алене А., Але К., Натальле К., Раісе Б., Зьмітру С., А.Д., Т.Ж., Людміле Л., Леаніду І., В.Я., М.Н., Кацярыне Ш., Аляксандру Ш., Віктару Л., Віктару М., Рэгіне Б. зь Менску.

Спадары Ахраменка В.К, Жукоўскі К. і Аліна Н., калі ласка, дашліце Вашыя адрасы. Спадарыня Н.Ч–ка з Баравікоў, калі ласка, дашліце свой дакладны адрас. Дзякуй Вам за ахвяраваньні.

# Дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні

1) Просім усіх чытачоў «Нашай Нівы» **як найхутчэй даслаць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны.**

2) Просім усіх чытачоў **да 30 сьнежня пералічыць на рахунак** газэты прыватнае ахвяраваньне з разьліку 6 000 рублёў на месяц. Гэтага будзе досыць для выхаду і дастаўкі газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу, калі ласка, дакладна і разборліва пазначайце Ваш паштовы адрас. Не памыліцеся ў адрасе, калі ласка.** Тыя, хто перакажа 18 000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад газэты на тры месяцы. Хто ж мае магчымасьць пераказаць 36 000 рублёў адразу, забясьпечаць публікацыю «НН» адразу на паўгоду.

**Улічыце, што пры перасылцы грошай паштовым пераказам пошта зьбірае дадаткова 3%, а пры пераводзе грошай праз «Беларусбанк» не бяруць.**

У «НН» у 2006 годзе Вы знойдзеце ўсе навіны беларускага жыцьця, аб’ектыўную інфармацыю і вострыя камэнтары да актуальных падзеяў, а таксама абвесткі, фэльетоны, літаратуру... Чакаюцца скандалы, сэнсацыі і вострыя сюжэты. Дык ахвяруйце!

0402280179
**ИЗВЕЩЕНИЕ**

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521
получатель платежа
МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764
наименование банка

Счет получателя: 3015 212 000 012 — Лицевой счет:

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир — Плательщик

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521
получатель платежа
МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764
наименование банка

Счет получателя: 3015 212 000 012 — Лицевой счет:

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

**КВИТАНЦИЯ**

Кассир — М.П. — Плательщик

лицензия № 02330/0056637 от 27.03.2004 УП «УСЛУГА» Зак. 3504 тир 50 000

Министерство связи Республики Беларусь
№ ________ (по реестру ф. 11)
№ ________ (по реестру ф. 10)

Ф. 112

ИСПРАВЛЕНИЯ НЕ ДОПУСКАЮТСЯ

ПРИЕМ

| Наименование предприятия связи, к - гербовая печать | Календарный шт. места подачи | № по ф. 5 | Сумма, вид услуги, подпись оператора |
|---|---|---|---|

**ПОЧТОВЫЙ ПЕРЕВОД** на ________ руб.

(сумма прописью)

Кому: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521
Куда: р/р 3015 212 000 012 МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764
(почтовый индекс и подробный адрес)

От кого ________

Адрес ________
(почтовый индекс и подробный адрес)

Л И Н И Я О Т Р Е З А

Министерство связи Республики Беларусь

**ТАЛОН**
**к почтовому переводу**

На ________ руб.
От кого ________

Адрес ________
(почтовый индекс и адрес отправителя)

ЛИНИЯ ОТРЕЗА

Министерство связи Республики Беларусь
№ ________ (по реестру ф. 11)

**И З В Е Щ Е Н И Е**
**о почтовом переводе №** ________ (по ф. 5)

На ________ руб.
Кому: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521 р/р 3015 212 000 012
Куда: МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764
(почтовый индекс и подробный адрес)

Явиться за получением с ________ до ________

Отделение связи ________

Обведенное жирной чертой заполняется отправителем

# «Саюздрукі» і «Белпошта» разарвалі дамовы на распаўсюд «НН»

Мы чакалі, што гэта здарыцца. Перад гэтым, як вам ужо вядома, «Нашу Ніву» не ўключылі ў падпісны каталёг на 2006 год. Такія вось падарункі да 100-годзьдзя газэты.

Адначасова з «НН» спынены распаўсюд яшчэ 16 выданьняў, пераважна рэгіянальных. Іншага выйсьця няма, як самастойна распаўсюджваць газэты празь любыя магчымыя каналы.

Да Новага году газэта будзе даходзіць праз падпіску і «Саюздрукі». Пасьля вам трэ будзе атрымліваць газэту іншым чынам. Для гэтага толькі трэба, каб усе ахвотныя — і цяперашнія падпісчыкі, і непадпісчыкі — даслалі адрасы, на якія мусяць дастаўляцца нумары.

Таксама газэта мае інтэрнэт-сайт www.nn.by зь люстэркам за мяжою www.bielarus.info.

Адгортваецца новая старонка ў гісторыі газэты.

У Рэдакцыю тэлефануюць дзясяткі людзей. Многія плачуць: «Мы ня зможам бяз «Нашай Нівы». Для нас гэта быў адзіны суразмоўца на роднай мове». Ня плачце, людзі. Вы адстаіце сваю газэту. Але калі ўжо расплакаліся, запомніце гэтыя сьлёзы. Кожная сьлязінка — гэта рахунак, па якім вы аднойчы запатрабуеце аплаты.

Многія чытачы заклікаюць да вулічных акцыяў пратэсту. У гэтым ці ёсьць сэнс. Давайце прыберажом сілы. Галоўным нашым пратэстам будзе, калі газэта застанецца газэтай, нягледзячы ні на што, і не ператворыцца ў баявы лісток. Каб газэце захавацца, проста дашліце свае адрасы ў Рэдакцыю і пералічыце на рахунак «НН» прыватнае ахвяраваньне з разьліку 6 000 рублёў на месяц.

Калі вы аднойчы не атрымаеце «Нашай Нівы», гэта ня значыць, што газэта перастала выходзіць. Гэта значыць, што вам трэба знайсьці новы спосаб яе атрыманьня.

**Як пратэставаць?**

Просім вас накіроўваць свае лісты пратэсту на адрас генэральнага дырэктара РУП «Белпошта» (пр.Незалежнасьці, 10, 220050, Менск, тэл.226–01–73, факс 226–11–70), міністра сувязі і інфарматызацыі (пр.Незалежнасьці, 10, 220050, г.Менск, тэл.227–38–61, факс 227–21–57) міністра інфармацыі, (пр.Пераможцаў, 11, 220004, Менск, тэл. 206–32–90, факс 203–34–35).

**У лістах пратэсту, калі ласка, ясна і канкрэтна ўказвайце, супраць чаго вы пратэстуеце — неўключэньня газэтаў у падпісны каталёг і разрыву «Саюздрукамі» дамоваў на распаўсюд выданьняў.** Агульныя праклёны на адрас антыбеларускага кіраваньня, як паказвае досьвед, менш эфэктыўныя.

**Каб гарантавана атрымліваць газэту**

дашліце на адрас Рэдакцыі свой дакладны паштовы адрас. Тыя, хто дашле свае каардынаты ў Рэдакцыю, будуць атрымліваць выданьне — праз пошту ці іншым чынам — нават калі б газэце прыйшлося друкавацца за мяжой і распаўсюджвацца самастойна.

У зьвестках пазначайце адрас, на які мусіць дасылацца/дастаўляцца газэта, паштовы індэкс, пры наяўнасьці — код пад'езду, пры магчымасьці — нумар тэлефона.

Адначасова просім кожную сям'ю чытачоў «НН» **да 30 сьнежня пералічыць на рахунак газэты прыватнае ахвяраваньне з разьліку 6 000 рублёў на месяц.** Гэтага будзе досыць для выхаду газэты.

Т.: (017) 284–73–29, (029) 707–73–29, (029) 613–32–32
e-mail: nn@promedia.by
а/с 537, 220050, Менск

Вторичное извещение выписано ________
Плата за доставку ________ руб.

Подлежит оплате ________ (подпись)

| Наименование предприятия | Дата | Номер | Сумма |
|---|---|---|---|
| | | | |

**РАСПИСКА ПОЛУЧАТЕЛЯ**

Сумма ________

Получил "___" ________ 200___ г. (дата) ________ (подпись получателя)

Оплатил ________ (подпись оператора)

Отметки (о досылке, возвращении и причинах неоплаты) ________

(календ. штемп. места получен. или дня перечисления)

ЛИНИЯ ОТРЕЗА

ЗАПОЛНЯЕТСЯ ПОЛУЧАТЕЛЕМ

Для получения денег предъявите это извещение и документ

Предъявлен ________ (наименование документа)
Серия ______ № ________
Выдан "___" ________ ___ г.
Кем ________ (наименование учреждения)
Паспорт прописан* ________
Получатель ________ (подпись)

*Сведения о прописке заполняются только при получении переводов "до востребования"

Оплатил ________ (дата)
________ (подпись)

(календ. штемп. места получ.)

ЛИНИЯ ОТРЕЗА

Для письменного сообщения

**Ахвяраваньне**

**адрас:**

**тэл.:**

Зак. 51

## "Ніва" пра "Нашу Ніву": Час праўды

Крымінальныя справы, "хіміі", карныя калёніі — гэта ня выдумка. Гэта той шлях да беларускасьці, які выпаў на долю нашага народу. І калі рэпрэсіі будуць узмацняцца, то нам, беларусам па-за межамі духоўнай Бацькаўшчыны, трэба будзе праявіць сваю звычайную чалавечую салідарнасьць з пацярпелымі і іх сем'ямі. Хаця і самім нам нялёгка, то наша матэрыяльная і маральная падтрымка пакараным сябрам, знаёмым, усім тым, каму сьняцца сны пра незалежную Беларусь, будзе самым лепшым доказам зразуменьня беларускасьці. Абыякавасьці, пустаслоўя, зьдзеклівасьці ў няшчасьці — таго чакаюць варажэнькі нашы.

Сябры, "нашаніўцы", трымайцеся! Праўда была, ёсьць і будзе па-нашаму, пабеларуску.

**Яўген Вапа, рэдактар газэты беларусаў Польшчы "Ніва". 11 сьнежня.**

# Калі топісься, і за брытву ўхопісься

Заява беларускага кіраўніка пра магчымы ўваход краіны ў Шанхайскую арганізацыю супрацоўніцтва нарабіла фурору не на Захадзе, а сярод расейскіх аналітыкаў. Піша **Аляксандар Класкоўскі**.

Памятаеце, як на пачатку 1999 г. раптам стала мусіравацца ідэя, каб да саюзу Беларусі і Расеі далучылася Югаславія? Зь Бялграду ў Менск снавалі ганцы ад Мілошавіча, рыхтуючы глебу пад хаўрус, які цяжка было патлумачыць геаграфічнымі меркаваньнямі. Але калі топісься, то і за брытву ўхопісься.

Неўзабаве разам з уладай Мілошавіча была пахаваная і тая ідэя дзіўнага альянсу.

Тым часам Менск працягвае ладзіць хаўрусы, што выглядаюць трохі экзатычнымі для краіны ў цэнтры Эўропы. Напрыклад, усяляк разьдзімаецца важнасьць удзелу ў малаўплывовым («рэліктавым», як кажуць асобныя экспэрты) Руху недалучэньня.

Ці вось раптам стаў вялікім сябрам вэнэсуэльскі лідэр Уга Чавэс. Дзе тая Вэнэсуэла, але ж і тысячы кілямэтраў не адлегласьць, калі лучыць палкае жаданьне хоць фігуральна даць у пысу гегеманістам-янкі!

Былы дэсантнік Чавэс, трэба сказаць, усіх пераплюнуў у верасьні з трыбуны сэсіі ААН. І выступ беларускага прэзыдэнта, разьлічаны на сэнсацыю, апынуўся ў цені. На тле Чавэсавых філіпікаў яго можна было нават выдаваць за ўзор амэрыканафіліі.

Вось такія крутыя ў нас сябры.

Разам з тым сёньняшняя Беларусь ніякім бокам не дапасуецца, напрыклад, да нядаўна створанай у Кіеве арганізацыі суседніх краінаў — Супольнасьці дэмакратычнага выбару. На думку беларускага кіраўніка, яе сябры здольныя прапанаваць Эўропе хіба што «злачыннасьць, разбой, бандытызм» ды сумнеўны досьвед таго, «як трэба захопліваць уладу неканстытуцыйным шляхам».

Карацей, нам зь імі не па дарозе. І вось, ідучы адмысловым курсам, Беларусь наважылася адчыніць дзьверы Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Напачатку, магчыма, як назіральніца.

Нагадаю: сёньня ў ШАС уваходзяць Кітай, Казахстан, Кыргызстан, Таджыкістан, Узбэкістан ды Расея. Іначай кажучы, пяць азіяцкіх краінаў і адна эўразійская. Беларусь, калі што, стане ў гэтым хаўрусе адзінай выключна эўрапейскай дзяржавай.

Заўважце: Турцыя, валодаючы ў Старым Сьвеце толькі лапікам зямлі (нават падзелены Басфорам Стамбул — напалову ў Азіі!), усімі фібрамі імкнецца ў Эўразьвяз. Бо, хоць і мае стрэмку ў выглядзе курдзкай праблемы, увогуле даўно і стала выбрала эўрапейскія каштоўнасьці. Між іншым, шмат у чым дзякуючы свайму колішняму «бацьку» — прэзыдэнту Атацюрку (у перакладзе — «бацька туркаў»).

Менск жа хоць і не падзелены Сьвіслаччу між двума кантынэнтамі, але, як зьедліва зазначыў «Московский комсомолец», мэнтальна каму-кольвек тут, пэўна, бліжэйшыя азіяцкія дэспаты.

Зрэшты, не кажы гоп...

Намер афіцыйнага Менску ашчасьлівіць сваім удзелам ШАС нарабіў фурору — дзе б вы думалі? — у братняй Расеі!

Трывогу б'е, у прыватнасьці, Дзьмітры Суслаў з тамтэйшай Рады замежнай ды абароннай палітыкі. Гэту блізкую да Крамля структуру пад кіраўніцтвам вядомага Сяргея Караганава не западозрыш у лабіяваньні заходніх каштоўнасьцяў. Але менавіта ў ейных экспэртаў намер Беларусі ўвайсьці ў ШАС выклікаў засьцярогу.

Лёгіка наступная. Не сакрэт, што пад дахам ШАСу аб'ядналіся рэжымы, у якіх немалыя праблемы з дэмакратыяй. Ім не пад нос адпаведныя прэтэнзіі Вашынгтону. Але раней антыамэрыканізм ШАСу быў лятэнтны. Уголас казалася пра высакародныя мэты барацьбы з тэрарызмам у Азіі (*sic!*), прычым гэтая мэта называлася прыярытэтнай, ды пра развіццё рэгіянальнай (зноў жа: рэгіянальнай!) эканамічнай каапэрацыі.

А вось далучэньне Беларусі, лічыць расейскі экспэрт Дз.Суслаў, будзе азначаць, што ШАС «страціць рэгіянальны складнік, і агульным інтэграцыйным базісам для ўдзелу ў гэтай арганізацыі стане менавіта тып рэжыму». Такім чынам, рэзюмуе аналітык, яна «канчаткова ператворыцца ў арганізацыю недэмакратычных дзяржаў».

Экспэрт папярэджвае, што гэта можа абцяжарыць і так не бязвоблачныя стасункі Крамля з Захадам. То бок — аб'ектыўна пашкодзіць нацыянальным інтарэсам Расеі.

Зь іншага боку, ідэю далучэньня Беларусі да ШАС вітаў пракрамлёўскі паліттэхноляг Глеб Паўлоўскі. Для афіцыйнага Менску гэта можа быць кепскай прыкметай. Паўлоўскі, як вядома, з трэскам прайграў летась гульню супраць «аранжавых» ва Ўкраіне.

Зрэшты, выбар невялікі. Эўропа зачыняе шлягбаўмы. Нават кітайскі амбасадар, адкінуўшы ўсходні палітэс, скрытыкаваў беларускі інвэстыцыйны клімат. І дадаў, што кітайцы не былі б сапраўднымі камуністамі, калі б кепска ставіліся да каляровых рэвалюцыяў. У Менску мусілі зьесьці гэтую пілюлю.

Тым часам у сакратарыяце ШАСу ў Пэкіне заяўляюць, што пытаньне аб прыёме Беларусі ў парадку дня не стаіць. І што ніякіх заявак зь Менску не атрымлівалі.

Карацей, калі з гэтым ША-Сам справа загрузьне, айчынным стратэгам давядзецца страшэнна напружваць мазгі, каб даць чарговы адлуп паклёпніцкім сьцьверджаньням пра міжнародную ізаляцыю.

Слухайце, вы ня чулі, можа, на лядовым мацерыку ёсьць якая-небудзь Супольнасьць антарктычных пінгвінаў?



МАЛЮНАК СЯРГЕЯ ХАРЭЎСКАГА

**«...цяпер яму не падабаецца наша суседзтва».**

# Таня Хома будзе вучыцца па спэцыяльнасьці

Калі ня ў Менску, дык у Познані.

Выключаная зь Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўнівэрсытэту Тацяна Хома працягвае змаганьне за правы навучаньня ў сваёй ВНУ.

У дэканаце яе папярэдзілі, што адзіны магчымы варыянт аднаўленьня — платнае навучаньне. Тацяна ня мае дастаткова сродкаў, таму, хутчэй за ўсё, будзе вучыцца завочна.

Тым часам кіраўніцтва ўнівэрсытэту адрэагавала на акцыі салідарнасьці з адлічанай студэнткай пэрсанальнымі гутаркамі з тымі, хто зьбірае подпісы ў яе абарону.

Выкладчыкі пачынаюць лекцыі з тлумачэньняў дзеяньняў рэктара: «БДЭУ — унівэрсытэт дзяржаўны і мусіць трымацца дзяржаўнай палітыкі, і ў зьвязку з гэтым рэктар мусіў адлічыць Тацяну Хому». «А дзяржава — гэта Ён», — саркастычна прымалёўваюць сабе вусы некаторыя.

Каардынатарка сайту «Studenty.by» распавяла пра тое, як сябрам Тацяны давялося даваць тлумачэньні супрацоўніку КДБ, якога цікавіла дзейнасьць студэнткі, яе погляды.

У сьвеце не спыняюцца акцыі салідарнасьці. Студэнты Беластоцкага ўнівэрсытэту і Беластоцкай політэхнічнай акадэміі зьбіраюць подпісы супраць выключэньня Тацяны з БДЭУ. Познанскія студэнты зьвярнуліся да рэктара тамтэйшай Эканамічнай акадэміі, каб студэнтку прынялі на навучаньне бясплатна і з стыпэндыяй. Калі, зразумела, ня здолее аднавіцца на Радзіме. У Познані моцная суполка беларусаў-эмігрантаў на чале зь Віталем Воранавым.

Сама Тацяна пакуль не прыняла канчатковага рашэньня. Згодна сатуту Аб'яднаньня нацыянальных студэнцкіх зьвязаў Эўропы (ESIB) бліжэйшы час яна мусіць прысьвяціць гэтай арганізацыі, у кіраўніцтва якой яе прынялі. У яе абавязках — паездкі па эўрапейскіх краінах. Таму яна схіляецца да таго, што бліжэйшы год будзе вучыцца ў Эўропе, пажадана бліжэй да Беларусі. Варыянт з Познанскай акадэміяй выглядае для яе прывабна.

**Сямён Печанко**

НАД ШУМАМ ДЗЁН

# Героі побач

**РУСЛАН РАВЯКА**



*Сьветлыя, сьветлыя нашы памерлыя.*
*Цёмныя, цёмныя нашы штодзённыя.*
«N.R.M.»

Зайздрасьць не дае нам убачыць нашых надзвычайных людзей. Хаця беларускія героі жывуць побач з намі. Сядзяць на «хіміях», ладзяць пікеты, вывешваюць сьцягі, аднаўляюць спадчыну, пішуць кнігі, выдаюць газэты. Урэшце, проста размаўляюць па-беларуску. Піша **Руслан Равяка**.

У Беларусі няма герояў. Прынамсі жывых. Усе беларускія героі — нябожчыкі. Нават адзіны Герой Беларусі, лётчык Уладзімер Карват, атрымаў званьне пасьмяротна. І рэч тут ня ў тым, што ў нас няма каму рабіць надзвычайныя ўчынкі. Рэч у нас саміх.

Знаёмы неяк расказваў пра адну сустрэчу ў Маскве, яшчэ за савецкім часам, з адным прафэсарам-расейцам. Той падзяліўся назіраньнем, якое дзівіла маскоўскае навуковае асяродзьдзе. У тыя часы ўсе навуковыя абароны мусілі ўзгадняцца ў сталіцы СССР. Калі абараняўся армянін, у Акадэмію перадавалася скрыня каньяку. Калі грузін — сама меней вялікая бутля віна. Нават украінцы дасылалі разам з навуковай працай добры шматок сала з гарэлкаю. З БССР у Маскву сьледам за працай прыходзіла як мінімум пяць даносаў ці ананімак.

Гэтая зайздрасьць не дае нам убачыць нашых надзвычайных людзей. Хаця беларускія героі жывуць побач з намі. Сядзяць на «хіміях», ладзяць пікеты, вывешваюць сьцягі, аднаўляюць спадчыну, пішуць кнігі, выдаюць газэты. Урэшце, проста размаўляюць па-беларуску.

Так склалася гістарычна, а можа, так патрэбна Богу, што да першаганайлепшага мы ставімся зь недаверам. Спрабуем прынізіць хаця б ва ўласных вачах. Самі не разумеючы гэтага.

Спытай у беларуса пра якога чалавека, дадаўшы: «Вось гэты сапраўды годны чалавек, робіць нешта вартае!» — і пачуеш: «Так, зразумела... Але не такі ён добры... Але не такі ён добры, а накраў ён... Дый ня проста так у яго ўсё выходзіць, няйнакш мае падвязкі наверсе, а магчыма, і супрацоўнічае з…»

Хто думаў з сучасьнікаў Ларысы Геніюш, Францішка Аляхновіча, Вацлава Ластоўскага, што жыве побач зь вялікімі й незвычайнымі людзьмі? Веліч чалавека ў нас разумеюць толькі па яго адыходзе з гэтага сьвету. Нават Быкаў, пакуль быў жывы, не падаваўся нейкім клясыкам. Зрэшты, магчыма, недальнабачны ў гэтым сэнсе ўвесь сьвет. Жылі ж мы ўсе побач, у адзін час са сьвятым чалавекам, але зразумелі гэта толькі пасьля адыходу Яна Паўла II…

Але ж чужынцы ня ганьбяць сваіх. А мы, як у той песьні Шалкевіча, усе чакаем героя-асілка, які нарэшце вызваліць беларусаў ад усяго дрэннага. А герой той ужо даўно памёр. Мы самі яго штодня ўтоптваем ў бруд…

*Баранавічы*

# Бюджэт-2006: ні праўкі



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Пры канцы тыдня зьявілася інфармацыя з канцэрну «Беллегпрам»: Эўракамісія паніжае квоты на беларускі тэкстыль на 2006 год. Але МЗС словамі начальніка аддзелу антыдэмпінгавых расьследаваньняў Аляксандра Сідарука цьвердзіць: паніжэньня няма. Наадварот, на некаторыя віды тканін і гатовага адзеньня квоты павялічаныя на 3 — 3,5%. Толькі чыноўнік маўчыць, што колькасьць краін Эўразьвязу таксама павялічылася з 15 да 25. У выніку ўсё ж выходзіць паніжэньне. Беларускі тэкстыль — адна з найважнейшых галін экспарту. Яго купляюць Нямеччына, Вялікая Брытанія, Нідэрлянды, Італія. З новых краінаў ЭЗ — Літва, Латвія, Чэхія, Славенія, Вугоршчына, Польшча.**

Палата прадстаўнікоў ня ўнесла ў Закон аб бюджэце ніводнае праўкі. Між тым доля выдаткаў на адукацыю і ахову здароўя ў бюджэце зьнізілася ў параўнаньні зь мінулым годам.

У панядзелак палата прадстаўнікоў прыняла ў першым чытаньні Закон аб бюджэце на наступны год. У дакумэнт, пададзены А.Лукашэнкам, ня ўнесьлі ніводнае праўкі. У сераду ўвечары законапраект прынялі ў другім чытаньні. Савет рэспублікі мае ўхваліць законапраект у пятніцу.

Праект бюджэту прадугледжвае даходы на 25,51 трлн руб. (што на 26,4% больш, чым сёлета), расходы — 26,64 трлн руб. (на 24,2% больш). Адпаведна, дэфіцыт бюджэту складзе 1,13 трлн, альбо 1,5% ВУП. Дарэчы, бюджэт-2005 выконваецца з прафіцытам, г.зн. перавышэньнем даходаў над расходамі. За першыя 10 месяцаў прафіцыт склаў 1 трлн 231 млрд рублёў (2,4% ад ВУП).

Расходы бюджэту-2006 складуць 36% ад узроўню ВУП (сёлета будзе 34,58%). На адукацыю пойдзе 993 млрд (+16% да 2005 г.), на ахову здароўя — 754,5 млрд рублёў (+4,7%). Калі ўлічыць, што расходы ў цэлым вырастуць на 24,2%, дык доля выдаткаў на адукацыю і ахову здароўя скароціцца.

У той жа час на праваахоўную дзейнасьць і бясьпеку пойдзе 1,486 трлн руб., прычым 64% ад гэтай сумы — на заработную плату. На армію ў бюджэце-2006 закладзена 908,2 млрд руб. (на 26,7% больш). На рэалізацыю дзяржаўнай праграмы адраджэньня й разьвіцьця вёскі пойдзе 2,36 трлн руб. (1,77 трлн у 2005 годзе).

У праект бюджэту закладзенае зьніжэньне падатковага цяжару за кошт адмены збору ў мясцовыя мэтавыя бюджэтныя жыльлёва-інвэстыцыйныя фонды, збору на фінансаваньне расходаў, зьвязаных з утрыманьнем і рамонтам жыльлёвага фонду, збору з грамадзянаў пры перасячэньні імі дзяржаўнай мяжы Беларусі, памяншэньня памеру сплаты зямельнага падатку, а таксама — агульнай стаўкі падаткаў з выручкі з 3,9% да 3%.

У дакумэнце ўпершыню крыніцы фармаваньня мэтавых бюджэтных фондаў і фонду сацыяльнай абароны насельніцтва ўключаны ў даходную частку бюджэту. Гэта дазваляе наблізіць бюджэтную клясыфікацыю да міжнародных стандартаў фінансавага ўліку й статыстыкі.

Галоўныя «асаблівасьці» бюджэту-2006 — вялікія выдаткі на датацыі сялу, жыльлёвае будаўніцтва, пэнсіі, інвэстыцыйныя праекты. Адукацыя, культура, навука фінансуюцца ў непараўнальна меншых памерах.

Цікава, што гадавы абарот букмэкерскіх кантораў адной Вялікабрытаніі складае 10 млрд фунтаў (каля 38 трлн руб.), што значна больш, чым беларускі бюджэт. Ня кажам ужо пра гадавы легальны абарот усіх букмэкерскіх кантораў ЗША, які складае астранамічную для нашага бюджэту суму ў 240 млрд даляраў (516 трыльёнаў рублёў). Такі вось рэальны патэнцыял «рынкава-сацыялістычнай» дзяржавы.

**Зьміцер Дрыгайла**

# Беларусь бярэ крэдыты ў Расеі, Аўстрыі, Кітаі

Пры канцы году Беларусь бярэ крэдыты на паўмільярда даляраў. Гэта ўдвая павялічыць замежную запазычанасьць краіны.

19 сьнежня міністры фінансаў Беларусі й Расеі Мікалай Корбут і Аляксей Кудрын падпісалі міжурадавае пагадненьне аб выдзяленьні Беларусі расейскага крэдыту на 146 млн даляраў «для забесьпячэньня збалянсаванасьці разьлікаў ва ўзаемным гандлі». Пагашэньне крэдыту й выплата працэнтаў будуць адбывацца са жніўня 2007 г. да лістапада 2011 г. Год таму Беларусь ужо атрымала адзін расейскі дзяржкрэдыт — 175 млн даляраў — для кампэнсацыі павышэньня кошту паставак расейскага газу. Але цана на газ не ўзрасла, і крэдытныя сродкі былі накіраваныя на пакрыцьцё бюджэтнага дэфіцыту-2004.

Да 20 сьнежня Мікалай Корбут пляную падпісаць у Вене яшчэ адно крэдытнае пагадненьне — пра прыцягненьне супольнага (сындыкаванага) крэдыту некалькіх банкаў на суму 34 млн даляраў. Гэта будзе першы крэдыт такога тыпу, прыцягнуты ўрадам. Арганізатары крэдыту — расейскі «Замежгандальбанк», аўстрыйскі «Райфайзэн Цэнтральбанк» і яговы беларускі партнэр «Прыёрбанк».

Вялікі аб'ём крэдытных сродкаў у найбліжэйшы час паступіць з Кітаю: 184,2 млн даляраў ад Экспартна-імпартнага банку і 50 млн урадавага крэдыту. Сродкі пойдуць на аплату абсталяваньня й разгортваньне сеткі апэратара мабільнай сувязі «Бест».

Прыцягваньне крэдытаў павялічыць замежны доўг Беларусі, які скарачаўся апошнім часам (цяпер — 600 млн даляраў). Да канца году ён узрасьце да 1 млрд даляраў. Разам зь іншымі запазыкамі — замежныя даўгі беларускіх банкаў, па «іншых сэктарах, крэдыты замежных фірмаў (прамыя інвэстыцыі) — агульная лічба ўражвае: амаль 5 млрд даляраў.

Прафэсар Станіслаў Багданкевіч ня бачыць у гэтым вялікае небясьпекі: «Увесь сьвет жыве на пазыках. Але з атрыманьнем крэдытаў трэба павышаць тэхналягічны складнік у вытворчасьці, каб не пусьціць крэдыты ў паветра. У нас толькі 4% эканомікі складаюць высокія тэхналёгіі, у прамысловасьці 30% прадпрыемстваў стратныя, яшчэ больш за 35% працуюць з узроўнем рэнтабэльнасьці ад 0 да 5%», — кажа С.Багданкевіч.

**Яўген Васілеўскі**

## СЬЦІСЛА

### Кабякоў у Ганконгу

Віцэ-прэм'ер Андрэй Кабякоў бярэ ўдзел у працы VI Міністэрскай канфэрэнцыі Сусьветнай гандлёвай арганізацыі. У Ганконгу плянуецца падпісаць першыя пратаколы ў справе ўзаемнага доступу на рынкі тавараў і паслуг. Пакуль з такімі «палітычна блізкімі» гандлёвымі партнэрамі, як Кітай, Куба.

### Абмінаючы Беларусь

Расея распачала будаўніцтва Паўночна-Эўрапейскага газаправоду, які стане найбуйнейшым у Эўропе. Газаправод працягласьцю 1 200 км пройдзе па дне Балтыйскага мора, і, адпаведна, абміне транзытныя краіны — Беларусь, Літву, Польшчу, Украіну. Дагэтуль праект выклікае крытыку, у тым ліку ў Нямеччыне. Пасьля таго як стала вядома, што экс-канцлер Шродэр, які прабіваў дамову пра гэты газаправод, зойме пасаду ў яго кіраўніцтве, розныя палітычныя сілы вінавацяць яго ў карупцыі.

### Свой кампакт

У СЭЗ «Гомель-Ратон» створаць вытворчасьць CD-R i DVD-R-дыскаў, а таксама боксаў для іх. Агульны кошт гэтага праекту — $6,485 млн.

### Вадкакрышталічны віцязь

Віцебскі «Віцязь» у 2006 г. пачне выпускаць тэлевізары на вадкіх крышталях, а таксама тэлевізары для аўтамабіляў.

### Фэрмэраў усё меней

Паводле зьвестак Мінсельгасхарчу, ад пачатку году ў Беларусі было створана 106 фэрмэрскіх гаспадарак. Ліквідавана — 150. Доля фэрмэрскіх гаспадарак у агульным аб'ёме сельскагаспадарчай вытворчасьці складае 2%.

### Падатковая палёгка санаторыям

Палата прадстаўнікоў прыняла ў першым чытаньні зьмены ў законы, што тычаць падатковых пытаньняў. Так, з наступнага году ўсе санаторна-курортныя й аздараўленчыя арганізацыі будуць вызвалены ад зямельнага падатку.

**ЗД**

### КУРСЫ ВАЛЮТАЎ

**на 15 сьнежня:**

1 амэрыканскі даляр — 2 151 рубель
1 эўра — 2 587,98 рубля
1 швайцарскі франк — 1 675,56
1 брытанскі фунт — 3 825,66
1 латвійскі лат — 3 715,03
1 літоўскі літ — 749,48
1 польскі злоты — 674,95
1 расейскі рубель — 75,05
1 украінская грыўна — 427,84

**Паводле Нацбанку**

ЛІСТЫ ЗЬ ЛЕСУ

# Вёска супраць Лукашэнкі



ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

«Вёска за Лукашэнку», — безнадзейна махаюць рукой у горадзе. Вяскоўцы адказваюць: «У горадзе пэнсіянэры й бюджэтнікі за Яго… Мы — палова на палову». Пэнсіянэры ў асноўным «за», маладзейшыя — «супраць».

У Малым Сітне й Алёшчы пражывае 400 выбаршчыкаў. За чатыры месяцы «хіміі» мне давялося размаўляць «пра палітыку» больш чым з 50-цю, прычым як з рабочымі лесапункту, так і пэнсіянэрамі. Вынік агаломшыў: *большасьць* рэжыму не падтрымлівае. Тры зь пяці або будуць галасаваць супраць, або ня пойдуць на выбары. Прыхільніцы Лукашэнкі — гэта бабулькі за 60 гадоў.

Сярод працуючых мужчынаў, моладзі, кабет сярэдняга веку тых, хто абараняў бы «ўсенароднаабранага», за чатыры месяцы я не сустрэў *ніводнага*. Надоечы пачуў па тэлевізіі ад самога Аляксандра Рыгоравіча пра больш як 90% падтрымкі ў вёсцы. Ня веру!

Іншая рэч, што падтрымка апазыцыі тут таксама слабая: на дэмакратаў спадзяецца кожны дзясяты. Але гэта праблема апазыцыі.

Уяўленьне пра вёску як пра беларускую Вандэю — суцэльнае электаральнае поле Лукашэнкі — найвялікшы міт нашае палітыкі.

Штабялёўшчык з Расоншчыны ніколі не галасаваў за Лукашэнку: той не вытрымлівае ніякага параўнаньня з Машэравым.

Маці дваіх дзяцей з Алёшчы ня хоча яшчэ пяці гадоў інтэграцыі з Расеяй, бо баіцца, каб ейных хлопцаў не забралі на Каўказ.

Сіценскі раскрыжоўшчык мае традыцыю ў выбарчы дзень прападаць у лесе ў ягадах — бо ўсё роўна нарысуюць столькі, колькі трэба.

Жонка вадзіцеля з Малога Сітна, які мае спадарожнікавую антэну й ведае, як жывуць за мяжой, шкадуе, што вяскоўцы ня ведаюць сваіх правоў, а то б даўно памянялі ўладу.

Тутэйшы лесаруб, які з тэлевізара чуе пра 250 даляраў заробку і чый бацька зь Мёраў усё жыцьцё кляў камуністаў, кажа, што «рана ці позна наша возьме».

Элегантная перамога ў вёсцы дастаецца Лукашэнку тады, калі дэмакраты не агітуюць людзей, расчараваныя выбаршчыкі асуджана ставяць птушчаку «супраць усіх» або не ідуць на ўчасткі, а камісія спакойна лічыць усё «як трэба».

Мы сур'ёзна недаацэньваем перавагі камунікацыі ў вёсцы. Калі на пад'ездах двухсоткватэрнага панэльнага дому ў горадзе з тымі ж чатырмастамі выбаршчыкамі наклеіць улёткі — па іх абыякава сьлізгануць позіркам некалькі жыхароў і зьдзярэ работнік органаў. Калі ж гэтыя 7—10 улётак будуць расклеены па вясковых «прысутных месцах» — уся вёска тыдзень будзе пераказваць і абмяркоўваць іх зьмест. У тутэйшым інфармацыйным вакууме, у адрозьненьне ад перасычанага й зьняверанага гораду, агітацыя проста выбухае.

На Майдане ў Кіеве мне расказвалі, як цэнтар і поўнач Украіны сталіся спрэс аранжавымі. Агітбрыгады з абласных і раённых цэнтраў выяжджалі ў кожную вёсачку. Вынік — у 17 украінскіх абласьцях вёска прагаласавала супраць кандыдата ад рэжыму.

У Беларусі больш за 23 тыс. вёсак. За дзень два-тры актывісты на машыне ў стане аб'ехаць 10—12 вёсак, абклейваючы па дарозе ключавыя «пункты» — прыпынкі, крамы, фэрмы, калодзежы. Няцяжка падлічыць: за паўгоду да выбараў 15 аўтамашын з 30—40 расклейшчыкамі могуць правесьці агітацыйную хвалю па ўсёй вясковай Беларусі.

Вёска, якая масава кажа «Хопіць!», — крах рэжыму. Сучасная беларуская нацыя сфармаваная вёскай і вяскоўцамі, няўжо цяпер мы аддамо мацярык беларускасьці абы-каму?

Калі ўспомнім пра забытую вёску й разьвеем міт пра «садамаўскі адсотак» у Алёшчы, Ратамцы, Лоску, Германовічах — у 2006-м абавязкова пераможам.

*Малое Сітна*




РУСЛАН ГАРБАЧОЎ («INTEX-PRESS»)

**У суботу 10 сьнежня ў Баранавічах мясцовыя патрыёты правялі акцыю ў падтрымку незалежнай прэсы Беларусі. А 12-й каля дзясятка чалавек выстраіліся ланцугом уздоўж будынку галоўпаштамту, трымаючы ў руках «Нашу Ніву» і «Народную волю». Праз паўгадзіны ўдзельнікі акцыі накіраваліся ў сярэдзіну паштовага офісу, дзе запоўнілі падпісныя квіткі на забароненыя газэты. Пасьля адмовы ў падпісцы было зроблена некалькі запісаў у кнігу заўваг. У акцыі ўзялі ўдзел прадстаўнікі ўсіх апазыцыйных партый і грамадзкіх арганізацый гораду.**

## СЬЦІСЛА

**Палітвязьні**

**Мікалаю Аўтуховічу** 6 сьнежня прад'явілі абвінавачаньне — ухіленьне ад выплаты падаткаў у асабліва буйным памеры. Тэрмін арышту яму працягнуты да 14 студзеня 2006 г., прадпрымальнік працягвае галадоўку з 14 кастрычніка.

**Валер Леванеўскі** 30 лістапада прыпыніў галадоўку, якая доўжылася 17 дзён — у калёніі ідзе праверка па ягоных скаргах. Палітвязень паведаміў адвакату, што адміністрацыя калёніі незаконна зьнішчае некаторыя ягоныя лісты.

Скаргу на прысуд, вынесены год таму, падаў у Вярхоўны суд 9 сьнежня **Міхаіл Марыніч**.

**Слова без свабоды**

Прафсаюзнаму штотыднёвіку **«Салідарнасць»** 7 сьнежня РУП «Белсаюздрук» і «Менскаблсаюздрук» адмовілі ў распаўсюдзе з 1 студзеня, не ўказваючы прычыны.

Газэта **«Курьер из Борисова»** пасьля вымушанага спыненьня пастанавіла выходзіць у Інтэрнэце: 9 сьнежня пачаў працу сайт **«Электронны Барысаў» (www. borisov-e.info).**

Зь пінскай газэтай **«Мясцовы час»** кіраўніцтва гатэлю «Спорт» скасавала дамову арэнды офісу з 31 студзеня, хаця тэрмін дамовы сканчаецца толькі ў ліпені.

9 сьнежня апэляцыйны суд пакінуў у сіле рашэньне Менскага гарадзкога гаспадарчага суду паводле пазоваў **«Народнай Волі»** да «Менгарсаюздруку», «Менаблсаюздруку» й «Белсаюздруку».

Журналіст тэлекампаніі «Мір» **Ігар Станкевіч** 12 сьнежня паведаміў, што яго змушаюць звольніцца: яго падазраюць у перадачы апазыцыі кінахронікі палітычных падзеяў.

**Сьмерць Гроднікава**

Пракуратура 2 сьнежня пастанавіла аднавіць праверку акалічнасьцяў сьмерці журналіста «Народнай Волі» **Васіля Гроднікава**.

**Палякі пад кантролем**

Ленінская раённая пракуратура Горадні 6 сьнежня абвясьціла пра пачатак праверкі па факце выхаду ў Польшчы часопісу **«Magazyn Polski»** ды газэты **«Glos znad Niemna» ў эміграцыі»**. У галоўнага рэдактара часопісу «Magazyn Polski» Андрэя Пачобута ўзялі тлумачэньні, 9 сьнежня яму вярнулі пашпарт.

7 сьнежня ў абласную пракуратуру перададзеная справа ў дачыненьні да **Анджэя Пісальніка**, **Юзафа Пажэцкага**, **Веслава Кесьляка** і **А.Пачобута**, якіх вінавацяць у запалохваньні дырэктара шчучынскага Дому палякаў Віктара Богдана.

Пэнсіянэра Станіслава Клімовіча затрымалі памежнікі 9 сьнежня на чыгуначным вакзале ў Горадні: ён перадаваў машыністу электрычкі газэту **«Glos znad Niemna» ў эміграцыі»**.

10 сьнежня ў Беларусь не пусьцілі здымачную групу **грамадзкай польскай тэлевізіі TVP** на чале з карэспандэнткай **Агнешкай Рамашэўскай**. Журналістка мае візу і акрэдытацыю.

11 сьнежня памежнікі не пусьцілі ў краіну **Міхала Дворчыка** — дарадцу прэм'ер-міністра Польшчы, абвесьціўшы яго пэрсонай нон-грата.

**Забароны для БХК**

Актывісту ГА «Беларускі Хэльсынскі камітэт» **Ігару Маслоўскаму** Берасьцейскі гарвыканкам забараніў праводзіць 11 сьнежня пікет, прымеркаваны да Міжнароднага дня правоў чалавека.

7 сьнежня Вышэйшы гаспадарчы суд спыніў разгляд пазову **БХК** да Кіраўніцтва справаў прэзыдэнта. БХК патрабаваў адмены рашэньня дэпартамэнту гуманітарнай дапамогі Кіраўніцтва справаў, паводле якога арганізацыя ня можа атрымаць замежную дапамогу на аплату офісу й іншых выдаткаў.

**Вялейская справа**

Адміністрацыйная камісія пры Вялейскім выканкаме 5 сьнежня разгледзела справу актывіста АГП **Уладзімера Малярчука** і актывіста ТБМ **Мікалая Суслы**, якія распаўсюджвалі інфармацыйны бюлетэнь да Дня салідарнасьці. Іх затрымалі яшчэ 12 лістапада.

**Гомельскія кіроўцы**

5 сьнежня ўдзельнікаў страйку кіроўцаў у Гомелі пачала запалохваць адміністрацыя аўтапарку. Актывісту ПБНФ **Андрэю Баранаву** дырэктар парку Хадакоўскі пагражаў крымінальнай справай за арганізацыю несанкцыяванага мітынгу й распаўсюд «непраўдзівых зьвестак». Падставай стала інтэрвію Баранава радыё «Свабодзе».

**Затрыманьні за ўлёткі**

У гомельскім Лядовым палацы падчас хакейнага матчу 7 сьнежня затрымалі актывіста ПБНФ **Сяргея Трыфанава**, які раздаваў улёткі з інфармацыяй пра А.Мілінкевіча.

10 сьнежня ў Горадні затрымалі **Віталя Курсу**, зьвінаваціўшы ў распаўсюдзе ўлётак. Канфіскавалі пакет з шасьцю інфармацыйнымі бюлетэнямі і 350 улёткамі аб'яднаных дэмакратычных сілаў.

Актывіста ПБНФ **Валера Кісяля** й актывіста ГА «БНФ «Адраджэньне» **Сяргея Левановіча** затрымалі 12 сьнежня ў Горадні па падазрэньні ў наяўнасьці фальшывых дакумэнтаў: у іх канфіскавалі ўлётку Мілінкевіча, брашуры па правах чалавека ААН і «Нераскрытыя злачынствы найноўшай гісторыі», мапу раёну й сьпіс з нумарамі дамоў.

**АШ**

## КАМЭНТАР

# Дыктатарская ўлада ня вартая таго, каб грамадзяне ў яе нечага прасілі

Беларускі кангрэс дэмакратычных прафсаюзаў накіраваў Гэнэральнаму пракурору зварот, у якім на падставе новых артыкулаў Крымінальнага кодэксу просіць прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці міністраў ураду за дыскрэдытацыю Беларусі. Гаворка вядзецца пра невыкананьне рэкамэндацыяў Міжнароднай арганізацыі працы ў справе паляпшэньня правоў незалежных прафсаюзаў.

Прафсаюзьнікі думаюць, што прымусяць гаварыць пра сябе хітрым піяр-ходам. Між тым сваім зваротам яны проста легітымізуюць беззаконьне, узьведзенае ў ранг закону. Калі эўрадэпутата Богдана Кліха спыталіся, што рабіць з новымі папраўкамі, вэтэран «Салідарнасьці» сказаў: ігнараваць. Перамогай рэжыму будзе, калі новы лідэр апазыцыі і ягоная каманда перастануць называць рэчы сваімі імёнамі, падладжваючыся пад папраўкі Сухарэнкі — тым самым прызнаючы іх. Немагчыма перамагчы рэжым, гуляючы паводле яго правілаў.

**Барыс Тумар**

# Мастак, закаханы ў Менск

У 2006 г. спаўняецца 110 гадоў славутаму мастаку Мікалаю Дучыцу. Сёлета прамінула 25 гадоў з дня ягонае сьмерці. Да гэтых датаў прытарнаваная выстава, што дэманструецца ў менскай арт-кавярні «Добрыя мыслі». Пра невядомага на бацькаўшчыне мастака піша **Сяргей Харэўскі.**

Мікалай Дучыц нарадзіўся ў Любчы на Навагрудчыне. Ягоны дзед Самуэль Дучыц — перасяленец з Сэрбіі — у 1863 г. партызаніў у шыхтах інсургентаў у ваколіцах Міра.

Мастацтвам М.Дучыц захапіўся падчас навучаньня ў Навагрудзкай павятовай вучэльні. Затым вучыўся ў Пецярбургу, дзе ягонымі настаўнікамі былі Рэрых, Бэнуа, Федаровіч. Потым была Першая сусьветная, грамадзянская вайна, Белая гвардыя і паход у Варшаву разам з Тухачэўскім. У Польшчы Дучыц трапіў у палон і праз нейкі час апынуўся ў нямецкім Эрлянгене. У Нямеччыне малады мастак і знайшоў прымяненьне таленту. Ён пісаў акварэлі, вырабляў паштоўкі ды здаваў у мастацкі салён. Працы ішлі нарасхват.

У 1921 г. Дучыц вярнуўся на бацькаўшчыну. Пасяліўся ў Менску, дзе паступіў на службу начальнікам аддзелу пры чыгунцы. Ад тае пары горад стаў для Дучыца ўсім: месцам каханьня й шлюбу, мірнага шчасьлівага жыцьця, творчага сталеньня. Гэта быў Менск абнаўленьня, беларусізацыі й электрыфікацыі, імклівага будаўніцтва й шалёнага квітненьня… Вобраз сталіцы 1920-х—1930-х М.Дучыца застаўся адным з найбольш яскравых і самабытных ягоных унёскаў у мастацтва.

Пры канцы 1930-х савецкая крытыка пачала нігбіць мастака за тое, што ён празьмерна захапляецца старасьвеччынай і пэйзажам, замест таго каб адлюстроўваць рабочыя будні пралетарыяту. Зусім не паспрыяў папулярнасьці Дучыца факт набыцьця ягонага этуду з выяваю касьцёлу польскім консулам.

Але з мастаком мусілі лічыцца. У 1935 г. у Менску адбылася ягоная пэрсанальная выстава, яго з поўным правам лічылі адным з пачынальнікаў нацыянальнае школы пэйзажнага жывапісу. Падчас Дэкады беларускага мастацтва ў Маскве 1940 г. прэса паважна пісала пра пэйзажы Дучыца, зважаючы, што безь ягонага даробку беларускае мастацтва ўявіць няможна.

Падчас нямецкай акупацыі менавіта Мікалай Дучыц ачоліў гарадзкі аддзел «Kunst-Art». Мастак зрабіў шмат дзеля падтрымкі беларускай культуры і калегаў, каб тыя не памерлі з голаду. Мастакі рэгістраваліся ў аддзеле, атрымлівалі заробкі, прадуктовыя карткі. Высока цаніў творчасьць М.Дучыца і кіраўнік цывільнага кіраўніцтва Беларусі Вільгельм Кубэ.



**Мікалай Дучыц** (1896—1980) нарадзіўся ў Любчы (Навагрàдчына). Яго мастакоўскі талент быў заўважаны яшчэ падчас вучобы ў Навагрудзкай павятовай вучэльні. Мастацкую адукацыю атрымаў у Пецярбургу. У 1916 трапіў у царскую армію, пасьля ў Чырвонае войска. Па дэмабілізацыі жыў у Менску. Маляваў беларускія краявіды, стары Менск, гістарычныя помнікі Беларусі. Яго карціны ёсьць у Мастацкім музэі, прыватных калекцыях Беларусі і замежжа.

Арт-кавярня «Фальварак Добрыя Мыслі» месьціцца па адрасе: Менск, вул.Магілёўская, 12.




**Менск Мікалая Дучыца. Ніжні Рынак — сёньняшняя плошча 8 сакавіка.**

Дзякуючы намаганьням Дучыца ў Менску ўдалося наладзіць паўнавартаснае мастацкае жыцьцё. Мастакі бралі ўдзел у выставах, якія праходзілі ў памяшканьні Опэры, пры ўмове, што кожны прынясе ня менш як тры работы на вольныя тэмы.

Багата было зроблена і дзеля ратаваньня старасьвечтыны, помнікаў дойлідзтва й сакральнага мастацтва, якія пасьля доўгага савецкага панаваньня былі ў лядашчым стане. Дучыц браў удзел у адмысловых камісіях, што стваралiся з мэтаю вырашэньня лёсу помнікаў, якія ацалелі па бальшавіках.

Натуральна, што пасьля вайны сталіністы не маглі дараваць мастаку ягонае беларускасьці. Яго арыштоўвалі, шматкроць дапытвалі. Ён здолеў выжыць. На паваенны час прыпадае вялікая колькасьць тэматычных пэйзажаў Дучыца, у якіх мастак фіксаваў тыя разбурэньні, што нарабіла вайна ў ваколіцах Заслаўя, Радашкавічаў, Менску. Але перадусім Мікалай Дучыц ствараў Менск. Свой улюбёны Менск. Напрыканцы 1950-х ён ізноў вяртаецца да тэмы сталіцы. Ужо залечанай. Тады й была створана ім найбольш дасканалая сэрыя зімовых менскіх краявідаў. Гэта Менск, які застанецца назаўжды.

На вялікай выставе 1967 г., прысьвечанай 70-годзьдзю мастака, было прадстаўлена больш за паўтары сотні ягоных твораў. А ў 1973 г. нізка ягоных зімовых краявідаў з 10 карцін была выстаўленая ў Японіі. Напрыканцы жыцьця слава ўжо была вельмі блізкаю. Але… за савецкай уладаю Мікалай Дучыц так і застаўся *не сваім*. Хоць, бадай, няма больш мастака, які настолькі быў свой для Менску.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Пляменьніца Якуба Коласа

**Соф'я Іосіфаўна Семяняка, пляменьніца Якуба Коласа, дагэтуль працуе экскурсаводкай у музэі ў Мікалаеўшчыне. Яе лекцыі ўнікальныя: насычаныя цытатамі, жывымі згадкамі, радзіннымі ўспамінамі аб родным дзядзьку ўсіх беларусаў.**

# Глючны Магілёў

Неймаверная энэргетыка новага магілёўскага року. З гораду на Дняпры вярнуўся **Сяргей Будкін**.

Каб трапіць у магілёўскі клюб «Джокер», трэба стаяць з паўгадзіны ў чарзе. Міліцыянты фільтруюць натоўп, п'янаватых падлеткаў выводзяць: «Ня будзе табе сёньня «Глюкаў». Сёньня ў горадзе вялікая падзея — мясцовая топ-каманда «Глюкі» прэзэнтуе свой першы альбом — «Humanoid».

У залю набілася чалавек 400, хоць па мясцовых мерках квіткі дарагія (10 000 руб.). На канцэрт прыехалі з суседніх мястэчак ды некалькі цікаўных зь Менску. Напачатку па чарзе граюць каманды, блізкія гурту ідэйна і стылістычна. Публіка трывае, але раптам нехта не вытрымлівае: «Дайце «Глюкаў» нам!»

У Магілёве пад 100 камандаў, чвэрць зь іх маюць сякую-такую папулярнасьць. Віталь Шум, кіраўнік магілёўскага творчага аб'яднаньня «Цэнтар жывога року», кажа, што рок-жыцьцё ў горадзе віруе — на месяц адбываецца пяць-восем канцэртаў. Дзякуючы ахвяраваньням (кожны сябар аб'яднаньня плаціць на месяц 5000 руб.) гэты рух і трымаецца. «Цэнтар» можа дазволіць сабе запрасіць зь Берасьця «Сьцяну» ці з Казахстану «Адаптацыю» — аплаціць дарогу ды яшчэ заплаціць за канцэрт. І такая суполка не адна. У гэты ж дзень у госьці да іншай магілёўскай каманды «Таварыш Маўзэр» прыехаў гурт «Тарпач» і «Свабодны тэатар» Халезіна. Сваю нішу займаюць мэталісты, панкі, барды. Нармальная канкурэнцыя, толькі ніяк скансалідавацца групоўкі ня могуць, нават ігнаруюць адна адну.

Аб'яднальную функцыю выконвае хіба мясцовае «Наше радио», фармат якога не падобны на менскія FM-станцыі. На хвалях філіялу расейскай радыёстанцыі можна пачуць песьні ўсіх магілёўскіх камандаў. Таму моладзь з задавальненьнем падпявае «Авангардшколе» — культавай мясцовай групе, а першую песьню «Глюкаў» пра «ападкі, дажджы і панкаў» ведаюць усе.

«Глюкі» эфэктна глядзяцца на сцэне, нягледзячы на мінорны настрой у песьнях («Сьвятла ня будзе!»), басіст Раман весяліць народ ва ўжо народнай манеры «а-ля Саша і Сірожа». У свой альбом «Глюкі» вырашылі не ўключаць некалькіх сваіх вострых песень — каб працягваць нармальнае існаваньне і далей. Колішняга «клюбнага» гіта са словамі «Дзякуй табе, бацька, за тое, што ты ёсьць, // Дзякуй табе вялікі! // Ты такі здаровы, ты такі лось, // А мы, твае дзеці, — дыстрофікі!» музыкі вырашылі нават ня граць на канцэртах. Вакаліст Лёша і аўтар песень Раман кажуць, што ня хочуць «уляпацца ў палітыку». Рома кажа, што сьцягі і лёзунгі іх не вабяць.

Беларуская мова ў песьнях — душэўнае памкненьне. Хлопцы на жыцьці расейскамоўныя, але як садзяцца за напісаньне песьні, дык выходзіць па-беларуску. Энэргетыка ад іх зыходзіць неймаверная, а тое, што адбываецца ў залі на песьнях «Хмарачосы», «Панкі ў горадзе», «Сьвятла ня будзе!», не на кожным канцэрце «N.R.M.» здараецца. Магілёў любіць «Глюкаў», песьціць іх і паважае. Гэтага яны дамагліся самі — несупыннай працай (пачалі ў 1997 г.), канцэртамі і сваёй унікальнасьцю. Апошняя песьня канцэрту — «Бывай» — выбівае сьлязу замілаваньня: «Бывай, мой родны край! // Ты песьні мне сьпявай! // Я буду тут ляжаць у брудзе, // Жыве зямля маіх бацькоў!»

**Сяргей Будкін**

## Азаронак заняўся гісторыяй

Натхнёныя «Найноўшай гісторыяй», беларускія тэлеканалы заняліся здымкамі гісторыка-дакумэнтальных сэрыялаў. Паводле зьвестак «НН», АНТ, СТБ здымаюць кінавэрсіі беларускай гісторыі, а БТ запусьціла ў вытворчасьць ажно два праекты.

Сцэнарны плян аднаго зь іх — «Летапіс часоў» — трапіў у рэдакцыю «НН» разам са зваротам за подпісам намесьніка старшыні Белтэлерадыёкампаніі Юр'я Азаронка. У звароце 10-сэрыйны «Летапіс часоў» характарызуецца як «асноўны ідэалягічны праект Белтэлерадыёкампаніі, заклiканы спрыяць патрыятычнаму выхаваньню грамадзянаў». У самой НДТРК наконт камэнтароў адмаўляюцца. «У нас такой інфармацыі няма», — заявіў супрацоўнік прэс-службы. Праўда, цалкам прыкрыць «няведаньне» ён ня змог, прагаварыўшыся, што праект будзе сэрыялам.

Што маюць прапанаваць тэлегледачу «беларускія Парфёнавы»? Праект ахоплівае велічэзны пэрыяд — ад IV ст. да канца XVIII ст., далучэньня Беларусі да Расеі.

Аўтар сцэнарнага пляну кандыдат гістарычных навук Вадзім Гігін, уключыў у фільм і згадкі пра загадкавую славянскую краіну Артанію, пра якую пісалі арабскія падарожнікі, і полацкага князя Вальдэмара, пра якога скандынаўскія сагі казалі, што ён змагаўся з готам Тэадорыхам. ВКЛаўская гісторыя цудоўна ўпісваецца ў «асноўны ідэалягічны праект Белтэлерадыёкампаніі»: станоўчымі фарбамі малююцца Гедымін і Альгерд, князь Канстанцін Астроскі і Мікалай Радзівіл Чорны. Ніякага адмаўленьня беларускасьці вялікалітоўскага пэрыяду: гэта наша гісторыя, і Статуты пісаныя нашай моваю, і наш Скарына… Пакуль справа ў фільме не даходзіць да праваслаўя.

Няма веры, апрача праваслаўя, і журналісты БТ — палымяныя адэпты яе. Ізноў паўтараецца гісторыя пра «Георгія» Скарыну, які стаў каталіком, каб паступіць ва ўнівэрсытэт. І што ў рэлігійных закалотах XVII ст. вінаватыя ўніяты з рыма-каталікамі (асаблівая ўвага — езуітам). Дасталося і Язафату Кунцэвічу, які дамогся каралеўскага ўказу, што «забараняў праваслаўным маліцца ва ўласных дамах і нават пунях».

Гэтым тлумачыцца празьмерны сантымэнт тутэйшага насельніцтва да Расеі: «уцёкі» беларусаў у Расею ад рэлігійнага перасьледу падчас «невядомай вайны» XVII ст., «узьяднаньне» пры Кацярыне II. Зьверствы расейцаў у Беларусі падчас вайны 1654—1667 гг. тлумачацца тым, што не было за імі царовага нагляду: маўляў, пачаліся пасьля таго, як цар вярнуўся з ваеннага паходу ў Маскву. Асоба праваслаўнага япіскапа Георгія Каніскага падаецца толькі ў станоўчым асьвятленьні.

Застаецца адно толькі чакаць, які ж тэлепрадукт мы ўбачым у канцавым выніку: ад мантажных нажніцаў часам залежыць нашмат болей, чым ад апэратарскай камэры.

**Аркадзь Шанскі**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Корань нашага року

Славу Кораню — 50

Сола Вячаслава Кораня лёгка пазнаць. Спачатку ён кідае ў залю нізкі гітарны гук. Гук расьце, запаўняе сабою наяўную прастору, вібруе, узьносіцца да сьвісту. Потым пальцы кранаюцца зь месца, нязмушана прабягаюць грыф з канца ў канец, намацваюць патрэбную гармонію, паланяюць яе, сплятаючы вакол сетку з гукаў, беручы ўсё шырэй і шырэй, раптам — вылет у іншую танальнасьць, на фляжалеты, абрыў. Эмоцыі абрынаюцца на слухачоў з канцэртнай апаратуры. Твар Кораня застаецца непрабівальна безэмацыйным. Ягонае сола — ня спосаб самазахапленьня. Хутчэй неабходнасьць выказацца. Толькі «Уліс» дае Кораню магчымасьць не маўчаць. «Гэта мой апошні праект. Я зь яго нікуды не пайду», — кажа Корань. «Уліс» дае яму магчымасьць заставацца сабой. Як і Корань «Улісу». У гурце могуць зьмяняцца бубначы-басісты, гэта ўсё неістотна. Бо ёсьць дамінанта: Слава Корань, ягоная гітара, ягоны цяжэнны чамадан-працэсар з надпісам «Ulis». Трэба бачыць, як Слава лёгенька памахвае ім, ідучы на канцэрт. А канцэртаў мала, а FM крущіць хлястовых-смолавых, а вечная патрэба ў грашах цісьне. «Ты што думаеш, я б тэхнічна ня змог іграць іншую музыку?» — прыўзьняў раз брыво Слава, калі загаварылі пра апапсеньне рокераў. У беларускай культуры была асоба, роўная сваім нежаданьнем дастасоўвацца да абставінаў, нават калі ўсё супраць цябе. Ларыса Геніюш.

> Ты — Пан зямлі,
> Я — пан свайго сумленьня,
> І нада мною ты не гаспадар...

Верыце ці не, гэта любімы Коранеў верш.

Слава Корань — няпросты чалавек. Ён памятлівы на старыя крыўды, гіпэрпатрабавальны да сваіх музыкаў, ён уважліва чытае ўсё напісанае пра яго «Уліс». І, калі што ня так, можа прыйсьці ў рэдакцыю высьвятляць адносіны. Корань нязручны, бо ня мірыцца зь цёплым месцам рок-дыназаўра. Ня лічыць «Танцы на даху», якія зрабілі «Уліс» каралём нашага року, найлепшым альбомам. Корань ідзе далей. Ён у руху. Ён чытае каталёгі, каб разьбірацца ў найноўшай музычнай апаратуры, ён слухае сьвежую музыку, ён запісвае маладыя гурты, ён рэпэтуе. Музыкі, якія граюць цяпер ва «Улісе», — па гадох яму як дзеці. На яго канцэртах багата моладзі, якая ніколі ня чула «Чужаніцу» і «Краіну доўгай белай хмары». Кораня гэта не напружвае. Ён піша новыя песьні. Ягоная Ітака яшчэ далёка. Яму толькі пяцьдзясят.

**Сяргей Мікулевіч**

# Не пакідаюць мовы

ТБМ на нямецкі манер: нямецкія калегі Алега Трусава змагаюцца супраць трасянкі–дэнглішу і за моўную разнастайнасьць у Эўропе. З Бэрліна піша **Алесь Кудрыцкі**.




АЛЕСЬ КУДРЫЦКІ

**Трасянкавы надпіс над бэрлінскай крамай сувэніраў.**

Зразумець, за што, а дакладней супраць чаго змагаецца Таварыства нямецкай мовы, лягчэй за ўсё раніцай, калі па радыё «Рамантык дрымз» рэклямуюць ёгурт «Ўікэнд філінг», а па тэлебачаньні паказваюць перадачу пра «паўэр-ўокінг», які дапамагае захаваць маладосьць ня горш, чым крэм з «антыэйджынгавым эфэктам».

Па-беларуску чытаецца ды чуецца выродліва, а па-нямецку дык і нармальна — усе ўжо даўно звыкліся з англіцызмамі, якімі бясконца папаўняецца нямецкі слоўнікавы запас. «Мова ў небясьпецы!» — б'юць у званы 25 тысяч сяброў Таварыства.

### Супраць дэнглішу

Стратэгічная мэта ТНМ — захаваць і разьвіваць нямецкую мову. Тактычная — супрацьстаяць «дэнглішу» (гібрыд слоў «Deutsch» і «Englisch») — англа-нямецкай трасянцы.

«Агромністыя рэклямныя плякаты на трасянцы-дэнглішы псуюць сярэднявечную аўру нямецкіх гарадоў. Культура нямецкамоўных сьпеваў практычна зьнікла. Навука рыхтуецца сказаць нямецкай мове «гуд бай» — такую апакаліптычную карціну малююць у сваім маніфэсьце заснавальнікі таварыства. «Некаторыя людзі лічаць, што гэта «cool» (крута), але большасьць немцаў бачаць у гэтым непавагу да сваёй мовы».

ТНМ асабліва абурае тое, што дзяржава не клапоціцца пра моўную чысьціню. Англіцызмы запаланілі дзяржаўную нямецкую чыгунку, дзе прадаюць «тыкетсы» замест квіткоў, а замест пунктаў паслуг на вакзалах спрэс «сэрвіс-пойнты». Тое ж тычыцца і дзяржаўнай нямецкай пошты, якая прапануе спажыўцам «ізітрэйд» ды «фанкард мэйлінг». Да нямецкай мовы гэтыя словы ніякага дачыненьня ня маюць.

Паводле ТНМ, галоўная прычына англізацыі мовы — палітычная і эканамічная гегемонія ЗША ды сусьветнае пашырэньне «амэрыканскага ладу жыцьця».

ТНМ зьвяртае ўвагу на тое, што гіпэртрафаванае выкарыстаньне ангельскай мовы парушае артыкул 3 Канстытуцыі Нямеччыны, які гарантуе, што ніхто ня можа быць дыскрымінаваны на падставе мовы. А старое пакаленьне, малаадукаваныя грамадзяне, замежнікі і іншыя людзі, якія ня маюць дастатковага веданьня ангельскай мовы, ня ў стане зразумець «дэнгліш».

Таварыства ўказвае на тое, што немцы адметныя нежаданьнем захоўваць вернасьць сваёй мове, а таксама невытлумачальнай слабасьцю да англіцызмаў.

«Мы ня маем нічога супраць замежных слоў, якія аблягчаюць разуменьне, — цьвердзіць ТНМ. — Але калі яны пачынаюць выкарыстоўвацца для абазначэньня самых звычайных рэчаў і зьяў — гэтага мы ня можам прыняць».

### Сродкі барацьбы

Галоўны прыём ТНМ — зьвяртаць увагу грамадзтва на моўныя праблемы. Таварыства ладзіць лекцыі, сэмінары, набывае газэтную плошчу, дзе зьмяшчае аб'явы ў абарону мовы. Сябры ТНМ друкуюць артыкулы, дапамагаюць ствараць якасныя пераклады.

ТНМ спрыяе мове і грашыма — штогод праводзіцца конкурс, на якім прэзэнтуюць 35 тысяч эўра таму, хто зрабіў найбольшы ўнёсак у разьвіццё нямецкай мовы (у 2002 г. такім чалавекам была названа жонка расейскага прэзыдэнта Людміла Пуціна). ТНМ абірае «Моўнага фальсыфікатара году» — таго, хто найбольш нашкодзіў мове.

# Герман Дытэр: «Кожная мова вырастае з волі

Сьмерць мовы пачынаецца ў той момант, калі яе носьбіты перастаюць намагацца называць сваімі словамі новыя рэчы, — кажа прафэсар **Герман Дытэр**.

**«Наша Ніва»: Калі і каму прыйшла ідэя стварыць Таварыства нямецкай мовы?**

**Герман Дытэр:** Такая думка нарадзілася восем гадоў таму і ня ў мовазнаўца, а ў статыстыка і матэматыка, выкладчыка ўнівэрсытэту ў Дортмундзе, прафэсара Вальтэра Крэмэра. У яго літаральна лопнула цярпеньне, калі стваральніца моднай вопраткі Жыль Сандэр (паводле нараджэньня немка з Гамбургу) пачала рэклямную кампанію на такой мове, якая да нямецкай ня мела амаль ніякага дачыненьня. Прафэсар заклікаў: немцы, давайце заснуём зьвяз, які будзе змагацца з гэтай праклятай маніяй перайманьня англіцызмаў! Так і зьявілася Таварыства нямецкай мовы.

**«НН»: Ці шмат людзей падзяляюць вашыя мэты?**

**ГД:** Сёньня ў Нямеччыне мы маем 12 тысяч сяброў, а па ўсім сьвеце — у больш чым 30 краінах — 25 тысяч. Асабліва шмат да нас далучаецца выкладчыкаў, якія вучаць нямецкай мове людзей за мяжой. Ёсьць у нас сябры і ў Беларусі.

**«НН»: А ворагі ў Таварыства ёсьць?**

**ГД:** Супраць нас найчасьцей выступаюць мовазнаўцы-германісты зь нямецкіх унівэрсытэтаў, якія лічаць перайманьне англіцызмаў нармальнай зьявай.

**«НН»: Хіба ж гэта не нармальна?**

**ГД:** Гэта проста неймаверна, што цяпер творыцца з мовай, перш за ўсё ў рэкляме, а таксама ў мас-мэдыях. Вось ёсьць выдатнае нямецкае слова «torwart» — варатар. Чаму тэлекамэнтатары выкарыстоўваюць слова «галкіпэр»? Чаму абавязкова пераймаць ангельскія словы, калі ў нас ёсьць трапныя і старажытныя нямецкія адпаведнікі?

**«НН»: Неяк ня надта добразычліва Вы ставіцеся да мовы Шэксьпіра…**

**ГД:** Мы ня маем нічога супраць ангельскай мовы, я сам ёй добра валодаю, але нам не падабаецца гэтая бессэнсоўная, высмактаная з пальца назойлівая мода, дзеля якой немцы кідаюцца на першыялепшыя ангельскія слоўцы, замест таго каб карыстацца ўласнай мовай.

**«НН»: Разам з тым нельга сказаць, каб нямецкая мова была на мяжы зьнікненьня. У чым сэнс абараняць яе ад уплыву іншых моў?**

**ГД:** Мы лічым так: калі нямецкая мова будзе захоўвацца ды ўзмацняцца, тады ня будзе зьнікаць цікавасьць да яе і за мяжой. З мовай трэба абыходзіцца асьцярожна і ня ўсё новае, імпазантнае ды сучаснае бяздумна пераймаць.

**«НН»: Што Таварыства робіць для таго, каб дапамагчы мове?**

**ГД:** Напрыклад, кожны год мы выбіраем «Моўнага фальсыфікатара», то бок асобу, якая асабліва пашчыравала на ніве забіваньня нямецкай мовы англіцызмамі. Сярод «уганараваных» гэтым тытулам — дырэктар аднаго з буйных нямецкіх музэяў, адзін з кіраўнікоў нямецкага прадпрыемства сувязі, а яшчэ вышэйзгаданая Жыль Сандэр.

**«НН»: Чаму нямецкая мова так лёгка падпадае пад уплыў ангельскай?**

**ГД:** У нас даволі няпростая мінуўшчына. Ёсьць шмат людзей, якія лічаць, што нацыя, спарадзіўшая нацыянал-сацыялізм з усімі яго вынікамі, ня можа з чыстым сумленьнем змагацца за чысьціню нямецкай мовы. Мы з гэтым ня згодны. Мы ня можам адмаўляцца ад сваёй мінуўшчыны — ні ад яе добрых, ні ад дрэнных старонак. Але нямецкая мова — гэта наш нацыянальны скарб. Так, мы павінны клапаціцца пра тое, каб яна была сучаснай і адкрытай мовай і каб ёю больш ня злоўжывалі так, як ёю злоўжывалі нацысты. Але для гэтага нямецкая мова перш за ўсё павінна захавацца.

**«НН»: Што трэба рабіць беларусам, каб не дапусьціць зьнікненьня сваёй мовы?**

**ГД:** Тыя, каму баліць лёс мовы, павінны заахвочваць іншых людзей ужываць яе там, дзе толькі гэта магчыма. Перш за ўсё, варта адмаўляцца ад непатрэбных англіцызмаў. Трэба бамбардаваць прадпрыемствы лістамі з патрабаваньнем ужываць родную мову. Увагу варта надаваць і тым прадстаўніцтвам замежных фірмаў, якія жадаюць весьці большую частку ўнутранага справаводства і камунікацыі па-ангельску. Трэба патрабаваць прыняцьця закону, які гарантуе, што як мінімум надпісы-папярэджаньні і паказальнікі на вуліцах будуць выконвацца на роднай мове. А таксама раз-пораз праводзіць яскравыя акцыі, якія паказвалі б прыгажосьць мовы. У тым ліку на вуліцы.

**«НН»: Многія зь беларусаў саромеюцца размаўляць па-свойму. Што Вы можаце ім параіць?**

**ГД:** Кожная мова вырастае з волі тых, хто яе ўжывае, надалей удасканальваць гэтую мову. Ёсьць краіны, жыхары якіх саромеюцца ўжываць мову продкаў, бо яна, маўляў, «вясковая». Але акурат тыя самыя «вясковыя мовы» маюць асабліва вялікі патэнцыял, бо здольныя падбіраць нечакана выразныя найменьні для новых рэчаў. Аднак гэты патэнцыял рэалізуецца

# нямецкай

### Супраць ангельскай

Многія сябры Таварыства выступаюць ня толькі ў абарону нямецкай мовы, але і супраць гегемоніі ангельскага слова ў Эўропе. Так, у апошнім нумары газэты таварыства «Моўныя навіны» (аналяг «Нашага слова») аўтар Бэрнд Мэй называе ангельскую «сусьветнай мовай з сындромам Гары Потэра» ды піша: «Калі ў брытанскіх калёніях была ўведзена мова каляністаў, то найпрасьцейшага запасу слоў хапала, каб даваць загады мясцоваму насельніцтву. Ніякая іншая мова не дае магчымасьці так выдатна абслугоўваць самыя нізкія ўзроўні яе выкарыстаньня».

Родальд Дзюамэль, старшыня Бэльгійскага саюзу германістаў і сябар ТНМ, кажа: «Вывучэньне ангельскай мовы як першай замежнай варта забараніць у школах па ўсёй Эўропе».

Да такіх радыкальных ацэнак у Нямеччыне схільныя адзінкі.

Аднак цікава, што калі нядаўна найбуйнейшы нямецкі таблёід «Більд» зьмясьціў на першай старонцы вялізны загаловак «ЭЗ адмаўляецца ад нямецкай мовы», рэакцыя была падобная да той, якую выклікала рашэньне «Нямецкай хвалі» вяшчаць па-расейску: масавае абурэньне інтэлігенцыі. Праўда, навіна аказалася звычайнай газэтнай вуткай — кіраўніцтва ЭЗ адразу запэўніла немцаў, што іх мова і надалей будзе выкарыстоўвацца ў справаводзтве на адным узроўні з ангельскай, застаючыся адной з працоўных моў кіраўніцтва ЭЗ. Таму крывяць душой эўрачыноўнікі, у першую чаргу нямецкія, калі выказваюць зьдзіўленьне тым, як беларусы абураюцца эўрапейскай моўнай палітыкай, — гэтая сытуацыя ім добра знаёмая.

### Нямецкі Бушлякоў

Мэгазадача беларускіх мовазнаўцаў — зрабіць мову цікавай, гарачай тэмай для дыскусіі ў грамадзтве. Для гэтага варта павучыцца на прыкладзе «зоркі» ТНМ, пісьменьніка і журналіста Бастыяна Зыка. Ён — аўтар кнігі «Der Dativ ist dem Genitiv sein Tod» («Давальны склон — скон вінавальнага»), у якой вядзе чытача па заблытаных сьцежках цёмнага лесу нямецкай граматыкі. Кніга — абсалютны бэстсэлер у Нямеччыне, прычым гарантавана вытрымае столькі дапоўненых выданьняў, колькі будзе існаваць нямецкая мова.

«Нам патрэбна нешта накшталт моўнай паліцыі, якая б па-сяброўску, але дакладна ўказвала на памылкі ды накладала штрафы», — піша нямецкі філіял інтэрнэт-кнігарні «Amazon» у рэцэнзіі на кнігу Зыка. Бастыян Зык мае талент пісаць пра праблему суфіксаў так, што немцы надрываюць жывоцікі са сьмеху. І чырвонай ніткай праз Зыкавы кнігі і артыкулы праходзіць думка: калі размаўляеш па-нямецку, дык размаўляй менавіта па-нямецку. «Той, хто дадае да сваёй мовы ангельскі гарнір, спрабуе паказаць сваю абазнанасьць і сучаснасьць. А таксама адмежавацца ад тых, хто яго не павінен зразумець, бо на самай справе яму няма чаго сказаць», — кажа Зык на сайце часопісу «Шпігель» у сваёй калёнцы «Zwiebelfisch» (можна перакласьці як «Памылка друку»), аналягу «Жывой мовы» ад радыё «Свабода». Амаль як Юрась Бушлякоў.

Калі сутыкаюцца мэнталітэты беларусаў і немцаў, дык гэта ў іх стаўленьні да роднай мовы.

### Немцы — што тыя беларусы

Калі дзе і трэба шукаць пункты сутыкненьня мэнталітэту беларусаў і немцаў, дык гэта ў іх стаўленьні да роднай мовы. Немцы, як і беларусы, саромеюцца станавіцца на яе абарону і шчыра дзівяцца, што замежнікі жадаюць яе вывучаць. Абодва народы не наважваюцца адкрыта і горача любіць сваю мову. І ў Нямеччыне, і ў Беларусі той, хто выступае за абарону мовы, рызыкуе зарабіць кляймо «нацыянал-фашыста». У абодвух выпадках незаслужана. Прычыны гэтага абсалютна розныя, а праявы падобныя.

«Многія немцы баяцца ўласнай культуры і ня могуць усьвядоміць, што іх уласная мова папулярная за мяжой», — піша аўтар «Моўных навін» Б'ёрн Акстынат пад рубрыкай «тыпова па-нямецку». У яго артыкуле аналізуецца фэномэн папулярнасьці нямецкамоўных музыкаў за мяжой і непапулярнасьці іх ва ўласнай краіне.



Бастыян Зык напісаў супэрбэстсэлер пра нямецкія суфіксы.




**Для аматараў календара:** Эўрапейскі дзень моў — 26 верасьня. Міжнародны дзень роднай мовы (устаноўлены UNESKO) — 21 лютага.

Так, на грамадзкіх радыёстанцыях WDR-2, SWR-1 ды NDR-2 гучыць усяго каля 10% песень на нямецкай мове. Тут, падобна як і ў Беларусі, лічаць, што нямецкія сьпевы ня могуць быць насамрэч прыбытковымі.

Нягледзячы на неймаверныя па нашых мерках інвэстыцыі ды ганарары, нямецкамоўныя музыкі нясуць на сабе ярмо правінцыялаў у параўнаньні са сваімі калегамі з-за Ля-Маншу. Вось, напрыклад, англамоўная попдзіва Сара Конар. Ці шмат хто ведае, што яна немка? У англамоўнай прасторы яе лічаць сваёй, як у Расеі тую самую Натальлю Падольскую.

У моўным сэнсе немцы — тыя ж беларусы. Праўда, ім лягчэй, бо яны сваёй мовай усё-такі карыстаюцца. Але і цяжэй, бо нямецкая мова пазбаўлена таго салодка-шчымлівага прысмаку навіны ды забароненасьці, як беларуская.

Даводзячы немцам важнасьць для беларусаў абароны роднай мовы, варта ўлічваць тое, што яны пераносяць сваё стаўленьне да ўласнай мовы на нас. Для іх мова — не сьвятыня, а прылада, як для салдата вінтоўка. Але калі іншыя народы ня лічаць за грэх тую вінтоўку чысьціць ды з гонарам паказваць яе сябрам і гасьцям, дык немцы намагаюцца пра яе згадваць як мага менш. Па зразумелых прычынах. Хаця б таму, што ў 1930-я гады мінулага стагодзьдзя ў Нямеччыне спачатку таксама было слова. Для немца абараняць сваю мову — непаліткарэктна. Яны лічаць гэта кепскім тонам і рэтраградзтвам, а то й горш — праявай нацыяналізму ды ксэнафобіі. Тое, як ставіцца да мовы ТНМ, — ня правіла, а выключэньне.

# тых, хто яе ўжывае»

толькі тады, калі таго жадаюць носьбіты мовы.

**«НН»: Калі мова памірае?**

**ГД:** Сьмерць мовы пачынаецца ў той момант, калі яе носьбіты перастаюць сумленна намагацца называць сваімі словамі новыя рэчы ці хаця б спрабаваць асыміляваць, перарабляць на свой лад запазычаныя замежныя словы. Можна назваць сьмяротна хворай тую мову, калі ў ёй больш немагчыма дакладна адлюстраваць важныя навуковыя, культурныя ды гаспадарчыя зьявы. Мова пачынае паміраць, калі зь яе больш не перакладаюць на іншыя мовы. Але ўласна сьмерць мовы прыходзіць толькі тады, калі памірае апошні чалавек, які на ёй размаўляе.

**«НН»: Што такое мова для народа?**

**ГД:** У першую чаргу — агульны сродак самаідэнтыфікацыі і салідарызацыі ў сучаснасьці для стварэньня супольнай будучыні на грунце прыманьня агульнага мінулага. Народ — супольнасьць людзей, якую аб'яднаў агульны лёс. Мова перадае самыя важныя рысы, агульныя для ўсіх прадстаўнікоў гэтай супольнасьці. Таксама мова — сродак паразумецца і спазнаваць сьвет. Народная, замежная мова можа выконваць толькі другую функцыю, але ня першую. Па-мойму, па сэнсе хутчэй наадварот. І тое не напоўніцу. Мова іншага народу можа выкарыстоўвацца для перадачы назапашаных ведаў (апошнім часам найбольш эфэктыўна ў сьвеце гэта забясьпечвае ангельская мова), а вось для стварэньня новых ведаў, для творчасьці найлепш прыдаецца сваё роднае слова.

**Гутарыў АК**



**Прафэсар Герман Дытэр** — сябар праўленьня Таварыства нямецкай мовы. (*Verein Deutsche Sprache*). Мае ступень доктара навук, якую атрымаў за дасьледаваньні ў галіне біяхіміі. Працуе таксыколягам у адным зь вядучых дасьледчых інстытутаў пры фэдэральным урадзе Нямеччыны, дзе сочыць за чысьцінёй вады, паветра і глебы. А ў вольны ад працы час — за чысьцінёй роднай мовы.

## СЛУХАЙЦЕ РАДЫЁ «ПАЛЁНІЯ»

### У Познані зьбіраюць подпісы

Беларускі Культурна-Асьветніцкі Цэнтар у Познані сумесна зь Незалежным Студэнцкім Задзіночаньнем (Познань) пачаў збор подпісаў супраць вяшчаньня радыё «Deuthe Welle» ў Беларусь па-расейску. Збор подпісаў спалучаны з інфармацыйнай акцыяй вакол вяшчаньня ў Беларусь і нямецкага падыходу да беларускага пытаньня.

Плянуецца правядзеньне акцыі ва ўсіх вышэйшых навучальных установах Познані і збор больш як тысячы подпісаў, якія будуць перасланыя ў Эўрапейскую Камісію ды офіс нямецкай радыёстанцыі.

Завяршэньне збору подпісаў адбудзецца 16 сьнежня на маніфэстацыі з нагоды Дня салідарнасьці.

### Эўразьвяз спакойна ставіцца да птушынага грыпу

Стала вядома, што вірус птушынага грыпу, ідэнтыфікаваны ў Румыніі, небясьпечны для людзей. Аднак Брусэль не зьбіраецца ўводзіць дадатковых сродкаў бясьпекі. ЭЗ вырашыў, што дастатковымі зьяўляюцца меры, прынятыя раней.

Эўрапейская камісія рэкамэндавала краінам-сябрам вызначыць рэгіёны высокай рызыкі й там аддзяліць дзікую птушку ад свойскай. Гаворка ідзе найперш пра балоты й паплавы, дзе адпачывае дзікая птушка, ды абшар на трасе пралёту вандроўных птушак. На гэтай тэрыторыі рэкамэндуецца трымаць свойскае птаства ў зачыненых памяшканьнях, забараніць паляваньні. Але аб канкрэтных дзеяньнях кожная краіна павінна вырашаць самастойна.

Пакуль што вэтэрынарныя службы Польшчы не знайшлі ў краіне вірусу птушынага грыпу.

### Турцыю прымуць за чыстасардэчнае прызнаньне

Эўрапарлямэнт вырашыў, што ўмовай прыняцьця Турцыі ў Эўразьвяз мусіць быць тое, каб краіна прызнала віну за масавыя забойствы армян падчас Першай сусьветнай вайны. Разьня армян у 1915 г. у Турцыі лічыцца вельмі далікатнай тэмай. Большасьць краін сьвету лічаць, што туркі забілі тады паўтара мільёна армян. Анкара сьцьвярджае, што гэтая колькасьць у пяць разоў перабольшаная, а армяне загінулі ў баях падчас вайны, а не падчас расстрэлаў.

**Паводле Беларускай службы Радыё «Палёнія»**

# Аляксандар Мілінкевіч: Сіла бясьсільнага

Новы лідэр апазыцыі сьпіць у мікрааўтобусах.



Адзіны кандыдат ад дэмакратычных сілаў Аляксандар Мілінкевіч робіць стаўку на паездкі па краіне і асабістыя сустрэчы з выбарцамі. А ўлады — на запалохваньне. За Мілінкевічам неадчэпна ходзяць гіцлі зь відэакамэрамі. За вамі калі-небудзь падглядалі? Уявіце сабе: месяцамі жыць пад наглядам. Напэўна, псыхалягічна вытрымаць гэта цяжка. (Але ж гэбісцкія паліттэхналёгіі!)

У дзень Мілінкевіч праводзіць дзясяткі сустрэчаў. З дваццацьцю, трыццацьцю, але найчасьцей — з параю чалавек. У выніку за 24 гадзіны ён паціскае дзьве сотні рук.

Іншыя прэтэндэнты на прэзыдэнцтва бурчаць. Акадэмік Аляксандар Вайтовіч: «Але сустракацца трэ было б неяк шырока. Трэба шырэй неяк браць». Уладзімер Колас: «Інфармацыі пра гэтыя паездкі і тым больш пра іх вынік практычна няма. Безумоўна, агульнае ўражаньне, чакалі, што ўсё гэта будзе мацней. Мы маем тое, што маем. Вось гэтыя паездкі з загадзя вядомым вынікам і ўсё астатняе. Бо вось проста такія паездкі па правінцыі — гэта вельмі, вельмі мала».

Ніхто з крытыкаў ня кажа, дык што ж рабіць.

А.Мілінкевіч прызнаваўся пасьля абраньня, што ягоны ідэал палітыка — Вацлаў Гавал. З сымбалічнай сустрэчы з Гаўлам у кастрычніку А.Мілінкевіч і пачаў сваю прэтэндэнцкую дзейнасьць.

У 1978 годзе, за 11 гадоў да Аксамітнай рэвалюцыі, Гавал напісаў сваё знакамітае эсэ «Сіла бясьсільных». Аб тым, як важна жыць у праўдзе, калі вакол пануе хлусьня.

А.Мілінкевіч лічыць, што ў сытуацыі, калі апазыцыя скутая па руках і нагах, а ўлада рыхтуецца зусім не да выбараў, яму важна проста паказвацца людзям. Каб тыя хоць здалёк бачылі: альтэрнатыва ёсьць, да яе можна далучыцца. Астатняе зробіць сіла бясьсільных, спадзяецца ён.

Што з гэтага выходзіць? З рэгіёнаў паведамляюць нашы карэспандэнты.

## У тэатры зладзілі авацыю

Падчас наведаньня Гомелю новы лідэр апазыцыі Аляксандар Мілінкевіч разам з жонкай Інай паглядзеў у тэатры апэрэту Штраўса «Жанчына-кажан». Па заканчэньні імпрэзы А.Мілінкевіч накіраваўся да актораў з кветкамі (дарэчы, ён быў адзіны, хто падарыў кветкі). Гледачы, пазнаўшы яго, зладзілі авацыю.

## Жлобінскія жарсьці

Калі Аляксандар Мілінкевіч накіраваўся ў Жлобін, у гатэлі «Юбілейны» раптоўна была зьнятая бронь, у іншых гатэлях «не аказалася вольных месцаў». Столькі турыстаў, разумееце, адведвае Жлобін!.. Начаваць А.Мілінкевічу давялося на кватэры аднаго з актывістаў.

Удзень аказаўся зачыненым «з тэхнічных прычынаў» музэй, дзе мусіла прайсьці сустрэча, а пазьней ля прахадной Беларускага мэталюргічнага заводу два мікрааўтобусы з камандай Мілінкевіча былі заблякаваныя легкавікамі спэцслужбаў і фурай. Зь іх выйшлі маладыя хлопцы спартовага выгляду і спрабавалі справакаваць бойку, што дало б падставу выклікаць міліцыю і затрымаць усіх на некалькі гадзінаў.

На дарозе ў Менск, пад Бабруйскам, кіроўцаў Мілінкевічавых мікрааўтобусаў «нэўтралізавалі», забраўшы ў іх правы нібыта за перавышэньне хуткасьці.

## Прэтэндэнт-нелегал

У Берасьці міліцыянты склалі пратакол на дэмакратычнага актывіста Зьмітра Шыманскага, які наладзіў сустрэчу зь Мілінкевічам у прыватнай хаце. На яе, дарэчы, сабралася 70 дзеячаў берасьцейскай інтэлігенцыі. Артыкул — несанкцыянаваны сход.

У Берасьці машыну А.Мілінкевіча затрымлівалі чатыры разы — нібыта ў рамках вышуковай апэрацыі «Нелегал». А калі А.Мілінкевіч падарыў дзіцячаму прытулку вопратку й відэакасэты з мультфільмамі па-беларуску, супрацоўнікі АБЭЗ запатрабавалі касэты на перагляд — «каб не было ніякага невядомага зьместу». Цяпер зьмест дзіцячых казак «Папялушка» і «Прыгажуня ў сонным лесе» супрацоўнікам АБЭЗ вядомы.

З такіх сытуацый складаецца выбарчае турнэ кандыдата ад апазыцыі. Такая яна, беларуская дэмакратыя.

**Мікола Бугай,**
**Яўген Васілеўскі**

## Гарады, якія наведаў Аляксандар Мілінкевіч










ЗДЫМКІ АНДРЭЯ ЛЯНКЕВІЧА

# Кніг@ноша ўратуе нацыю

Гістарычны досьвед сьведчыць, што забарона друку можа прывесьці зусім да іншых вынікаў, чым на тое спадзяюцца ўлады. Тут важна, каб у грамадзтва хапіла рашучасьці і здольнасьці да самаарганізацыі. Піша **Алег Дзярновіч**.

Я заўжды засьцерагаю калег ад мадэрнізацыі гістарычных падзей — можна лёгка трапіць у пастку самападману. Але ў межах аднаго гісторыка-культурнага рэгіёну ў розныя пэрыяды сапраўды могуць адбывацца аднатыпныя зьявы. Гісторыя XIX — пачатку XX стагодзьдзя адметная ў нашай частцы Эўропы і ўціскам нацыянальнага друку, а таксама грамадзкай актыўнасьцю па супрацьстаяньні такой дзяржаўнай палітыцы. Што да апошняга, то літоўскі досьвед застаецца шмат у чым павучальным.

## Забарона друку

Мяркуецца, што ініцыятыва забароны літоўскага друку належала віленскаму генэрал-губэрнатару Міхаілу Мураўёву, за якім у гістарыяграфіі замацавалася мянушка «Вешальнік». 5 (17) ліпеня 1864 г. кіраўнік Паўночна-заходняга краю падпісаў узгодненую з урадам у Пецярбургу інструкцыю, адрасаваную Віленскаму цэнзурнаму камітэту, паводле якой прадпісвалася не дапускаць да друку лацінскім шрыфтам літоўскіх лемантароў. Літоўскія навучальныя кнігі мусілі выходзіць у сьвет толькі кірыліцай расейскай вэрсіі («грамадзянкай»). Афіцыйнае абгрунтаваньне гэтых дзеяньняў палягала ў тым, што неабходна пазбавіць літоўцаў ад спрадвечнага польскага ўплыву.

У далейшым сьпіс забароненай літаратуры толькі пашыраўся. І ня варта разглядаць забарону толькі як абмежаваньне друку ў лацінскім ці гатычным шрыфце. Намэнклятура літоўскіх выданьняў кірыліцай паступова была звужана да лемантароў, календароў ды самых асноўных рэлігійных кніжак. Гэтыя выданьні ня мелі посьпеху сярод люду і атрымалі назву «паліцэйскіх кніжак».

Нягледзячы на ўсе адміністрацыйныя намаганьні, распаўсюджваць казённую літаратуру не ўдавалася, яе цяжка было раздаваць нават задарма. Настаўнік адной са школ у Сувалкійскай губэрні пісаў начальству, што ягоныя вучні пахваляюцца, быццам пякуць бліны ў распаленай такімі кніжкамі пячы. Але пад забаронай апынуўся той пэрыядычны друк, які выконваў хоць нейкую значную ролю ў культурным жыцьці літоўцаў. Абмяжоўваючы нацыянальнае пісьменства, улады імкнуліся падштурхнуць народы імпэрыі ў абдымкі афіцыйнай расейскай культуры.

## Рэакцыя Захаду

Пасьля здушэньня паўстаньня 1863—1864 гадоў водгукі ў замежнай прэсе пра падзеі ў Літве сталі зьнікаць, пра забарону літоўскага друку ў заходнеэўрапейскай публіцыстыцы амаль не пісалася.

Вылучаецца некалькі прычын такога становішча справаў: забарона літоўскага друку грунтавалася на неабнародаваных ведамасных цыркулярах і інструкцыях; у параўнаньні зь іншымі рэпрэсіўнымі захадамі ўраду забаронныя распараджэньні адносна друку падаваліся не такімі ўжо жорсткімі і абуральнымі; у адрозьненьне ад палякаў, літоўцы ня мелі свайго «лобі» ў Эўропе; выдатныя дасьледчыкі літоўскае мовы (А.Шляйхэр, Ф.Куршат, А.Бэцэнбэргер) бачылі ў ёй асуджаную на вымiраньне мову, асабліваcьці якой варта зафіксаваць для навукі; Літва, яблык разладу паміж расейцамі ды палякамі, не «адцяняласа» на тле іх канфлікту; пазытывісцкія тэорыі і канцэпцыі палітыка-эканамічных заканамернасьцяў разьвіцьця ўмацоўвалі перакананьні ў апраўданасьці сацыял-дарвіністкае формулы «выжываньня найбольш прыстасаваных» у «барацьбе за існаваньне»; меркавалася, што да даброт прагрэсу і цывілізацыі ў стане далучыцца толькі разьвітыя нацыі, якія валодаюць высокім узроўнем ды гнуткасьцю мовы, здольныя да адэкватнай адаптацыі ў інтэлектуальнай сфэры. Таму, маўляў, малыя народы, каб пазьбегнуць адсталасьці ды ўзяць удзел у матэрыяльным і духоўным прагрэсе, ня могуць не далучыцца да вялікіх — хаця б у моўным пляне.

## Фэномэн кніганошаў

У адказ на палітыку расейскіх уладаў узьнік фэномэн кніганошаў. Гэта дасьведчаныя людзі, што тайна займаліся дастаўкай ды распаўсюдам друкаванай па-літоўску прадукцыі з-за мяжы, найперш з Прусіі. Паступова кніганошы пачалі, паводле папярэдняй заяўкі, рэгулярна забясьпечваць чытачоў таксама пэрыёдыкай. Кніганоства расцэньвалася расейскімі ўладамі як кантрабанда, а ў масавай сьвядомасьці літоўцаў кніганоша стаў культурным героем.

З боку Прусіі мяжа ахоўвалася ня надта пільна — за памежнаю зонай назіралі звычайныя паліцэйскія і жандары. З боку Расеі мяжу ахоўвала адмысловая памежная варта, якая разьмяшчалася ў адну ці дзьве лініі. У першай лініі жаўнеры знаходзіліся так часта, што маглі бачыць ды чуць адзін аднаго. Другая лінія знаходзілася за некалькі кілямэтраў ад першай. Уся памежная паласа дасягала 7—8 км, і патрулі маглі тут затрымліваць ды абшукваць кожнага.



**Кніганоша Вінцас Юшка (1860—1939). Затрыманы 30 сьнежня 1894 году з забароненай літаратурай. Паводле царскага ўказу пакараны турэмным зьняволеньнем тэрмінам на два гады і трохгадовай высылкай у Валагодзкую губэрню. 14 траўня 1896 году з нагоды абвяшчэньня Маніфэсту пра каранацыю цара Мікалая II амніставаны.**



АБЕЦЕЛЕ
ЖЕМАЙТИШКАЙ-ЛѢТУВИШКА.
Ищдôта пар исакима Ю Милестас Виряўсіоя
Редитоя шяўрес-вакаро шалѣс.
ВИЛЬНЮЕ.
Спаўстувее А. Киркора.
1864

ЖЕМОЙТСКО-ЛИТОВСКІЙ
БУКВАРЬ.
Изданный по распоряженію господина главнаго
начальника сѣверо-западнаго края.
ВИЛЬНО.
Въ типографіи А. К. Киркора.
1864.

**Вось па такіх падручніках (фота ўнізе), на думку ўладаў, мусілі вучыцца літоўцы пасьля 1864 году. Менавіта гэты экзэмпляр лемантара М.Мураўёў накіраваў Цэнзурнаму камітэту ў якасьці ўзору.**

Для выданьня забароненай прадукцыі выбіраліся друкарні, якія знаходзіліся ў геаграфічна спрыяльнай мясцовасьці. Асноўная ўмова — каб знаходзіліся блізка да расейска-прускай мяжы і тым самым былі дасягальнымі для літоўцаў, што забясьпечвалі перапраўку літаратуры праз мяжу.

Прускія друкары добра ведалі, як найлепей падрыхтаваць кніжкі і газэты для перапраўкі праз мяжу: шчыльна ўпакаваныя цюкі — па два пуды кожны — прывозіліся ў нейкую карчму на памежжы ці ў іншае месца, адкуль іх маглі забраць кніганошы. Для таго каб пранесьці як мага болей літаратуры, на мяжы наймаліся дужыя спрактыкаваныя мужчыны. Перанесеныя праз мяжу кніжкі прыхоўваліся ў зручным месцы, найчасьцей за першай лініяй дзяржаўнай мяжы. Адтуль іх вывозілі ўжо самі кніганошы, схаваўшы літаратуру сярод дроў, сена ці нават у труне. На працягу доўгага шляху мяняліся павозкі, коні, яны нават перапрагаліся паводле звычаяў той ці іншай мясцовасьці. Нарэшце кніжкі раздаваліся іншым кніганошам-распаўсюднікам. Апошнія абавязкова займаліся яшчэ рамяством, дробным гандлем ці нейкім іншым відам дзейнасьці, бо праджыць толькі з гандлю кніжкамі было немагчыма. Апроч таго, трэба было мець прыкрыцьцё, каб апраўдаць кантакты з рознымі невядомымі людзьмі. Адначасова выданьні невялікага аб’ёму і газэты рассылаліся па пошце ў капэртах пад выглядам «рэклямных матэрыялаў».

Улады і не падазравалі, што забарона на друк выкліча такое масавае супрацьдзеяньне насельніцтва, таму ў першыя гады забароны нават ня ведалі, як караць асобных кніганошаў. Таму што забарона друку не была ў прававым сэнсе належным чынам аформленая як заканадаўчы акт, кніганошаў часьцяком апраўдвалі, караючы толькі за выданьні антыўрадавага зьместу. Але так было толькі напачатку. У 1898 годзе памежным вартаўнікам быў аддадзены загад страляць па парушальніках мяжы. Некалькі кніганошаў былі забіты ці паранены.

У самым канцы XIX стагодзьдзя справы на кніганошаў і чытачоў літоўскага друку, што прадстаўляліся цару, складалі самую шматлікую групу палітычных злачынстваў ва ўсёй імпэрыі. Толькі ў пачатку XX стагодзьдзя кніганошаў па колькасьці апярэдзілі сацыял-дэмакраты і эсэры, удзельнікі рабочых страйкаў.

Сярод затрыманых кніганошаў часам апыналіся ня толькі літоўцы. У 1898 годзе ў адным з шынкоў быў арыштаваны габрэй-каталік Ёна Боба, у якога знайшлі 11 літоўскіх выданьняў, у тым ліку аповесьць Казімераса Пакальнішкіса «Абрусіцелі». На допыце затрыманы не адмаўляў таго, што ведаў пра антыўрадавы зьмест гэтых выданьняў. Але, паводле ягоных слоў, ён раздаваў літаратуру мясцовым сялянам таму, што тыя зь вялікай ахвотай чыталі яе самі і зачытвалі ў голас іншым, а ў падзяку гаспадары сяляў частавалі кніганошу ды пакідалі яго начаваць.

Урэшце сталі ўзьнікаць арганізацыі, якія аб’ядноўвалі кніганошаў. Такіх суполак вядома цяпер 25. Іх удзельнікі імкнуліся разьвіваць інтарэсы чытачоў, арыентуючы іх на больш складаную літаратуру пазнавальнага і грамадзкага зьместу.

## «Нідзе і ніколі літаратура не ствараласяўрадам...»

Палітыка афіцыйных уладаў па абмежаваньні друку выклікала нязгоду навуковай грамадзкасьці і некаторых афіцыйных асоб Расеі. Ужо пасьля адмены забароны віленскі генэрал-губэрнатар Пётар Сьвятапольк-Мірскі, кузэн уладальніка Мірскага замку князя Міхала, напіша з іроніяй цару Мікалаю II: «Нідзе і ніколі літаратура не стваралася ўрадам… Урад можа заахвочваць, нават накіроўваць літаратуру, але не ствараць яе».

У выніку актыўнасьці літоўскага грамадзтва па самазабесьпячэньні непадцэнзурнай літаратурай, кампаній пэтыцый і зваротаў да ўладаў, акрэсьленай пазыцыі многіх навукоўцаў і спрыяльных дзеяньняў некаторых расейскіх адміністратараў мясцовага паходжаньня Мікалай II 24 красавіка (7 траўня) 1904 году зацьвердзіў прывезеную яму Сяргеем Вітэ пастанову Кабінэту міністраў пра адмену ўсялякай забароны для літоўскага друку.

Такім чынам, забарона на літоўскі друк прывяла да вынікаў, зусім супрацьлеглых тым, якія ўяўляліся яе ініцыятарам. Арганізаваны супраціў, па сутнасьці, пазбавіў забарону на друк эфэктыўнасьці. Забароненая «кантрабандная» літоўская літаратура забясьпечыла захаваньне пісьменнасьці, прынамсі, у двух пакаленьняў, умацавала культурную ідэнтычнасьць нацыі і стварыла пэўны адаптацыйны інструмэнтар перад абліччам эўрапейскага ўнівэрсалізму, адначасова інтэграваўшы новую літоўскую культуру ў эўрапейскую паліглясію.



**Алег Дзярновіч** (нар. у 1966 у Менску) — гісторык, выдавец. Супрацоўнік Інстытуту гісторыі НАН. Рэдактар часопісаў «Athenaeum», «Шуфляда».

# Урачыстасьці ў катэдры

Галоўная каталіцкая сьвятыня Беларусі — архікатэдра Найсьвяцейшай Марыі — 10 сьнежня адзначыла чарговы этап адбудовы. У прысутнасьці шматлікіх гасьцей быў каранаваны абраз Імя Марыі Беззаганна Зачатай. Сьвяточную Імшу, падчас якой каранавалі абраз, а таксама асьвяцілі рэканструяваны аўтар і новыя арганы, атрыманыя ў падарунак ад епіскапату Аўстрыі, вёў кардынал Казімер Сьвёнтак разам з аўстрыйскім біскупам Эганам Капэляры.

Звычай каранаваць абразы ўзьнік у XVI ст., яшчэ праз стагодзьдзе Папамі быў зацьверджаны спэцыяльны абрад каранацыі. З таго часу карануюць абразы, якія маюць багатую і праслаўленую шматлікімі цудамі гісторыю. Менскі абраз ня мае пакуль доўгай гісторыі і прыкладаў цудатворнасьці. Тым не менш, асьвячаючы ікону на плошчы Сьвятога Пятра ў Ватыкане, Ян Павал ІІ выказаў жаданьне, каб ён быў каранаваны. Каталікі бачаць у гэтым «знак даручэньня Касьцёлу ў Беларусі і ўсяго нашага народу апецы Багародзіцы.

Урачыстая падзея сабрала ў катэдры мноства вернікаў. Прысутнічалі прадстаўнікі ўладаў і дыпляматычнага корпусу.

**Сямён Печанко**

ТЭНДЭНЦЫІ

## Ці можна пражыць за 67 тысяч у месяц?



**ЗЬМІЦЕР ПАНКАВЕЦ**

Дзяўчына, што прыйшла на маё месца ў школу, атрымала заробак 130 тысяч рублёў. 80 тысяч трэба аддаць на праязны да вёскі — яна жыве ў горадзе. Круціся як хочаш. І гэта трэба ўставаць а пятай раніцы, вяртацца дадому а шостай вечара. А яшчэ рыхтавацца да заўтрашніх урокаў і паспрабаваць адпачыць. Назаўтра ж у школе ізноў будуць капаць на мазгі, што кепска вядзецца справа па заахвочваньні дзяцей да ўступленьня ў БРСМ і зусім не арганізоўваюцца сьвяточныя мерапрыемствы.

І гэта ўсё адбываецца ў той час, калі кожны эўрапеец марыць жыць, як у Беларусі. Прынамсі, пра тое гавораць на родным TV. Рэдактар газэты дае заданьне напісаць пра людзей, што адмаўляюцца плаціць за кватэру. Натуральна, ёсьць і такія, хто адмаўляецца плаціць праз прыроднае нахабства, яны жывуць у шыкоўных кватэрах, езьдзяць на навюткіх машынах, маюць свой бізнэс, але прынцыпы не дазваляюць разьлічвацца зь дзяржавай. Нехта ня плаціць праз алькагалізм. Але пераважная большасьць не плаціць з банальнай прычыны — няма чым. Насельніцтва апынулася за мяжой галечы.

Адна дзяўчына, з заробку якой рашэньнем суду вылічваецца 40% у кошт аплаты кватэры, эмацыйна пытаецца ў мяне: «Як вы думаеце, ці можна пражыць за 67 тысяч у месяц?» Такія заробкі на цяплічным камбінаце.

Аднакласьніца сястры працуе прадавачкай у барысаўскім «Доме гандлю». Даводзіцца цэлы дзень стаяць на нагах за прылаўкам. Узнагароджаньне ў канцы месяца складае 120 тысяч. Навошта ж тады тэлевізійная хлусьня, калі такія заробкі паўсюль?

Пачаліся першыя маразы. Гандляркі вулічных намётаў усё старанней закутваюцца ў зімнюю вопратку, спрабуючы сагрэцца цыгарэтамі і кавай. Маладзейшая гады на два гандлярка кліча: «Пацан, закурить нет?» Яна мае на тое права, бо нягледзячы на ўзрост, нашмат болей зьведала за мяне ў жыцьці. Я ніякавата цісну плячыма: «Не палю…» І чамусьці на душы становіцца не камфортна ад разуменьня таго, што ня змог хоць нейк дапамагчы дзяўчыне. Дома ёй давядзецца вырашаць куды больш значную дылему: як пражыць цэлы месяц на 50 даляраў.

**Зьміцер Панкавец, Кастрыца**

СЬЦІСЛА

### Што такое «адзінство»

Роднай мовы ў барысаўскім жыцьці робіцца ўсё меней. Нават Сяргей Салаш апошні свой самвыдавецкі праект «Печы сёньня» зрабіў дзьвюхмоўным. Што тады казаць пра раённую вэртыкаль ці простых месьцічаў, стараньнямі якіх беларуская мова набывае выродлівыя формы. Дыспэтчарка аўтавакзалу, анансуючы маршрут па-беларуску, зазвычай кажа: «Аўтобус на Халопенічы ідзець праз Барань, Траяноўку». Але канчаткова зьбівае са здаровага глузду адрас электроннай пошты барысаўскай раёнкі: adzinstvo@mail.by. Пасьля такіх шэдэўраў шыльдачкі ў барысаўскім РАНА, дзе слова «аддзел» пішацца з адной літарай «д», падаюцца нявінным жартам.

### Расейская глыбінка Барысаў

Пабачыў на старых вулках старога места групу расейскіх кінэматаграфістаў на чале зь Дзьмітрыем Астраханам, які, дарэчы, нарадзіўся на Крупшчыне і неаднаразова гаварыў аб невытлумачальнай творчай аўры, якая існуе ў Барысаве. Тады падумалася: нарэшце наш горад адлюструюць у кіно. Аднак надзеі ня спраўдзіліся. Аказалася, што кіно здымаецца пра расейскі правінцыйны горад, а Барысаў быў выбраны месцам для здымак, бо фільмаваць у Беларусі таньней, чым у Цьвяры ці Смаленску. Шырокая Расея, а адступаць няма куды. Адзіную беларускамоўную шыльду на тры вуліцы, дзе вяліся здымкі, «Аддзяленьне сувязі», расейцы прадбачліва заклеілі.

### Пакістанскі дыялект

Днямі ў Барысаве падчас акцыі «Нелегал» былі затрыманыя тры грамадзяніны Пакістану і два Індыі, што кіраваліся ў Эўропу па салодкае жыцьцё. У нелегалаў грошай не было, але была торба, набітая цукеркамі ды шакаладам. Небаракі не гаварылі ні па-ангельску, ні па-расейску, ні нават на хіндзі, а, як зазначыў перакладчык, якога знайшлі ў Менску, толькі на рэдкім дыялекце, што сустракаецца на пакістана-індыйскай мяжы.

**Зьміцер Панкавец, Кастрыца**

### Баранскі «Бангалор» — помнік прыроды

Аршанскі гарвыканкам абвясьціў батанічным помнікам мясцовага значэньня сасновы парк у Барані. На плошчы каля 10 га тут растуць дрэвы больш чым стогадовага ўзросту. Цяпер у парку забаронена езьдзіць на аўтамашынах, пасьвіць жывёлу, выгульваць сабак, паліць вогнішчы. Тэрыторыя парку будзе добраўпарадкаваная.

Пытаньне пра неабходнасьць зьберажэньня ўнікальнага кутка прыроды ўзьнялі яшчэ летась дэпутаты-дэмакраты Баранскага гарсавету. Яны ж наладзілі ў ім і некалькі санітарна-прафіляктычных акцый. Дарэчы, бор у Барані зьяўляецца менавіта тым месцам, дзе ўлады дазваляюць грамадзянам ладзіць пікеты ды сходы.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

### Кожны другі — злодзей

Паводле зьвестак Слуцкага РУУС, за дзевяць месяцаў на тэрыторыі раёну ўчынена 982 крымінальныя злачынствы, зь іх 678 склалі крадзяжы маёмасьці грамадзян. У горадзе зладзеі, а гэта ў большасьці былыя зэкі і асобы, схільныя да алькагалізму, найболей актыўныя. За дзевяць месяцаў учынена 5 забойстваў (усе раскрыты), 20 крадзяжоў аўтамашын, 7 падпалаў.

**Міхась Кутнявецкі, Слуцак**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Напярэдадні Новага году ў Менску расстаўляюць пальмы.**

# Самакатаваньне

Зьнішчаючы дэмакратычную апазыцыю, улада сячэ сук, на якім сядзіць. Піша **Віталь Тарас**.

На мінулым тыдні стала вядома аб намеры А.Лукашэнкі прызначыць кіраўніком Белтэлерадыёкампаніі Аляксандра Зімоўскага, які ўзначальвае канал СТБ. Ягонаму папярэдніку Ўладзімеру Мацьвейчуку даверана ачоліць Міністэрства культуры. Аб будучых пераменах кіраўнік дзяржавы асабіста паведаміў пры сустрэчы з кіраўніцтвам электронных мас-мэдыяў. Тым самым было пацьверджана, што з усіх сродкаў масавай інфармацыі для ўлады найважнейшым застаецца тэлебачаньне. Толькі замест слова «інфармацыя» трэба было б ужываць слова «прапаганда».

## «Мы вас закапаем»

Улюбёным лёзунгам савецкай прапаганды была фраза: «А ў вас у Амэрыцы нэграў лінчуюць!» Калі ў ідэалягічнай спрэчцы аб перавагах сацыялізму над капіталізмам вычэрпваліся аргумэнты, у ход ішоў гэты забойчы аргумэнт. У Амэрыцы даўно нікога не лінчуюць. Ужо некалькі гадоў, як афраамэрыканца на пасадзе дзяржсакратара ЗША зьмяніла афраамэрыканка. Праўда, нармальны чалавек наўрад ці скажа пра Паўэла і Райс «афраамэрыканцы». Іх слушна называць проста амэрыканцамі.

Адна з найвядомейшых палітыкаў самай магутнай у сьвеце дзяржавы, ад якой залежаць лёсы мільярдаў людзей, нядаўна мусіла апраўдвацца і даводзіць, што ні ў ЗША, ні па-за іх межамі амэрыканскія спэцслужбы не практыкуюць катаваньняў. Праўда, у барацьбе зь міжнародным тэрарызмам, паводле яе, магчыма, былі дапушчаны памылкі, што тлумачацца цяжкасьцямі барацьбы. Ужо сам па сабе факт публічных апраўданьняў гаворыць аб тым, што сьвет за апошнія паўстагодзьдзя — з таго часу як Хрушчоў абяцаў, што «сацыялізм закапае капіталізм», — зьмяніўся.

Яшчэ нядаўна Швэцыю называлі жартам краінай, дзе перамог рэальны сацыялізм. Аднак гэты сацыялізм ня мае нічога супольнага з савецкай або кубінскай мадэлямі. Вось нядаўна швэдзкія сацыёлягі прыйшлі да думкі, што Маркс меў рацыю. Ягонае прадказаньне, што сродкі вытворчасьці будуць належаць працоўным, нарэшце збылося. Проста галоўным сродкам вытворчасьці на пачатку III тысячагодзьдзя становіцца сам чалавек, ягоныя мазгі. Ён можа эксплюатаваць свой інтэлект і здольнасьці, укладваць свае інтэлектуальныя здольнасьці ў які хочаш бізнэс і атрымліваць з гэтага дывідэнды. Большай каштоўнасьці, чым інтэлект, няма.

Яшчэ ў XIX стагодзьдзі расейскі крытык Дз.Пісараў назваў інтэлігенцыю «думаючым пралетарыятам». У тагачаснай Расеі Пісарава не зразумелі. Не зразумелі б і ў сучаснай Расеі і Беларусі. Тут захаваўся пячорны ўзровень аргумэнтацыі. Скандал, які ўспыхнуў у Эўропе ў сувязі з публікацыямі ў прэсе аб тым, што ЦРУ мела на тэрыторыі некаторых краін Эўразьвязу сакрэтныя турмы, дзе допытвалі падазроных у тэрарызьме, быў успрыняты беларускімі прапагандыстамі як дарагі падарунак.

## Прапагандысты ў скураных фартухах

Лёгіка аргумэнтацыі простая да ідыятызму. Глядзіце — амэрыканскія спэцслужбы дапытваюць тэрарыстаў з катаваньнямі! А яшчэ кажуць нешта аб правах чалавека ў Беларусі! Самі дурні!

Здавалася б, спрачацца з такой лёгікай няма сэнсу. Уступаць у дыскусіі са штатнымі прапагандыстамі ня трэба. Дзіўна бачыць на экране дзяржаўнага тэлеканалу паважаных палітыкаў і аналітыкаў, якія нешта спрабуюць давесьці ў сьвятле сафітаў на допыце ў спрактыкаванага сьледчага… прабачце, журналіста.

Спробы паддосьледных, запрошаных у студыю, гаварыць пра дэмакратыю і грамадзянскія правы выклікаюць у вядучага садысцкае задавальненьне. Дарма што апрануты ён не ў скураную вопратку, а ў цывільны гарнітур, а ў якасьці інструмэнту выкарыстоўвае не ціскі й нажніцы, а выключна моўныя сродкі — тэндэнцыйна падабраныя альбо перакручаныя факты й лічбы, зьедлівыя камэнтары, іронію, сарказм. Цяпер, улічваючы прапагандысцкія заслугі, перад ім на апэрацыйным стале пакладзена цэлая краіна.



Запрошаных ніхто ня гнаў у тэлестудыю пад рулямі аўтаматаў. Напэўна, падвяла старая інтэлігенцкая звычка — ставіцца да нягоднікаў, як да прыстойных людзей.

Зь іншага боку, запрошаных ніхто ня гнаў у тэлестудыю пад рулямі аўтаматаў. Напэўна, падвяла старая інтэлігенцкая звычка — ставіцца да нягоднікаў, як да прыстойных людзей.

Але тое, што нельга паддавацца на правакацыі, не азначае, што трэба ўхіляцца ад адказаў на вострыя пытаньні сучаснасьці. Улада, крытыкуючы парушэньні правоў чалавека на Захадзе і абвінавачваючы яго ў «двайных стандартах», насамрэч сама ўхіляецца ад адказу на фундамэнтальнае пытаньне: чым яна ёсьць?

Здавалася б, адказ відавочны. Ні ў Беларусі, ні на Захадзе ні ў кога не засталося сумненьняў у прыродзе сёньняшняга беларускага рэжыму. Нават кіраўнік дзяржавы некалькі разоў адкрыта даваў зразумець, што ня бачыць нічога дрэннага ў тэрміне «дыктатура». Праўда, з агаворкай, што дыктатарскія паўнамоцтвы яму даў народ і выступае ён ад імя народу. Пры гэтым слова «дэмакратыя» (што азначае літаральна «ўлада народу») падаецца як утварэньне ад расейскага слова «дерьмо».

Тым ня менш, на міжнародным узроўні Беларусь імкнецца выстаўляць сябе як краіну з маладой, але ўсё-такі разьвітой дэмакратыяй, дзе ахоўваюцца правы чалавека, дзе створаны ўсе ўмовы для свабоднага разьвіцьця асобы, разьвіцьця беларускай культуры, мовы.

Але ж з падзеньнем улады камуністаў і распадам СССР уцякло ўжо шмат вады. Сёньня быццам бы няма патрэбы заяўляць, што незалежная Беларусь, утвораная на парэштках савецкай імпэрыі, зьяўляецца краінай рабочых і сялян, краінай Саветаў, краінай разьвітога сацыялізму. Улада, трэба аддаць ёй належнае, на гэтым і не настойвае. Яна зыходзіць як бы з прагматычных меркаваньняў. Маўляў, нешта захаваем з савецкай спадчыны, нешта возьмем у расейцаў, нешта запазычым на Захадзе.

## Ніхто ня любіць турэмшчыкаў

Разбурэньне Савецкага Саюзу пачалося тады, калі праваабаронцы пачалі патрабаваць ад уладаў выконваць палажэньні Канстытуцыі СССР — самай перадавой і дэмакратычнай у сьвеце, як сьцьвярджалі ўлады. Канстытуцыя Беларусі таксама ня страціла дэмакратычнага зьместу, нягледзячы на трансфармацыі апошніх гадоў. Яна проста ня дзейнічае. С.Хусэйну ня трэба было прыкідвацца й называць Ірак дэмакратычнай дзяржавай. 100% галасоў за Садама на апошніх перад падзеньнем ягонага рэжыму выбарах — квінтэсэнцыя такога падыходу да дэмакратыі. Іран таксама лічыць заходнюю дэмакратыю глыбока варожай і чужой мусульманскаму сьвету зьявай. Свой спэцыфічны шлях абралі Туркмэністан і Ўзбэкістан.

Што перашкаджае сёньняшняму рэжыму ў Беларусі адкрыта абвясьціць сябе дыктатарскім і канчаткова адхрысьціцца ад заходняй дэмакратыі? Тым болей што апошнія папраўкі ў Крымінальным кодэксе ўжо ніхто, нават сярод дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, не асьмеліўся назваць дэмакратычнымі. Размова фармальна тычыцца толькі бясьпекі дзяржавы й… чалавека. Дарэчы, а дзе чалавек можа адчуваць сябе ў абсалютнай бясьпецы? Зразумела — толькі ў турэмнай камэры, пад узмоцненай аховай…

Сёньня крытыка ЗША ў сувязі з захадамі, скіраванымі на ўмацаваньне бясьпекі амэрыканскіх грамадзян, з боку Беларусі выглядае двухсэнсоўнай і недарэчнай. Выходзіць, што Беларусь на баку тых эўрапейскіх краін, якія абураны ня толькі несанкцыянаваным выкарыстаньнем паветранай прасторы (а значыць, парушэньнем сувэрэнітэту) і аэрадромаў эўрапейскіх дзяржаў, дзе нібыта прызямляліся самалёты ЦРУ, ня толькі тайным утрыманьнем на тэрыторыі гэтых дзяржаў турмаў для падазраваных у тэрарыстычнай дзейнасьці, але і найперш фактам катаваньняў. Факт пакуль афіцыйна не пацьверджаны.

Пра сакрэтныя турмы першай паведаміла ўплывовая амэрыканская тэлекампанія ABC. Яна апублікавала ў Інтэрнэце сьпіс сакрэтных базаў, дзе часова ўтрымліваліся вязьні, — большасьць зь іх на тэрыторыі Польшчы й Румыніі. Кандалізе Райс падчас свайго турнэ па Эўропе давялося літаральна адбівацца ад шматлікіх непрыемных пытаньняў палітыкаў і журналістаў. І хаця кіраўнікі многіх краін Эўразьвязу схільныя лічыць інцыдэнт вычарпаным, Эўрапарлямэнт і ПАРЭ настойваюць на расьсьледаваньні ўсіх акалічнасьцяў. Польскі прэм’ер Марцінкевіч таксама заявіў, што на ўсе пытаньні ў гэтай справе павінны быць дадзены адказы.

Паводле зьвестак праваабарончай арганізацыі «Х’юмэн Райтс Ўотч», супрацоўнікі ЦРУ жорстка катавалі палонных падчас допытаў. Як піша «Газэта выборча», уцечка інфармацыі пайшла ад афіцэраў ЦРУ, нездаволеных тым, што іх некалі элітнае ведамства ператвараецца ў турэмнае, а яны самі — у звычайных турэмшчыкаў. Хаця адміністрацыя ЗША катэгарычна адмаўляе факт катаваньняў, яе прадстаўнікі, пачынаючы ад прэзыдэнта, упарта падкрэсьліваюць надзвычайны характар захадаў, якіх патрабуе вайна з тэрарызмам.

Ніхто ўжо не адмаўляе, што амэрыканскія вайскоўцы і спэцслужбы даўно выкарыстоўваюць так званыя «інтэсіўныя мэтады» вядзеньня допытаў. Падсьледным, напрыклад, не даюць спаць суткамі, катуюць рэзкімі непрыемнымі гукамі, холадам і вільгацьцю ў камэры. Гэтыя мэтады таксама цяжка прызнаць цывілізаванымі. І цывілізаваная Эўропа, найперш Брытанія, не прызнае катаваньняў у прынцыпе, нават у дачыненьні да тэрарыстаў — на ўзроўні як афіцыйнай палітыкі, так і грамадзкай сьвядомасьці. Пасьля канцлягераў і турмаў Трэцяга райху эўрапейцы проста ня могуць сабе дазволіць забыцца на тое, што такое катаваньні, тым больш апраўдваць іх спасылкамі на бясьпеку дзяржавы. ЗША, у сваю чаргу, заўсёды лічылі й лічаць Эўропу занадта лібэральнай.

Эўропа не прызнае сьмяротнага пакараньня. У большасьці штатаў ЗША яно практыкуецца. Беларусь, разам з Кітаем, Віетнамам і шэрагам іншых азіяцкіх ды афрыканскіх дзяржаў, таксама захоўвае гэты інстытут.

## Каго непакоіць Гандурас?

Пытаньне аб суадносінах бясьпекі чалавека ды ягоных правоў і свабод, сапраўды, набывае новае гучаньне ў наш час. Хаця з другога боку — гэта адвечнае пытаньне аб суадносінах мэты і сродкаў яе дасягненьня. Але Беларусь тут пакуль ня мае права голасу. Адна справа, калі Злучаныя Штаты крытыкуюць Брытанія, Францыя, нават Нямеччына, ці міжнародныя праваабарончыя арганізацыі, многія зь якіх базуюцца, дарэчы, у ЗША. Беларусі няма чаго прад’явіць у галіне правоў чалавека й дэмакратыі. Свабода слова, сходаў і аб’яднаньняў як былі, так і засталіся ўсяго толькі дэклярацыяй. І вінаватая ў гэтым ня толькі ўлада. Фактычная забарона на распаўсюд незалежных газэт засталася амаль незаўважанай большасьцю насельніцтва. Можна не сумнявацца, што закрыцьцё партый ды іншых грамадзкіх арганізацый будзе ўспрынята ў грамадзтве з такой самай апатыяй. Ніхто і ня думаў пратэставаць у Беларусі супраць самога інстытуту сьмяротнага пакараньня. Беларускаму абывацелю абсалютна няма справы да лёсу зьніклых — гэтаксама як і да лёсу вязьняў Гуантанамы. У сваёй палітычнай абазнанасьці ён падобны да чукчы, які зблытаў Гандурас зь дзетародным органам. Усё, што не паказваюць у тэлевізары (і ўсе, каго не паказваюць), не існуе ці ня варта ўвагі.

І ў гэтым хаваецца небясьпека для сёньняшняй улады. Што, урэшце, здольна яе напалохаць, прымусіць спыніць рэпрэсіі? Грамадзкі супраціў? Пратэсты і санкцыі з боку Захаду? Слаба верыцца ў рэальнасьць першага і дзейснасьць другога. Тым больш ніхто не чакае, што на парушэньні правоў чалавека ў Беларусі раптам адрэагуе Масква. Вось ужо на што Крамлю абсалютна напляваць! Хаўрус з рэжымам Карымава гэта засьведчыў.

Сёньня Крэмль зацікаўлены ў захаваньні статус-кво ў Беларусі, у палітычным саюзе зь цяперашнім рэжымам. Але невядома, хто будзе ва ўладзе ў Крамлі заўтра. Вяртаньне Расеі ў таталітарнае мінулае, якое становіцца ўсё больш рэальным, аднак, не абяцае Беларусі нічога добрага. Маштаб рэпрэсій пры спробе аднавіць імпэрыю нельга нават блізка параўнаць з тым, на што здольная цяперашняя беларуская ўлада. Дарэчы, няма гарантый, што яны не закрануць зь цягам часу і беларускае чынавенства. Ніякая прапаганда і ўнутраныя рэпрэсіі не ўратуюць Беларусь ад зьнікненьня, каля яна ня стане нармальнай дэмакратычнай дзяржавай. Зьнішчаючы дэмакратычную апазыцыю, улада сячэ сук, на якім сядзіць. Як бы яе прадстаўнікі ні ставіліся да заходняй дэмакратыі і яе інстытутаў сёньня, заўтра можа аказацца, што гэта адзіны паратунак для ўлады.

# Уладзімер Кушаль: «Мае бацькі ў нацыянальным пытаньні аказаліся наіўнымі»

Упершыню даў інтэрвію сын паэткі Натальлі Арсеньневай і лідэра пранямецкіх вайсковых фармаваньняў часоў вайны Францішка Кушаля. Гутарыў зь ім **Аляксандар Адзінец.**



З АРХІВУ АЛЯКСАНДРА АДЗІНЦА

Лёсы паэткі Натальлі Арсеньневай ды яе мужа, творца беларускіх вайсковых частак Франца Кушаля, апісаны падрабязна. Аднак аб жыцьцёвым шляху самага блізкага ім чалавека — адзінага, што застаўся ў жывых, сына Ўладзімера — невядома амаль нічога. Кушаль-малодшы цесных стасункаў зь беларускай эміграцыяй у ЗША ня меў. 47 гадоў ён жыве ў тым самым доме ў Рочэстэры (штат Нью-Ёрк), дзе апошнія дні правяла матка.

### Заходнебеларуская ідылія і казахская высылка

«Нарадзіўся я ў 1926 г. у Хэлмне (Польшча), дзе ў той час служыў бацька. Але яркія дзіцячыя ўспаміны зьвязаны з валожынскай вёскай Доры, дзе ўлетку мы гасьцявалі ў майго дзеда, Вінцэнта Кушаля. У параўнаньні з сучаснымі мітусьлівымі гарадамі гэта быў рай. Гулялі сабе вольна, нічога не баяліся, ні аб чым не клапаціліся — цудоўныя былі часы. Дзед, чалавек строгі, меў у сям'і вялікую пашану: мы, дзеці, пры сустрэчы цалавалі яму руку.

Калі нас арыштавалі, мы з маці жылі ў Вялейцы (бацька быў інтэрнаваны). 13 красавіка 1940 г. з братам Яраславам пайшлі на заняткі. Раптам выклікаюць у кабінэт дырэктара, дзе нас чакае чырвонаармеец зь вінтоўкай. Павялі дахаты. Маці горка плакала, прыгаворваючы, што нас кудысьці вывозяць.

Цягніком праз Расею даехалі ажно да Казахстану. Давезьлі да нейкага калгасу, выкінулі сярод стэпу і сказалі: «Жывіце тут як хочаце, але ў калгас мы вас не прымаем». Неяк пражылі год. Дзякуй сялянам, якія давалі магчымасьць падзарабіць на баку, каб не парушыць законаў. Мама бедавала, а мы нават у такіх антычалавечых умовах знаходзілі сабе забавы: выходзілі ў стэп і лавілі там суслікаў.

Аб вяртаньні нашае сям'і на Радзіму прасілі Купала з Коласам. Праязджалі праз Сібір — галеча страшэнная, станцыі пустыя. Прыехалі ў Доры, але там усё зьмянілася: стварылі калгасы, захварэў дзед, а тут новая бяда — акупацыя. Хоць наш дзіцячы розум спачатку не заўважаў у вайне нечага жудаснага. Думалі, што ўсё гэта хутка скончыцца.

### Брата забілі падпольшчыкі

Неяк да бацькі прыехалі двое знаёмых ды расказалі, што ў Менску пачынаецца беларуская справа. Роздуму не было: хуценька сабраліся, селі ў самаход — і ў сталіцу. Бацька хацеў, каб мы далей вучыліся. Паколькі сярэднія школы былі пад забаронай, ён наняў хатняга настаўніка. Але чалавека гэтага кудысьці забралі, і мы мусілі шукаць сабе іншы занятак. Я пайшоў працаваць у «Беларускую газэту», Яраслаў паступіў у фэльчарскую школу.

> Да рэалій ЗША бацькі не прызвычаіліся, затое цешыліся ўсім беларускім.

Амаль увесь цэнтар сталіцы ляжаў у руінах, горад быў шэрым, няветлівым. Было небясьпечна. Загінуў Яраслаў. Здарылася гэта 22 чэрвеня 1943 г. у гарадзкім тэатры, дзе падпольшчыкі падклалі бомбу.

На пачатку вайны простыя людзі яшчэ не былі апанаваны вялікім страхам. Наадварот, шмат хто зь менчукоў, нацярпеўшыся ад Саветаў, быў задаволены зьменай улады. Аднак потым у Менску арганізавалі гета, пачаліся жорсткія рэпрэсіі супраць тых, хто падазраваўся ў сувязях з партызанамі. Стала небясьпечна выяжджаць за межы гораду — на вёсцы панавалі тыя ж партызаны.

### Немцы ў рэдакцыю не заходзілі

Немцам было напляваць на беларускі нацыянальны рух і чым займаюцца іх будучыя рабы. Беларусы ўсё рабілі самі. Я таксама варыўся ў гэтым катле, аднак мой пэрсанальны ўнёсак у беларускую справу невялікі. У «Беларускай газэце» быў тэхнічным супрацоўнікам. Задача — даставіць макет газэты ў Дом друку, які месьціўся на самым ускрайку Менску, у варшаўскім напрамку ля могілак. Штодзень праходзіў пехатою праз увесь горад, і толькі ў апошні год свайго панаваньня немцы пусьцілі трамваі.

Фармальна функцыі галоўнага рэдактара выконваў Уладзіслаў Казлоўскі, які і насіў артыкулы ў нямецкую камэндатуру, быццам спрачаўся зь яе чыноўнікамі. Але сапраўдны рэдактар — Антон Адамовіч — лічыў, што Казлоўскі зьвязваецца зь немцамі, і часта зь ім з гэтай прычыны сварыўся. Той адказваў, што перад цэнзурай бясьсільны.

Рэдакцыя наша месьцілася на вуліцы Інтэрнацыянальнай, каля касьцёлу. Насупраць быў будынак радыё. Рэдакцыя «Беларускай газэты» была цэнтрам беларускасьці ў Менску, да нас часта заходзілі людзі, якія прыязджалі з правінцыі. Немцы ж у пакоі рэдакцыі не заходзілі ніколі, зь імі газэта сутыкалася толькі на апошнім этапе — пры цэнзуры.

### Наіўныя спадзевы

**Ад Кубэ ў Беларусі мала што залежала. Усім запраўлялі войска ды СС, а ён вельмі злаваў, калі нешта рабілася безь яго ўказаў. Акружыўся мясцовымі дзяўчатамі, адна зь якіх яго ўрэшце і забіла.**

Вайна стала цяжкім выпрабаваньнем для бацькоў. Яны шчыра спадзяваліся зрабіць нешта на карысьць Беларусі. Я бачыў бацькоўскае напружаньне, але сваімі думкамі з сынамі яны не дзяліліся. Мы не былі зь імі ў блізкіх адносінах: яны рабілі сваю справу, мы — сваю. Мае бацькі, як і іншыя беларускія патрыёты, у нацыянальным пытаньні аказаліся людзьмі наіўнымі. З самага пачатку вайны было зразумела, што нічога добрага для Беларусі немцы не рыхтуюць.

Пасьля выезду на Захад наша сям'я спачатку спынілася ў Бэрліне. Я ўладкаваўся ў газэту «Раніца», дзе рабіў прыкладна тое ж, што і ў Менску. Жыцьцё было нуднае, адзінае, што цешыла, — памеры гораду. Пры жаданьні заўсёды было куды пайсьці. У лютым 1945 г. адбыўся вялікі амэрыканскі налёт: зьнішчана было амаль усё, але мы цудам засталіся жывыя. Выехалі з мамай у Баварыю. У баварскім Амбэргу спрабавалі ўладкавацца на працу праз «арбайтсамт», але ніякай працы не знайшлося. Пасялілі нас у нейкай школе, дзе мы спалі на падлозе, выдалі харчовыя карткі. Жылі ціха, спакойна, нават вайскоўцаў ня бачылі. У красавіку 1945 году прыйшлі амэрыканцы. У Рэгенсбургу я скончыў гімназію імя Янкі Купалы, паехаў у Мюнхэн, дзе быў арганізаваны ўнівэрсытэт для чужынцаў, аднак ён хутка зачыніўся. Свой дыплём інжынэра атрымаў толькі ў ЗША, калі падзарабіў грошай.

### Бацькі былі выдатнай парай

На першым часе ў Нью-Ёрку жылі на кватэры ў Янкі Станкевіча, у страшным раёне, дзе пераважалі мурыны і пуэртарыканцы. Як толькі зьявілася магчымасьць, пераехалі ў ціхі Бруклін. Напачатку я працаваў пад Бостанам, у «Джэнэрал Электрык». Затым пераехаў у Рочэстэр, у вялікі канцэрн «Джэнэрал Дайнэмікс», які займаўся вайсковай вытворчасьцю. Нягледзячы на тое, што мая маці была знакамітай паэткай, паэзіяй я ніколі не цікавіўся. Заўсёды любіў фізыку, матэматыку. Я марыў набыць менавіта тэхнічную адукацыю. У Рочэстэры не жыцьцё было, а рай, пакуль заўчасна не памерла мая жонка Натальля — дачка знакамітага кампазытара Міколы Шчаглова-Куліковіча.

Пасьля яе сьмерці, у 1967 годзе, да мяне пераехала мама. Працоўны лёс маіх бацькоў за мяжой склаўся тыпова для нашай эміграцыі. Бацька слаба ведаў ангельскую мову, таму працаваў там, дзе не патрабаваліся спэцыяльныя веды. Спачатку складаў дэталі, потым — ліфцёрам. Мама працавала ўсюды, дзе толькі можна было. Нават агуркі ў слоікі складала. Значна пазьней яна ўладкавалася на радыё «Свабода».

Да рэалій у ЗША бацькі цалкам не прызвычаіліся, затое цешыліся ўсім беларускім. Бацька па паходжаньні быў простым мужыком, маці — дваранкай, але адно на аднаго былі вельмі падобныя. Абое мяккія, добразычлівыя, жылі мірна.

Улічваючы высокую пасаду падчас вайны, бацька мог тады весьці шыкоўнае жыцьцё, аднак чалавекам быў вельмі сумленным. Толькі і чуў ад яго: так няможна, гэта не адпавядае закону.

Афіцыйныя ўлады ў Менску па сёньняшні дзень нават не прызнаюць маю маці як паэтку, грамадзкую дзяячку, якая ўнесла ўклад у гісторыю краіны. Крыўдна, але на Радзіме мы застаёмся «фашысцкімі калябарантамі».

# Баярскія жарсьці,

## альбо Пра тое, як сяляне жылі без прыгону

Вядома: у Беларусі, як і ва ўсёй Расейскай імпэрыі, прыгон існаваў да 1861 г. Але вось у вёсцы Старая Пераваліка, што на Слонімшчыне, прыгоньніцтва не існавала зусім. Спытаецеся, як такое мажліва? А вось як. Адказвае **Антось Трафімовіч**.



**Стары перавалоцкі калодзеж.**

### У сойм па волю

У дакумэнтах 1560 г. баярскае сяло Перавалока значылася як дзяржаўная маёмасьць. Баярскае сяло — таму што вяскоўцы несьлі баярскую (вайсковую) службу: калі ўзьнікала пагроза вайны, сяляне адпраўляліся на выкананьне гэтае павіннасьці. Вольны ад войнаў час яны жылі ў вёсцы.

Пазьней Перавалока адышла да Слонімскага замку, якім валодаў Сапега. У 1661 г. кароль Ян Казімер пацьвердзіў баярскія правы на падставе гэтай прысягі. У 1766-м здарыўся канфлікт зь Міхалам Казімерам Агінскім, які дазволіў арандатарам патрабаваць ад баяраў выкананьня паншчыны. Перавалоцкія сяляне дайшлі да самога сойму Рэчы Паспалітае, дзе яны і змаглі пацьвердзіць свае баярскія правы.

Праўда, сёньня зь мясцовых мала хто ведае, за што сяляне атрымалі вольнасьць. Многія толькі чулі, што так, былі нейкія баяры ў іхняй Перавалоцы.

### «З прывілею зрабілі боты»

Свабоду мясцовыя сяляне атрымалі паводле прывілею вялікага князя літоўскага, што даваў вольнасьць на вечныя часы. Дакумэнт захоўваўся ўвесь час у выбарнага старасты. На напісаным на пэргамэнце прывілеі ў пацьвярджэньне права на вольнасьць было 12 пячатак вялікіх князёў літоўскіх і каралёў Рэчы Паспалітае. Зьверху была чырвоная стужка, сам тэкст быў выбіты залатымі літарамі. Апошні гаспадар граматы — так прывілей называюць вяскоўцы — быў мясцовы жыхар Антасюк. У 1939 г. да граматы праявілі інтарэс і савецкія ўлады. Да сп.Антасюка неаднойчы прыходзілі з гораду, пыталі грамату для музэю. Далейшы лёс княскага прывілею невядомы. «Можа, зь яго і боты зрабілі», — кажа старажыл Мікалай Савіч, які на свае вочы калісь бачыў той дакумэнт.

Разам з прывілеем меўся яшчэ цэлы стос дадатковых дакумэнтаў у пацьвярджэньне правоў баяраў. Іх лёс таксама невядомы.







### Правілы атрыманьня «прапіскі»

Сяляне, калі ім даравалі вольнасьць, жылі самі сабе: што зарабілі, тое й спажывалі. Ім не прыходзілася падоўгу «тырчаць» на панскай зямлі — каб пасьля, як застанецца час, яшчэ й сваю валоку абрабіць. Сяляне былі дастаткова заможныя й вылучаліся з агульнага слою сялянства. Гэтая акалічнасьць прыцягвала ў вёску новых жыхароў.

Атрымаць перавалоцкую «прапіску» было нескладана. Калі да сялян зьвяртаўся новы прэтэндэнт на пастаяннае месцажыхарства, грамада зьбіралася на сход, дзе ўсе разам і вырашалі, ці браць да сябе новага жыхара. Калі «бежанец» атрымліваў станоўчы адказ, то яму адразу выдзяляўся пэўны кавалак зямлі, і ўсе правы на вольнае жыцьцё пашыраліся на яго аўтаматычна. Таму ўцякалі ў Перавалоку прыгонныя з усяе Літвы-Беларусі й нават Расеі. Праўда, невядома, як вырашаўся лёс уцекачоў.



Апрача таго што баяры не адпрацоўвалі паншчыны, яны яшчэ шмат чаго не рабілі. Калі беларускія землі адарвала Расея, на сялян пашырыліся й новыя парадкі, у тым ліку рэкрутчына. Але, як і раней, перавалоцкія ні паншчыны не адпрацоўвалі, ні ў царскім войску рэкрутамі не служылі. Быў у іх нават дазвол на карыстаньне дарамі Ружанскае пушчы, якой валодалі Сапегі.



**Сьвятаміхайлаўская царква пад Перавалокай раней была ўніяцкая.**

### Роля смаўжоў у гісторыі вёсак

Вёска пастаянна расла. Зь цягам часу баяры пражывалі ўжо не ў адной, а ў чатырох вёсках, якія і сёньня стаяць адна побач з адной. Гэта Перавалока, Забалоцьце, Засімавічы і Смаўжы. Захаваліся нават легенды паходжаньня назваў паселішчаў. Перавалока раней была Нагараньнем, бо месьцілася на гары. А Перавалокай Нагаранье стала таму, што людзі з усіх бакоў сюды прывалакліся («папераваклаклэся», як тут кажуць).

Забалоцьце сёньня зьяўляецца часткаю Перавалокі, але раней гэта была асобная вёска, што месьцілася за балотам. У вёсцы Засімавічы першымі пасяліліся два чалавекі, якіх клікалі Засімамі. Адсюль і назва — Засімавічы. Смаўжы месьціцца каля балота, дзе шмат смоўжыкаў.

### Адных хрысьцілі, іншых катавалі

Сьвятаміхайлаўская царква пад Перавалокай раней была ўніяцкая. Са словаў бацюшкі, айца Аляксандра, царква пабудаваная не паводле праваслаўных канонаў. Паміж асноўным будынкам і купаламі існуюць немалыя швы («цыбуліны» сюды былі прывезеныя толькі ў 1903 г.). Таксама ў царкве маецца месца для хору, які ёсьць толькі ў касьцёлах і ва ўніяцкіх цэрквах.

Уніякай царква перастала быць, як трапіла пад Расею. Новая ўлада лічыла унію няправільнай, таму паўсюль людзі прымусова пераводзіліся ў праваслаўе. Калі чалавек не згаджаўся, яго проста зьвязвалі вяроўкамі, каб не працівіўся, і ахрышчалі наноў, «па-правільнаму». Найбольш актыўных праціўнікаў новае веры катавалі за вёскаю, на балоце. Калі й гэта не дапамагала, чалавека прывязвалі да аглоблі і цягалі да таго часу, пакуль ён не згаджаўся прыняць праваслаўе. Тое месца, дзе катавалі змагароў за сваю рэлігію, і сёньня клічуць Катоўшчынай. Праўда, паводле іншай вэрсіі, тутака катавалі старастаў, каб тыя падпісалі згоду на перавод сялян на паншчыну.

### Баяры — продкі «ворагаў народу»

Невядома, дакуль яшчэ перавалоцкія баяры заставаліся баярамі. Мажліва, да адмены прыгоннага права ў 1861 г. Потым яны ўжо надта не выдзяляліся ад астатніх сялян. Пасьля Першай сусьветнай пражылі дваццаць гадоў пад Польшчаю, калі зямля ўжо была ва ўсіх.

Але аднойчы вальналюбства былых баяраў дало пра сябе знаць. Ужо пасьля вайны, калі ў Заходняй Беларусі сталі арганізоўвацца калгасы, жыхары Засімавіч змовіліся і ў калгас не ўступілі, застаўшыся аднаасобнікамі са сваёй зямлёй. З усіх жыхароў пагадзіліся на калгас толькі некалькі чалавек, што праз сваё багацьце баяліся трапіць у сьпіс «ворагаў народу». Але гэта ўжо зусім іншая гісторыя.

**Фота аўтара.**

# Рукі прэч ад Лукіча!

гастранамічнае апавяданьне

**СЯРГЕЙ АСТРАВЕЦ**

— Я, спадары міністры, сплю і бачу, як яны лезуць з усіх бакоў, — памятаеце да болю знаёмую карту са школьнага падручніка? Адусюль пішчом лезуць, пхнуцца, ашчэрыліся штыкамі, памятаеце? Знаеце, на мяне яна зрабіла незабыўнае ўражаньне. Вочы заплюшчу і бачу як цяпер: адзін зь японскім прыжмурам, касавокі, другі пілсудчык, пшэк у сваёй канфэдэратцы, яшчэ белафін, румынская пыса. Ня твары — лычы, здаецца, як заплюшчыш вочы, з рогамі, з капытамі, з хвастамі, адным словам — нечысьць, пошасьць, інтэрвэнты. Як у той песьні, памятаеце: пагон англійскі, мундзір францускі, табак японскі, правіцель скоцкі!

— Спадары міністры, я тут колькі слоў скажу за нашага палкоўніка, увяду у курс справы. Камітэт харчовай бясьпекі прапануе антыінтэрвэнцкі закон, каб не чакаць, пакуль яны палезуць самі, а пачаць змаганьне, не адкладаючы ў «доўгую скрыню». А пачаць КХБ прапануе на ўнутраным фронце — разабрацца з памагатымі, з панікёрамі, распаўсюджвальнікамі чутак, дэзынфармацыі, супраць сабатажнікаў, супраць агентаў уплыву і апорных пунктаў будучай інтэрвэнцыі — кішэнных газэтак і гурткоў па інтарэсах.

— Так-так, як казаў адзін шахматыст: найлепшая абарона — гэта напад.

— Гэта будуць захады супраць нават ня ворагаў народу, а непрыхільнікаў, дробных паскуднікаў, калі казаць агульна. Слушна я кажу, палкоўнік?

—Так точна! Хто пнецца на амбары, на засекі нашай радзімы, як полчышчы мышэй і пацукоў ды розных іншых грызуноў. Хто зубы вострыць! Мы знайшлі ў апалай лістоце гранатамёт, стары, іржавы, але ж гэта зброя! Імі гітлерюгенд паліў нашы танкі ў Трэптаў-парку. Гэта ня жартачкі! Мы адшукалі склад кухонных нажоў. Памятаеце — «ноч доўгіх нажоў», памятаеце?

Іхняя мара — каб хлеба не хапіла аднойчы, каб голад пачаўся, галодныя бунты. Іхнія галадоўкі — суцэльная правакацыя. Паглядзіце на іх: як кабаны некаторыя, ім лячэбнае галаданьне не пашкодзіла б насамрэч. Масавыя галадоўкі падбухторваюць, дэстабілізуюць, ліюць ваду на млын спэцслужбаў. Карацей, ня мне вам казаць, чым гэта пагражае.

— На наш пірог, на наш каравай і хлеб-соль квапяцца! Рот разяваюць, пашчу сваю. Мы хлебсоль ад чыстай душы, ад шчырага, як гаворыць наша крывадушная апазыцыя, сэрца — кожнаму замежніку, а некаторыя камень за пазухай маюць. Усіх абшукваць ня будзеш: галас узьнімецца!

— Напляваць у нашую студню прагнуць, нахаркаць!

— Дулі ў кішэнях трымаюць!

— Хлеб наш надзённы даваўся нам потам і крывёй. Вазы з хлебам, што кулакі хавалі, эшалёны з хлебам, наш хлеб пах порахам.


CORBIS.COM

— Народ гаварыў: «Даруй, бацюхна», — калі акраец падаў са стала раптам.

— Зь мякінай наш мужык еў калісьці, як напісала паэтэса: «Цяжка жыць-трудзіцца, калі няма долі, жыта не радзіцца на мужыцкім полі…»

— «…І мусіш есьці за работу чорны хлеб зь мякіны!» Хлеб усяму галава! Няма хлеба — як без галавы будзеш, з пустым чэрапам. Хлеб мазгаўню нагадвае: у галаве павінна быць цеста, на якім, як на дражджах, усё павінна расьці — розныя задумы, ідэі, плянаў грамадзьдзё.

— Так, спадары міністры, з гэтым не паспрачаесься, дзякуй за разуменьне. Але хлеб, які ў народзе даўно й любоўна называюць «цаглінкай», — гэта падмурак дзяржавы, яе харчовай бясьпекі. З цаглін будуюць сьцяну — хоць нямецкую, хоць кітайскую, але ня толькі. З цэглы можна пабудаваць дом, крэпасьць, калгасны клюб, казарму, збожжасклад, фэрму жывёлагадоўчую, плот высозны вакол турмы, каб не ўцяклі. Так што харчовая бясьпека — гэта ня марны гук.

— Ды ніхто ня хоча, каб сала адбіралі, бохан, як фрыцы калісьці: матка, курка, яйка, млека — хутка!

— А потым карты зьявіліся — памятаеце? — з базамі натаўскімі навокал нашай свабодалюбівай краіны з ракетамі — «паляры-самі», «тамагаўкамі», «пасэйдонамі»…

— Мы ведаем цану хлебу, цану жыцьцю. Калі была вайна, яны там другім фронтам абжыраліся, тушонкай, бананамі… А ў нас мерцьвякоў елі. Праўда, гэта была ваенная тайна, пра гэта было забаронена гаварыць, за гэта расстрэльвалі, за размовы… Самае цяжкае было з музэем правадыроў, цэлы полк НКВД сьцярог, яны ж там у вітрынах ляжаць безабаронныя.

— Гэта, між іншым, адно са сьведчаньняў перавагі нашай навукі над іхняй. У іх там толькі муміі эгіпецкія — высахлыя, перабінтаваныя, есьці няма чаго. Нашы правадыры — як жывыя, кроў з малаком, выглядаюць цалкам ядома, апэтытна, можна сказаць. Ляжаць і не псуюцца, нібы сьвятыя, сьвежыя шчокі ружовыя, як тыя галяндзкія яблыкі, якія чарвяку недаспадобы. А яны, фараоны ў сэнсе, дарэчы, і катоў сваіх гэтак жа хавалі — цэлыя могілкі кашэчых мумій сьпятрэлых, на зуб ня возьмеш. Вось так. Цяпер, між іншым, рассакрэцілі, што ня толькі трупы елі, а таксама ўсіх катоў і сабак за месяц зжэрлі нашы аблокнікі.

— Гэта трыюмф нашых дактароў, нашых навуковых сілаў — правадыроў захоўваць ня горш за жывых нават пасьля заўчаснага скону — можна сказаць, вылечыць ад сьмерці. І вось яны хочуць замахнуцца на нашы сьвятыні, на наш хлеб духоўны! Я скланаюся пры думцы, што яны ўжо вострацнажы на дарагога Лукіча: хто сьцягно, хто лытку, хто, прабачце, шчыкавіну. Па тэлеку паказвалі: «дзермакраты», бізнэсмэны і алігархі — вялізны торт для кнігі рэкордаў — у выглядзе «Лукіч у труне». Ляжыць, нібы на далоні. Гэта, праўда, ня ў нас, мы б іх усіх — у клетку без размоў, на хлеб і ваду, на хлеб і ваду! Яны Лукіча — па кавалках на талерцы, ды з шампанскім, ды з гарэліцай — шведзкі стол, фуршэт!

— Мы таксама бачылі, таксама тэлек глядзім. Як шакалы вакол стала — штурхаюцца, каб кавалак большы схапіць, кожны сьпяшаецца, жарэ і назад — лакцямі працаваць, спрабуе самую смачную частку — ня проста чорна-шакалядны кавал нагі, калашыны ці чаравік са шнуркамі, а далонь Лукіча або нават чырвоны бант рэвалюцыйны ці ўвогуле — каб з галавы чагось адхапіць, адцяць, атрымаць у талерку — нос, вока, рот або сьвісток, як цяпер гавораць, — вусны, зубы. Іншаму карціць кус геніяльнага лоба нашага дарагога Лукіча! А сэрца, сэрца правадыра! Чорная шакалядная чырва!

— А я, калі тэлек глядзеў, чамусьці ўсё думаў пра ныркі спачатку, расольнічак з ныркамі. Кавалак мазгоў таксама ўяўляў — жах! А яшчэ — страшна падумаць, кашчуннае блюзьнерства — адцяць кавалак, які ў нагавіцах! Гэта нечувана, спадары міністры! Садызм, злачынства супраць усяго прагрэсіўнага чалавецтва!

— А што яны ў сваіх газэтках пішуць пра Лукіча? Ганьба! Што Лукіч іхняга дучэ хваліў! Галоўная справа — за што? Ідыёты! Ды мне брыдка уявіць — каб адрэзаць сабе кавалак Лукіча і зьесьці, салодкага торта апрыклага.

— Трупнае мяса саладжавае, гавораць, нібы бульба падмарожаная, — мэдыцынскі факт!

— Ну што вы, Іван Казімеравіч, мы ж не аблокнікі з вамі!

— А вы ведаеце: пісалі заўсёды, што напалеонаўская гвардыя пажырала сваіх коней, маўляў, ледзь не здыхляціну. А як на мяне, каніна — вельмі смачнае мяса. Мы нашых скакуноў прадаём нашчадкам дучэ на каўбасу і радуемся!

— Ну пры чым тут каніна! Яны, інтэрвэнты, на нашы прыпасы іклы вострацьна нашы сьвятыя мошчы!

— Кавалак мазгоў — гэта агідна!

— Чаму ж, у нас у кулінарыі пастаянна — мазгі смажаныя, жонка бярэ мая, смачна.

— Дык гэта ж сьвінячыя мазгі, сьві-ня-чы-я!

— Сьвінячыя, ясна. Раней каровіны прадавалі, гавораць цяпер — шкодныя.

— Правільна! А мы ж пра Лукіча гаворку вядзём! Пра Лукіча! Пра нашы сьвятыні, пра ідэалы, пра скарб!

— А дарэчы, яны, ну — алігархі ці там іхнія кухары з рэстарану «Пэкін», яны ня проста цеста сьпяклі, а — каньяком прапіталі, дзе сэрца, без крадзяжу, у іншых месцах — лікворы, брэндзі «Напалеон», а ў галаве — арэхі: мускат, фундук, арахіс, кэш'ю.

— Арэхі?

— Ну вы ж разумееце: дактары пісалі, калі яму трэпанацыю зрабілі, мазгі былі ці палова — з валоскі гарэх. А ён сам, гарэх, нагадвае мазгі.

— Не, штосьці мне больш ня хочацца смажаных…

— А я чытаў, торцік атрымаўся дэлікатэсны: у калашынах труфэлі, у пінжаку марцыпаны… Жанчынкі ажно вішчэлі! Аматаркі цукровай пудры і салодкай ваты.

— Аматаркі клубнічкі!

— Смажаных фактаў, салёных сэнсацый!

— А я чытаў, крэм быў выкарыстаны не такі заўсёдны з маргарыну, а суфле, птушынае малако, такі не прыядаецца.

— Выбіраць з тулава разынкі — немаральна!

— Вы падумайце, вы ўявіце: каб нам паставілі пасярэдзіне Лукіча ў выглядзе торта. Мы тут сядзім, абмяркоўваем, працуем, а потым — перапынак, кава-брэйк з торцікам.

—Так, ляжыць сабе, склаўшы рукі, гузікі з цукерак… А рукі зрабілі чырвоныя: маўляў, па локці ў крыві. Ганебна!

— Ужо лепей бы зьесьці не Сярпова-Молатава, а…

— Урупіна? Наркама харчоў?

— Ды пры чым тут наркам? Зьесьці якога-небудзь Чэмбэрлена, ці Керзана, ці ўвогуле графа Дракулу.

— Дракулу? Ды ў ім крывішчы будзе — насмактаўся як камар!

— Апазыцыя хоча прадаць наш музэй правадыроў міжнароднаму трыбуналу з усімі вантробамі! Гэта абы што! Дзе іхняя мазгаўня?! Нейкі халадзец, студзень!

— Геніяльны мысьліцель, сьветлая галава, калектыўныя мазгі пралетарыяту! А яны зь яго торт. Каб хоць бы што больш людзкае ў сэнсе закускі — сальцісон ці пячоначны рулет, я ўжо не кажу пра каўбасіну, пальцам пхануюю. Зусім без мазгоў — зрабіць з чалавека крэмбрулеякоесьці!

— А ведаеце, чым зэльц ад сальцісону адрозьніваецца? Мне прадаўшчыца ў краме сказала: зэльц горшы, там усякія амаль рогі-капыты, толькі чарніла закусваць або самагон ня лепшай якасьці.

— Мы незалежныя, пакуль у нас свая бульба, сваё сала і хлеб. Гаспадыня, якая вечна пазычае соль і запалкі, паступова трапляе ў няволю (робіцца залежнай). Яна залежыць ад ласкі розных дабрадзеяў. Яна мусіць прасіць, прынiжацца. А бясплатны сыр толькі ў мышалоўцы — запомніце!

— Лепей ня спаць, каб ня бачыць: вузкавокая плойма, як саранча, на нашых зялёных палетках і сківіцамі працуе як жорнамі…

— А мы іх з «максіма». На таначы: тра-та-та!

— «На граніцы тучы ходзяць хмура, край суровы ціішынёй аб'ят, ля высокіх берагоў Амура вартавыя родзіны стаяць!»

— «У гэту ноч рашылі самураі перайсьці граніцу ля ракі».

— «Тры танкіста, тры вясёлых друга, экіпаж машыны баявой!»

— «Тры танкіста выпілі па тры ста, а вадзіцель выпіў дзьвесьце грам!»

— Не! «А кіроўца выпіў цэлы літар!» Гэх!

— Налівай, хлопцы! Усе ў буфэт!

*2—4 лістапада 2005 г.*

**УЛАДЗІМЕР ЛОБАЧ**

ЛЕГІЯНЭРЫ

Легіянэры стаміліся крочыць на Захад,
Ды толькі ня збочыць ужо, не спыніцца —
Крывёю і потам іх шлях струменіцца:
На Захад. На Захад! За сонечным птахам!

Легіянэры стаміліся крочыць на Ўсход —
За горла бяруць іх вятры-сухавеі
І пылам зьвіваецца рэшта надзеі
На родным парозе пабачыць і захад і ўсход.

Легіянэры стаміліся вечным паходам,
З трыюмфу чужога ня цешыць іх луста,
Бо, як і жыцьцё, сьмерць — Victoria justa* —
Ужо іх кружляе сваім карагодам.

Легіянэры стаміліся ціхім быцьцём
І жывяць іх сны ваяўнічыя галы,
І кліча іх мройлівы прывід Вальгалы
Крываваю вечнасьць набыць за жыцьцё.

Легіянэры стаміліся слухаць праклёны,
Ня звыклі да міру вайны пілігрымы
І, вусны цалуючы соннай Радзімы,
На Поўнач па небе ідуць легіёны.

** Справядлівая перамога (лац.).*



# Заўтра годных абярэ Айчына

***

Ня бойся чужых, што прыходзяць зь песьняю,
Сваіх ня бойся, што ўжо не сьпяваюць, —
Мы нарадзіліся напрадвесьні,
І напрадвесьні мы паміраем.

На неба мы ўзыдзем лёгкімі пёркамі,
На неба мы пойдзем аблокамі простымі,
Нам вырай пакажуць птушкі,
Нам Бог намалюе ростані.

ТУМАН

На тумане, на падмане
Прыходзяць людзі, прыходзяць здані —
Цябе вітаюць, і ты вітаеш —
Наноў знаходзіш і зноў губляеш.

А на тумане сьвяжэюць раны —
Мы з нараджэньня ўжо вэтэраны
І паміраем з колішняй песьняй,
Сьцягі свае мы ў сэрцах месьцім.

Страшыся туману і бойся туману,
Калі ты па нашыя душы засланы,
Бо вочы сплывуць твае першай расою,
Страшлівым потам і чорнай крывёю.

Туманам сьціхаем і разумнеем —
Так мала кахаем, так многа шалеем,
І толькі па вечары помнім пра ранак —
Тумане, тумане — ты вечны сьвітанак.

ДАРОГА

Дарога вядзе і заводзіць,
Дарога ляціць стралою,
Дарога ўначы карагодзіць,
Каб раніцай быць з табою.

Дарога цалуецца зь Небам,
Дарога губляецца ў Лесе.
Дарогу частуюць хлебам,
Дарогу нагамі песьцяць.

Дарогай Багі прыходзяць,
Дарогай сыходзяць Душы.
Жыцьцё — ля дарогі калодзеж,
А Сьмерць — ля дарогі крушня.

Дарогі зьбягаюцца крыжам,
Дарогі вяшчуюць Долю
Людзям і добрым, і хіжым
Сьмехам вяшчуюць і болем.

Хоць кожны ідзе дарогай
І мае сваю дарогу,
Дарога — сабе ж абярогам
І вольная да зьнямогі.

***

Вада ня ведае, куды яна цячэ,
Яе не палохае шлях невымерны,
Бо нават сьлёзы на тваёй шчацэ
Яшчэ ня высахнуць,
як сілу яна верне
І вуснам перасохлым, і палеткам
Пяшчотным, апладняючым дажджом.

КАЛЯДНАЕ

*Ларысе.*

Так хочацца сноў прарочых,
Каб на дабро і па волі,
І каб ніхто не сурочыў,
І каб усяго даволі.

Так хочацца спорнай дарогі
Да самага далягляду
І пераможнай зьнямогі,
І сьнежных, марозных Калядаў.

З куцьцёю і кменным хлебам,
Жытнёвай вадой жывою,
З казой і калядным Дзедам,
Што гушкае зоркі дудою.

Так хочацца ў мяккім сутоньні
Спыніць безнадзейныя ловы,
Табе варажыць па далоні
І ціха шаптаць замовы.

І каб да веку, да часу
Багі не задзьмулі сьвечы,
Так хочацца, гэтым разам,
Па-просту, па-чалавечы.

***

За годнасьцю хаваецца прычына —
Няма тут месца
для пакут Хрыстовых,
Бо заўтра годных
абярэ Айчына
На справу
без аблудных словаў.

**Уладзімер Лобач** — этноляг, выкладчык Полацкага дзяржаўнага ўнівэрсытэту.

фэльетон



ЧЭМА МЭДОЗ

# Аб пісьменьніках і непісьменьніках

Надышоў час наноў вызначыць месца і ролю пісьменьніка ў сьвятле ідэалягічнай палітыкі нашай дзяржавы. Паколькі пісьменьнікі — народ вельмі капрызны, неаб'ектыўны і неканструктыўны, лепш, калі гэтую пачэсную задачу возьмем на сябе мы, непісьменьнікі.

На магчымы закід у непрафэсіяналізьме можна адказаць, што, па-першае, сярод нас ёсьць людзі, блізкія да літаратуры і нават пішучыя. Па-другое, выказваць адзіна правільныя меркаваньні аб літаратуры, як і аб іншых галінах мастацтва, можна і ня маючы спэцыяльных ведаў. Узорам могуць быць кіраўнікі заўжды роднага нам СССР і, канечне, наш Прэзыдэнт. Успомнім яго адкрыцьцё паэзіі Быкава.

Чаго ж наша грамадзтва, улада і народ патрабуюць ад пісьменьніка? Найперш — каб ён прыносіў карысьць і не прыносіў шкоды. Што для гэта трэба? Найперш заставацца самім сабой і ня лезьці ў іншыя сфэры.

Галоўнае, канечне, ня ўмешвацца ў палітыку і ня проціпастаўляць сябе ўладзе і народу. Інакш будзеш сядзець на чужыне, як Васіль Быкаў, або без грамадзянства, як Ларыса Геніюш.

Гэта, безумоўна, ня значыць, што камусьці затыкаюць рот. Пісьменьнікам, як і іншым грамадзянам, пакідаецца права пісаць непасрэдна ўладам аб усіх праблемах. Калі ж вам не адказваюць, не крыўдуйце і памятайце, што ўлада заўжды пакідае за сабой права прыйсьці да вас і па вас.

Гэта ж датычыць і іншых сфэр. Так, пісьменьнік Караткевіч пісаў пра гісторыю, ня толькі ня будучы гісторыкам, але і насуперак таму, што сьцьвярджалі кампэтэнтныя асобы. У выніку ў нас зьявілася цэлае пакаленьне нацыяналістаў, якія шкодзілі і працягваюць шкодзіць роднай уладзе.

Увогуле трэба вызначыцца і з так званай вучобай у клясыкаў. Вядома, як фальсыфікавалася жыцьцё і творчасьць нашых народных песьняроў «нацыяналістычнымі пісакамі». Выцягваліся вонкі ўсе іх памылкі маладосьці. Разам зь імі маляваліся ўсялякія «Пагоні», луцкевічы, ластоўскія. Гэтаму таксама трэба палажыць канец. Янка Купала і Якуб Колас памерлі з савецкімі ордэнамі, і толькі такімі яны нам і патрэбны.

Мусуецца таксама і тэма так званых «рэпрэсій» улады супраць пісьменьнікаў у сталінскія часы. Тут трэба мець на ўвазе наступнае: калі такія «рэпрэсіі» і былі, то вінавата ў іх ня ўлада, а тыя, хто яе няправільна інфармаваў. Дапусьціць адваротнае — значыць дайсьці да поўнай анархіі. Самае галоўнае — ва ўлады былі важкія прычыны для такіх дзеяньняў. Як і цяпер, літаратура была засьмечана нацыяналістычнымі элемэнтамі, якія імкнуліся адараваць нашу мову і культуру ад расейскай. Чытайце ліст таварыша Панамарэнкі Сталіну. Тое, што ў такіх умовах некатарым пісьменьнікам былі выпісаны ня ордэры, а ордэны, яшчэ адзін прыклад міласэрнасьці ўлады.

Што ж трэба зрабіць, каб выправіць становішча? Неабходна перадаць кантроль за літаратурай нам, непісьменьнікам. Дзеля гэтага патрэбна адрадзіць органы цэнзуры, якія б давалі ацэнку, нясе кніга карысьць ці шкоду, а самае галоўнае, былі надзелены паўнамоцтвамі караць ці ўзнагароджваць. Пакуль гэтага ня зроблена, ня зроблена нічога.

**Лукаш Пруцікаў,**
**заслужаны непісьменьнік**

---

**АДАМ ГЛЁБУС**



# Сучасьнікі

**Расеец і мараканцы**

Барсэлёна. Сьпёка. Лаўка пад плятанам. Цень такі прывабны, такі жаданы і спакушальны. Лепей, вядома, зайсьці ў бар з кандыцыянэрам, ці ў кавярню, ці ў рэстаран… Не. Спакушаюся пустой лаўкай пад халаднавата-зялёным плятанам. Не пасьпеў я прысесьці, як побач плюхнуліся два расейцы. «Пайду адалью. Піва, бл…ь, яно і ёсьць піва!» — кажа старэйшы і, пахістваючыся на кудлатых нагах, заглыбляецца ў нетры народнай сталоўкі. Маладзейшы паварочвае да мяне абгарэлы на сонцы і моцна разьбіты з аднаго боку твар: «Хаву юу?» «Добра ў мяне са справамі. Можаш не напружвацца, я цябе разумею», — кажу па-расейску. «Піва, брат. Гарачыня. А мы віскі накацілі на піва. Разумеш, брат, як нам цяпер. Х…ёва нам, і ўвесь час пасц...ь хочацца. Мне галоўнае не заснуць. Учора заснуў на пляжы. Мараканцы мяне абакралі. Чую праз сон, сумку цягнуць з-пад галавы. Ускокваю і біцца. Мараканцы паўцякалі. Я ў сумку зазірнуў, а там пустата. Сукі яны, гэтыя маракешы. Да цьвярозага не падыходзяць, баяцца. Як толькі закімарыў — яны як з-пад зямлі вырастаюць. А што я сонны ды п'яны мог? Цьвярозы — так! Бачыш мае кулакі? Любую галаву адаб'ю. У мяне, брат, кулакі, а ў мараканцаў — палкі. Яны друкамі параўнялі мне ўсю пысу. Абыходзь мараканцаў, брат…» — «У Барсэлёне віскі можна толькі ноччу піць…» — «Твая праўда, брат. Гарэлку і віскі тутака можна толькі пад раніцу піць. Ты ж, брат, сам ведаеш, як яно бывае. Толькі піва, бачыць бог. Яшчэ піва, 50 віскі, і паплылі. Яшчэ месяц паплаваю, пагуляю і працаваць пайду. У порт, грузчыкам мяне бяруць. Дамовіўся жалезна. Ты нешта там у кніжачку пісаў, брат? Ты пішы. Я замінаць ня буду…» — «Пайду я, брат». — «Давай, брат. Шчасьця табе, брат. Мараканцаў абыходзь, у іх палкі». Ідучы пад барсэлёнскімі плятанамі, я падумаў, што тут мы — славяне з Усходу — паводзім сябе і размаўляем як кінэматаграфічныя нэгры з Амэрыкі. Такія справы, брат.

---

# Знакі прыпынку



**УЛАДЗІМЕР НЯКЛЯЕЎ**

* * *

1999 год. Польскае тэлебачаньне. Паўвекавы юбілей камэрнага тэатру. Тэлевядучы пытаецца ў былога дырэктара тэатру пра першы, пастаўлены 50 год таму, спэктакль — і дырэктар ніякавата адказвае, што першы спэктакль, праўда, быў пастаўлены па п'есе савецкага драматурга. «Але ўжо наступная пастаноўка, — устрапянуўшыся, доўжыць дырэктар, — была прыстойная…»

У студыі акторы, рэжысэры, драматургі — і ўсімі гэта ўспрымаецца зусім нармальна. А калі напрыканцы праграмы тэатральны крытык гаворыць пра Дастаеўскага: «Вялікі польскі пісьменьнік, які змушаны быў пісаць па-расейску…» — ён зрывае хай не авацыі, але ўсё ж апляддысмэнты.

У нацыяналізму, як і ў любой іншай *калектыўнай* зьявы, — праблемы з этыкай.

* * *

У палітыка Пятра Краўчанкі адна з найбагацейшых у Менску хатніх бібліятэк — і гэта ня дзіва. Ён здаўна сябруе зь літаратарамі, блізкі быў з Максімам Лужаніным, Барысам Сачанкам — зацятымі бібліяманамі.

Краўчанка — чалавек нярэзкіх рухаў, якраз такі, у якога павінна быць прыстойная бібліятэка. Ён зь людзей, якіх можна дапускаць да ўлады хоць бы таму, што яны, валадарачы, нічога не паламаюць.

Шыкоўная хатняя бібліятэка палітыка Андрэя Клімава зьдзіўляе. Ні зь якімі літаратарамі Клімаў не сябраваў і сябраваць не зьбіраецца. Ён чалавек рухаў рэзкіх, у доме якога не было б нечаканым што хочаш убачыць, арсэнал ці тэрарыюм, але не бібліятэку. Хоць ён і сам піша…

«Калі я зазіраю ў самога сябе, у найцямнейшыя свае глыбіні, і бачу ў іх сябе самога такім, які я ёсьць, то ўсе астатнія людзі, якімі б яны ні былі, здаюцца мне анёламі…»

Гэта ён не напісаў, сказаў мне ў размове, толькі-толькі выйшаўшы з турмы, куды ўпяклі яго далёка не анёлы — і дзе не анёлы дапякалі.

Я ня ведаю, ці можна Клімава дапускаць да ўлады, дзе ён можа стаць небясьпечным і для сябе, і для іншых… Але я ведаю, што людзей, здольных некаму прызнацца ў тым, у чым сабе самому прызнацца страшна, няшмат на белым сьвеце. Тут мала мець сілу, характар… Душа ў такіх людзях ня тое, што ў іншых, — пустое, і гэтага дастаткова, каб варта было знацца зь імі, калі б нават не было ў іх нічога болей.

А ў Клімава ёсьць яшчэ бібліятэка.

# Зіма свабоды нашай



Гэты страх — як працяг спрэчкі наконт мовы «Нямецкай хвалі». Так чытаеш аб'явы на апошняй старонцы «Нашай Нівы»: «Мужчына шукае дзяўчыну–беларуску для стварэньня сям'і». Не пра этнічнае паходжаньне гаворка ідзе, не пра чысьціню крыві — а менавіта пра ўсьвядомленую ідэнтычнасьць.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Адсутнасьць знакаў прыпынку непазьбежна стварае адчуваньне недагаворанасьці і шматзначнасьці. Так і ў назьве зборніка Леры Сом — «Свабода Слова Зіма». Піша **Аляксандар Фядута**.

Пра існаваньне недзе ў глыбіні полацкіх паэтычных завадзяў паэткі Леры Сом я даведаўся ў 1993 г. у Данецку ад тагачаснай жонкі майго прыяцеля Аляксея Паніча. Сьвятлана, жанчына рэлігійная і экзальтаваная, гаварыла пра Леру з захапленьнем. А паколькі пра геаграфічныя абшары «Рэспублікі Беларусі» яна мела надзвычай апасродкаванае ўяўленьне, то папрасіла мяне пры сустрэчы (Полацак для яе — недзе ўжо зусім блізка ад Менску) перадаць Леры прывітаньне. Карыстаючыся нагодай, перадаю.

Полацкія паэты выклікаюць павагу сваёй кланавай культурай, натуральнай для людзей, што адчуваюць прыгажосьць полацкай Гісторыі, — Бураўкін, Арлоў, Сом. Праўда, няма роду без вырадку, і, чытаючы струганіну чарговага набору радкоў Навума Гальпяровіча, разумееш, што гэтая рыбіна даўно пратухла: ніводнай сьвежай думкі, ніводнага незацяганага вобразу. Лера Сом тут хутчэй пацьвярджае правіла. Як і яе папярэднікі па полацкай галіне беларускай паэзіі (гэта калі адлічваць са Скарыны), яна ня схільная да надуманага экспэрымэнтатарства, затое фарсіць адценьнямі рыфмаў і сугуччаў.

Ты шыбуеш штодзённа
У напрамку да сьмерці,
Пад бязладнае скерца
Ты шыбуеш штодзённа.
Не твая завядзёнка,
І пячатку ня зьдзерці:
У напрамку да сьмерці
Ты шыбуеш штодзённа.

Падвяргаючыся небясьпецы быць у сямідзясяты раз абвінавачаным у паэтычнай прадузятасьці, дазволю сабе прыгадаць бураўкінскага «Салаўя» як прыклад ідэальнага спалучэньня алітарацыі і асанансу. Але калі ў Генадзя Мікалаевіча гукі звонкія, мужчынскія, якія ўзнаўляюць клёкат закаханага сэрца, то ў Леры Сом у радках чуваць шорах шаўковых сукенак беларускіх шляхцянак, што аднекуль з XIX ст. даносіцца — якраз перад тым, як паны зьмянілі іх на мундзір і запісаліся ў кагорту Эміліі Плятэр.

Даўгакосая Панна! Калі б я толькі
    ведаў,
Што чакаеш мяне да апошняе зоркі…
Я прыеду — ты чуеш? — аднойчы
    прыеду,
Грукну ў дзьверы на золку.
Даўгакосая Панна! Калі б я толькі
    верыў,
Што ты помніш мяне безь ніякай
    надзеі…
Я прыеду. Аддзячыш мне мерай за
    меру —
За бязьдзейнасьць і дзеі.

Не з рамантызму пачалася беларуская паэзія, маюць рацыю мае апанэнты, але сёньня ёй менавіта рамантычнага пачатку не стае. Толькі рамантызм — не барока, не клясыцызм, тым больш не рэалізм — здольны заражаць людзей прагай дзеяньня, весьці за сабой. Так што праславуты сацыялістычны рэалізм у найлепшых сваіх праявах быў сацыялістычным рамантызмам, у найгоршых — сацыялістычным клясыцызмам.

Лера Сом рамантычная ў найлепшых сваіх вершах, бо ў іх адчуваецца імкненьне да дзеяньня. Бо спакой — форма несвабоды. Дзеяньне — доля свабоднага чалавека. І паэтцы Сом хочацца дзеяньня.

Каханьне нараджае несвабоду,
А я да волі прывіднай імкнуся.
Я болей да цябе не дакрануся:
Каханьне нараджае несвабоду.
І памяць пра яго я зьнішчыць мусіў,
Што перад тым самота і нягоды…
Каханьне нараджае несвабоду,
А я да волі прывіднай імкнуся.

Паэтка і вершы піша, часам не зразумееш — ці то ад свайго імені, ці то ад імені мужчыны, бо, як ёй здаецца, мужчыну больш уласьціва дзеяньне, больш пасуе яно яму. Ці то ад імені народу, несвабоднага ў сваёй любві. Кажуць, што народы самі сябе занявольваюць, улюбляючыся ў харызматычных палітыкаў. З гэтага пункту гледжаньня любоў сапраўды спараджае несвабоду. Пытаньне ў тым, як вызваліць народ ад гэтай любві.

Прывіднасьць свабоды, што паўстае за добра адмеранымі і клясычна выбудаванымі радкамі Леры Сом, — як адсутнасьць знакаў прыпынку. Сэнсы выстройваюцца на адсутнасьці косак, кропак, працяжнікаў. Тры словы ў назьве зборніка — «Свабода Слова Зіма». Паспрабуй разьбярыся, пра што яна гаворыць. Ці то слова «зіма» ў яе свабоднае, ці то свабода слова зьледзянела недзе на паўдарозе ад любві да вызваленьня ад любві? Ці то, нарэшце, свабода прыходзіць разам зь зімой?

Зіма пануе на старонках апошняга зборніка паэткі. Сом зачараваная яе разьмеранасьцю, лякацічнасьцю.

Зіма, якая адбылася, — час двухколерны, чорна-белы, амаль безь нюансаў. І вершы Сом — не палотны, а менавіта графічна дакладныя, выверaныя лініі, якія працінаюць прастору чытацкай сьвядомасьці.

Кожны мае свой страх,
Як атрутную кветку,
Колькі ўласную волю
Ты ні дакарай.
Я баюся прачнуцца
Рускамоўнай паэткай,
*Опевающей*
*Северо–Западный край.*

Гэты страх — той, зімовы, які выразна працінае сьвядомасьць, што дзеліць сьвет на сваё і чужое. Як працяг спрэчкі наконт мовы вяшчаньня «Нямецкай хвалі». Шматтыднёвыя дыскусіі — нішто ў параўнаньні з гэтым паэтызаваным страхам, гэтай апетай жыхаркай самага міталягізаванага зь беларускіх гарадоў небясьпекай страты сваёй ідэнтычнасьці, чалавечай і жаночай. Так чытаеш аб'явы на апошняй старонцы «Нашай Нівы»: «Мужчына шукае дзяўчыну-беларуску для стварэньня сям'і». Не пра этнічнае паходжаньне гаворка ідзе, не пра чысьціню крыві — а менавіта пра ўсьвядомленую ідэнтычнасьць. Таму, дарэчы, аб'явы гэтыя не раздражняюць, а навяваюць некаторую мэлянхолію. Так па-шчамялёўску сінім зімовым вечарам навявае мэлянхолію, раптоўна набыўшы колеравыя нюансы, сьнег.

Бо на самай справе ідэнтычнасьць — яшчэ адзін міт, яшчэ адна Атлянтыда, якой ужо не паднясца зь мінулага ў наша мітусьлівае «сёньня». Пра што будуць размаўляць вечарамі гэтыя мужчына-беларус і дзяўчына-беларуска? Пра Беларусь? Першы час — напэўна. А потым?

І шчасьце аказваецца эфэмэрным, як першы сьнег кожнай зімы, што надыходзіць зноў.

Мы з табой — не звычайныя людзі,
Ты — з герояў, я — слова на шкле.
Пераводу ў рэальнасьць ня будзе:
Казцы доўга ня жыць пры сьвятле.
І ніхто табе выдаць ня змусіць
Мой адзіны і жорсткі сакрэт:
З сонцам я да рэалій вярнуся,
Нелюбімы рэальным паэт.

Гэта — маніфэст зімовай паэтычнай творчасьці. Слова на шыбе — запаветны вензель па паэтычнай шэрані, які яшчэ Тацяна пушкінская гарачым пальчыкам сваім малявала. І вяртаньне да рэалій штодзённага жыцьця — з расталай зімовай казкі. Сонца зьнішчае прывідную выразнасьць ліній. Камень уцалець ад яго прамянёў здольны, лёд — не.

Тужліва, балюча, млосна,
Сьняжынкі перад вачыма…
Ня быць там — амаль невыносна.
Застацца там — немагчыма.

Немагчыма — таму што зіма не бывае вечнай. І выразнасьць ліній, уласьцівая зіме, зьнікае па меры адтаваньня чалавечай душы і дрэвавых сокаў. Жывому ўласьціва невыразнасьць — свабода, калі вяртацца да назвы зборніка Леры Сом.

Але невыразнасьць — неклясычная. А паэтцы Сом, якая жыве ў акружэньні помнікаў Гісторыі і Культуры, хочацца клясычнасьці. Сказваецца філялягічная адукацыя. І ажываюць напаўзамерзлыя паэтычныя формы, накшталт вянка санэтаў, ужо ў каторы раз дабітага Соф'яй Шах, — але гэты, сомаўскі (ці сомскі — даруйце, Лера, ня ведаю, як дакладней) вянок раптоўна ажывае, як ажываюць у танцавальным карагодзе сьняжынкі.

Кожны радок — клясычнай формы, як сьняжынка. Але разам завірухай яны праносяцца па белай прасторы кніжнай старонкі, каб застацца ў памяці — Сьнежнай Каралевай, чыя фігура і складаецца ў асьляпляльнай начной цемры з танцу сьняжынак.

Так нараджаецца Казка — таксама клясычны жанр.

Але даносіцца строгі голас абуранай паэтэсы:

— Не пішы пра мяне нічога,
Бо нічога і не было…
Што звадзіла, што разьвяло —
Не пішы пра мяне нічога.
Ці зрасьцецца тваё крыло?
Ці адолеецца зьнямога?..
Не пішы пра мяне нічога,
Бо нічога і не было.

Даруйце, Алена Ўладзімераўна, больш пісаць ня буду. Як загадаеце, Ваша Засьнежаная Вялікасьць.

ЛЁЛІК УШКІН

# Тайна чароўнай налепкі

гатычны дэтэктыў-квэст

Пачатак у «НН» № 46.




**Лябараторныя заняткі па выкліканьні ўраганаў у ЗША праводзіў лябарант Купэр. Перад вучнем Рудэнка было пастаўлена самае прымітыўнае заданьне: перакінуць зь Беларусі нейкі домік на тэрыторыю Штатаў.**

**Паколькі на беларускім чырвонцы была намаляваная Нацбібліятэка, на якні абрынуўся шэдэўр «бацькаўскай» архітэктуры. Адразу ж з'явіўся Майкл Мур, каб зьняць працяг свайго «Фарэнгейту»...**

**...аднак жудасны сцэнар Сьпілбэргаўскай кінамуці не паўтарыўся. Лябарант Купэр хацеў задаць дурню навуку, калі ў яго загудзела мабіла.**

**Эсэмэска ад дырэктара прыйшла ў разгар экзэкуцыі.**

**Працяг будзе.**

КАІСА

# Другая партыя Вылівахі

Тэкст першай партыі рагачоўца друкаваўся ў №45—46 «НН». У другой партыі Сьмерці дасталіся белыя фігуры, і…

«Латнік яе візыра зрабіў два крокі наперад. Вылівaха рушыў свайго».

**1. d4 d5 2. Кc3!**

Кашчавая зноў выбрала неардынарны для XVI ст. пачатак: дэбют імя Верасава, беларускага майстра XX ст., намякаючы на сустрэтую Вылівахам у палях Верасовую Жанчыну…

**2…b6?! 3. e4 de 4. Кe4 Cf5 5. Кg3 Фd5?! 6. c4.**

«Нечалавечая, вышэйшая, халодная і няўмольная разважлівасьць, якая не памыляецца, ваявала зь ім. Гервасій зразумеў, што ён сапраўды прапаў».

**6…Фa5+? 7. Cd2 Фa6 8. Кf5.**

«І неадольна, бы ў сьне, Сьмерць зрэзала Вылівахавага слана».

**8…Фc8 9. Cd3 e6 10. Кg3 Кc6 11. Кf3 Фb7 12. 0-0 0-0-0 13. Кg5 Кb4 14. Кf7 Кd3.**

«Сьмерць… злавалася і тым ня менш крышыла абарону Гервасія, як хацела… Ён зрэзаў слана Сьмерці і адразу страціў сваю ладзьдзю і латніка…»

**15. Кh8 Кb4 16. Cc3 Cd6 17. Фg4 Кpb8 18. Фe6 Кc6.**

У гэтай частцы партыі белыя зьдзекуюцца з партнэра: манэўруюць замест хутчэйшай атакі або пераходу ў выйграны эндшпіль.

**19. d5 Кce7 20. Кf7 Тc8 21. b4 Кg6 22. Фe1 Кf6 23. Кe5 Кpa8 24. a4 Кf8 25. f4 h5 26. Тf3 Ce7 27. Кf7 Тe8 28. Ce5 h4 29. Кe4 Кg4.**

«— На табе чару, — Сьмерць узяла чарговага латніка».

**30. Cg7.**

«…Вылівaха падставіў Сьмер-ці пятага свайго латніка, адначасова пасунуўшы рукавом пад бой яе ладзьдзю». У выніку тура з f3 трапіла на f2.

**30…h3.**

«Бязвокая зірнула зноў на дошку, якая яўляла сабою выгляд страшэннага разгрому. Усьміхнулася:

— Зараз табе мая ладзьдзя Роспачы… О, л-латнічак! Ану, галубок! Хадзі да змарлых…»

**31. gh.**

«Звонку было так, што ладзьдзя зараз уварвецца і скончыць разгром. Латнік Гервасія зьляцеў з дошкі… І тады рагачовец з грукатам зьняў падстаўленую ім жа самім ладзьдзю».

**31…Кf2 32. Кpf2?**

На гэта і разьлічваў Вылівaха. Сьмерць (жанчына!) пажадала расставіць фігуры «прыгожа», бліжэй да цэнтру, і «забылася» на шах збоку: «І унь табе яшчэ пагроза каралю. Гэта табе за «ласку» да мяне».

**32…Сh4+.**

«Кароль Сьмерці адступіў, адкрыўшы візыра за сваёй сьпінаю, кінуўшы яго ў бядзе». Вядома, тут неабходна 33. Кg3, але Сьмерць усё яшчэ кіруецца эстэтычнымі матывамі (конь лепш выглядае на e4).

**33. Кpf1 Ce1 34. Тe1 Фc8 35. Кpg2 Фf5.**

«Два шчыты перад адным мячом. Выбірай. Каню — слана або майму візыру — другую ладзьдзю».

**36. Кfg5 Кg6 37. Кg3 Фc2+ 38. Кpf1 Тe1+.**

«І ён зьняў ладзьдзю Роспачы».

**39. Кpe1 Кf4.**

«На дошцы літаральна за нейкую хвіліну ўсё зьмянілася. У сталёвым страі нападу зеўралі цяпер страшэнныя праломы. Войска Сьмерці сплывала крывёй. І, аднак, без абедзьвюх ладзьдзей, безь візыра і слана яна ўсё адно была мацнейшая за кожнага іграка на зямлі».

**40. Cd4 Фc1+ 41. Кpf2 Фd2+ 42. Кpf3 Фd4.**

«Другі слон Сьмерці заракатаў бакамі па стале. Вылівaха ўсьміхнуўся…»

**43. Кf5 Фe5 44. Кpg4 Кd3 45. h4 Фf4+ 46. Кph5.**

«І ён зьняў каня Сьмерці».

**46…Фf5 47. a5 Кf4+ 48. Кph6 Фg6X.**

«— Мат! — сказаў ён». І праз Сьвятое возера вярнуўся да народу, які «жыў насупор».

Шахматная партыя, дзе стаўкаю лёс чалавека, — досыць пашыраны сюжэт у сусьветным мастацтве. Ён сустракаецца ў Дзюрэра і Дэлякруа, а ў фільме Інгмара Бэргмана «Сёмая пячатка» (1956) рыцар прайграе Сьмерці і гіне, затое ратуе сваіх сяброў. Невыпадкова ў экзыстэнцыйным Караткевічавым творы зьявіліся менавіта шахматы: лягічныя і непрадказальныя, яны ёсьць мадэльлю жыцьця.

**Вольф Рубінчык,**
**rubinchyk@lycos.com**

ВАРТА БАЧЫЦЬ

### Пятніца, 16 сьнежня

**НТВ, 22.05**

«Апошні імпэратар».

Вялікабрытанія—Італія—КНР, 1987, рэж. Бэрнарда Бэрталючы.

Філязофская гістарычная драма.

Маленькі Пу І быў каранаваны на імпэратара, калі яму было тры гады. Неўзабаве была абвешчана рэспубліка, але 13 гадоў герой заставаўся закладнікам Забароненага гораду зь яго забытымі цырымоніямі й рытуаламі. Герой будзе візьнем — і ў турме, і імпэратарам Кітаю, і кіраўніком дзяржавы Ман-чжу-Го, створанай у 1937 г. японскімі акупантамі.

На падставе кнігі самога Пу І і ўспамінаў ягонага настаўніка Рэджыналда Джонстана Б.Бэрталючы стварыў гісторыка-філязофскае відовішча пра лёс, увязьненасьць, гісторыю й свабоду.

Дзевяць «Оскараў» за найлепшую карціну, рэжысуру, мантаж, музыку, апэратарскае майстэрства, працу мастакоў, касьцюмы,



сцэнарную адаптацыю. Прэмія «Сэзар» за найлепшую замежную карціну.

**АНТ, 22.30**

«Слова злодзея».

Вялікабрытанія—Аўстралія, 2002, рэж. Скот Робэртс.

Камэдыйны дэтэктыў.

Тры рабаўнікі-рамантыкі нават у турме ня трацяць надзеі і распрацоўваюць удалы плян, як узбагаціцца. Але таварышам перашкаджаюць пабочныя людзі: юрыст, юрлівая жонка, прадажныя паліцыянты. Замест таго каб атрымаць сваю долю і не перашкаджаць, праваахоўнікі самі зьбіраюцца правярнуць справу…

**НТВ, 22.45**

«Асноўны інстынкт».

ЗША, 1992, рэж. Пол Вэрховэн.

Эратычны трылер.

Сцэна допыту пісьменьніцы (Шэран Стоўн) агентамі ФБР увайшла ва ўсе фэміністыя хрэстаматыі, а гісторыя сьледства па справе маньячкі не давала заснуць гледачам. Знойдзены пад ложкам нож для лёду варта ўспрымаць з чорным гумарам…

### Субота, 17 сьнежня

**АНТ, 13.10**

«Сабака Баскервіляў», 2 сэрыі.

Расея, 1981, рэж. Ігар Масьленікаў.

Шэрлак Голмз і доктар Ўотсан на ангельскіх балотах раскрываюць тайну старажытнай легенды пра сабаку-забойцу…

Паводле прызнаньня саміх брытанцаў, найлепшы Ш.Голмз усіх часоў і народаў — ВасільЛіванаў.

Заўважым, сабачка, як для савецкага фільму, ня самы лядашчы.

**НТВ, 21.40**

«Грошы вырашаюць усё».

ЗША, 1997, рэж. Брэд Ратнэр.

Камэдыйны баявік.

Дробны шахрай Франклін Гатчэр уцягнуты ў прыгоды з гангстэрамі, дыямэнтамі і паліцыяй, якая палюе на героя. Адзіная дапамога — звольнены за бяздарнасьць журналіст Джэймз Расэл (Чарлі Шын). Парачку небарак чакаюць уцёкі, перастрэлкі і жартачкі.

Сцэнар карціны склаў Джоэл Коэн («Вялікі Лябоўскі»). Фільм — дэбютная стужка Брэда Ратнэра («Чырвоны дракон»).

**БТ, 22.20**

«Арсэн Люпэн».

Францыя—Італія—Гішпанія—Вялікабрытанія, 2004, рэж. Жан-Поль Салямэ.

Авантурна-прыгодніцкі фільм паводле твораў Марыса Лебляна.

Францыя XIX ст. Арсэн Люпэн, які навучыўся зладзейскім звычкам ад свайго бацькі, крадзе каштоўнасьці ў пасажыраў вялікага карабля і ратуе ад сьмерці графіню Каліёстра.

Намінацыя на прэмію «Сэзар» за найлепшыя касьцюмы.

### Нядзеля, 18 сьнежня

**БТ, 22.20**

«Расплата».

Францыя, 2003, рэж. Жыль Пакет–Брэнэр.

Крымінальны баявік.

Кепскія паліцэйскія Гамэз і Таварэз расьсьледуюць забойства. Ім і перашкаджаюць гангстэры ды ўласнае кіраўніцтва. Эўрапейскі камэрцыйны прадукт пра барацьбу нягоднікаў і падонкаў.

**Андрэй Расінскі**

## ВЫСТАВЫ

**Падарункі**

У павільёне НВЦ «Белэкспа» (вул.Я.Купалы, 27) **з 20 да 31 сьнежня** працуе XI выстава сувэніраў і падарункаў «Навагодні кірмаш–2005».

**Перадкалядны кірмаш**

У НВЦ «Белэкспа» (Машэрава, 14) **з 23 сьнежня да 5 студзеня** — выстава–кірмаш «Нараджэньне Хрыстова».

**Ялінка handmade**

**З 15 да 22 сьнежня** ў «Падземцы» (пр.Ф.Скарыны, 43) працуе выстава твораў Уладзіслава Стальмахова — жывапіс, графіка, арт–аб'екты, ялінка handmade. Уваход вольны.

## ІМПРЭЗЫ

**Рок-Каляды**

17 сьнежня ў Горках адбудзецца вялікі калядны рок–канцэрт. Пачатак а 16–й. Зайграюць: «Акрополь» (Смалявічы), «Шпіталь», «Цмокі» (Менск), «Сэрца цішыні» (Горкі) і інш.

**Час цыганоў**

Вечарына цыганска–беларускай паэзіі. У праграме — прэзэнтацыя кнігі В.Калініна «Сны цыганоў», выступ музычнага калектыву «Рамані Гілёры», вершы і музычныя творы беларускіх цыганоў. **21 сьнежня** а 18–й. Дом літаратара (вул.Фрунзэ, 5).

**Дадуць джазу**

**21 сьнежня** ў кавярні «Добрыя мыслі» (вул.Магілёўская, 12) адбудзецца канцэрт Сяргея Пукста і ягонай групы з праграмай «Пукст–джаз». Пачатак а 20–й.

## ТЭАТРЫ

**Опэра** *(На сцэне Беларускай дзяржаўнай філярмоніі.)*

**20** (аўт) — творчы вечар Ніны Шарубінай.

**Купалаўскі тэатар**

**19** (пн) — «Чычыкаў».
**15** (чц) — «Ідылія».
**16** (пт) — «Памінальная малітва».
**17** (сб) — «Ажаніцца — не журыцца».
**18** (ндз) — «Ромул Вялікі».
**21** (ср), **22** (чц) — «Тутэйшыя».
**23** (пт) — «С.В.».
**24** (сб) — «Івона, прынцэса Бургундзкая».

*Ранішнія спэктаклі*

**18** (ндз) — «Ажаніцца — не журыцца».

*Малая сцэна*

**21** (ср) — «Востраў Сахалін».

**Тэатар беларускай драматургіі**

**15** (чц), **22** (чц) — «Кароль Лір».
**16** (пт) — «Адвечная песьня».
**17** (сб) — «Паўночная цішыня».
**18** (ндз) — «Нязваны госьць».
**20** (аўт) — «Містэр розыгрыш».
**21** (ср) — «Чорны квадрат».
**23** (пт) — «Кабала сьвятош».
**24** (сб), **25** (ндз) — «Ганна ў тропіках».

**Тэатар імя Горкага**

**16** (пт), **24** (сб) — «Дзядзькаў сон».
**17** (сб), **25** (ндз) — «Ніначка».
**18** (ндз) — «Даходнае месца».
**20** (аўт) — «Суцяшальнік удоў».
**21** (ср) — «Перад захадам сонца».
**22** (чц) — «Анджэла ды іншыя».
**23** (пт) — «Адзіны спадкаемца».

# Кася Камоцкая



**20 сьнежня** (аўторак), управа БНФ.

Пачатак а 17–й.

Прэс–канфэрэнцыя з нагоды выхаду альбому «Акустыка». Адказы на пытаньні, невялічкі канцэрт, конкурсы.

## КЛЮБНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

**«Рэактар»** (649–08–88, 766–24–25)

**22** (чц) 19.00 — сярэднявечная дыскатэка з гуртам «Стары Ольса».

## КІНО Ў МЕНСКУ

**«Аўрора»** (253–33–60)

«Легенда Зора» (2с): **16** (пт) 18.30, 21.00; **17, 18** (сб, ндз) 16.00, 18.30, 21.00.
«Дзіця»*** («Кінафармат 4х4»): **16** (пт) 17.00, 19.00, 20.50.
«Сорак адценьняў суму»*** («Кінафармат 4х4»): **17** (сб) 17.00, 19.00, 20.50.
«Першыя на Месяцы»*** («Кінафармат 4х4»): **18** (ндз) 17.00, 19.00, 20.50.

**«Бярэсьце»** (272–87–91)

«Трымайся да канца»***: **16—18** (пт—ндз) 17.30.
«Кінг Конг» (прэм'ера, 2с): **16** (пт) 20.00; **17, 18** (сб, ндз) 14.00 (іл), 20.00.

**«Дом кіно»** (266–35–26)

«Далей ад цябе» (2с): **16** (пт) 16.30 (іл), 19.00, 21.30; **17, 18** (сб, ндз) 16.30, 19.00, 21.30.

**«Дружба»** (240–90–13)

«Паміж небам і зямлёй»: **16** (пт) 19.00; **17** (сб) 16.30 (іл); **18** (ндз) 21.20.
«Далей ад цябе» (2с): **16** (пт) 16.30 (іл), 21.00; **17** (сб) 18.30, 21.00; **18** (ндз) 16.30 (іл), 19.00.

**«Кастрычнік»** (232–93–25)

«Кінг Конг» (прэм'ера, 2с): **16** (пт) 13.30, 17.00, 20.30; **17, 18** (сб, ндз) 13.30 (іл), 17.00, 20.30.

**«Масква»** (203–14–48)

«Кінг Конг» (прэм'ера, 2с): **16** (пт) 16.50, 20.20; **17, 18** (сб, ндз) 13.00 (іл), 16.50, 20.20.

**«Мір»** (288–22–33)

«Закахайся ў мяне, калі наважысься»: **16—18** (пт—ндз) 17.00, 21.20.
«Далей ад цябе» (2с): **16—18** (пт—ндз) 19.00.
«Паміж небам і зямлёй»: **16—18** (пт—ндз) 16.00 (іл).
«Першыя на Месяцы»*** («Кінафармат 4х4»): **16** (пт) 18.30, 20.30.
«Тоні Такітані»*** («Кінафармат 4х4»): **17** (сб) 18.30, 20.30.
«Дзіця»*** («Кінафармат 4х4»): **18** (ндз) 18.30, 20.30.

**«Перамога»** (203–77–66)

«Тоні Такітані»*** («Кінафармат 4х4»): **16** (пт) 14.30, 16.00, 17.30, 19.00, 20.30, 22.00.
«Дзіця»*** («Кінафармат 4х4»): **17** (сб) 13.00 (іл), 15.00, 17.00, 19.00, 21.00.
«Сорак адценьняў суму»*** («Кінафармат 4х4»): **18** (ндз) 13.00 (іл), 15.00, 17.00, 19.00, 21.00.

**«Піянэр»** (227–64–87)

«Басанож па бруку»: **16** (пт) 15.00, 19.00; **17, 18** (сб, ндз) 19.00.
«Кроў за кроў»***: **16—18** (пт—ндз) 17.00, 21.00.

**«Салют»** (247–41–67)

«Кінг Конг» (прэм'ера, 2с): **16** (пт) 17.00, 20.30; **17, 18** (сб, ндз) 13.00 (іл), 17.00, 20.30.
«Ня хлебам адзіным» (прэм'ера): **17, 18** (сб, ндз) 11.00.

**«Цэнтральны»** (200–34–16)

«Паміж небам і зямлёй»: **16** (пт) 11.00, 13.00, 15.00; **17, 18** (сб, ндз) 11.00 (іл), 13.00, 15.00.
«Сорак адценьняў суму»*** («Кінафармат 4х4»): **16** (пт) 17.00 (на мове арыгіналу з расейскімі субтытрамі), 19.00, 21.00. «Першыя на Месяцы»*** («Кінафармат 4х4»): **17** (сб) 17.00, 19.00, 21.00.
«Тоні Такітані»*** («Кінафармат 4х4»): **18** (ндз) 17.00 (на мове арыгіналу з расейскімі субтытрамі), 19.00, 21.00.

(2с) — кінафільм падоўжанай працягласьці
(іл) — ільготны сэанс (зьніжка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 гадоў не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 гадоў.

## ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

**Тэатар**

**Тэатар юнага гледача**

**15** (чц) — «Апошняя дуэль».
**16** (пт) — «Гісторыя каханьня Паласатага ката і сыньярыты Ластаўкі».
**22** (чц), **23** (пт), **24** (сб), **25** (ндз) — «Падарунак для Сьнягуркі».

**Тэатар беларускай драматургіі**

**18** (ндз) — «Айбаліт, Бармалей, пра жывёл і Брадвэй».

**Кіно**

**«Аўрора»**

«Маленькія ўцекачы»: **17, 18** (сб, ндз) 14.00.

**«Бярэсьце»**

«Наш чалавек у Сан–Рэма» (да Дня беларускага кіно): **16** (пт) 15.00.
«Блізард»: **17, 18** (сб, ндз): 12.00.

**«Дом кіно»**

«Шчаўкунок»: **17, 18** (сб, ндз) 12.00.

**«Дружба»**

«Неймаверныя прыгоды дыназаўрыка Барні»: **16** (пт) 12.00, 14.30; **17, 18** (сб, ндз) 13.00.
«Вялікі эгаіст» і іншыя мультфільмы: **17, 18** (сб, ндз) 11.00.

**«Мір»**

«Дзеці шпіёнаў–3D: гульня скончана»: **17, 18** (сб, ндз) 14.00.
«Дунечка»: **17, 18** (сб, ндз) 15.00.

**«Піянэр»**

«Кніга джунгляў–2»: **16—18** (пт—ндз) 11.00.
«Пітэр Пэн»: **16—18** (пт—ндз) 13.00.
«Глыбокая плынь»: **17, 18** (сб, ндз) 15.00.

**«Салют»**

«Чуча»: **16** (пт) 14.00.

## КІНО НА DVD

**Master Records**

«Плюшавы сындром».
Камэдыя, Францыя, 2005, рэж. **Вінсэнт дэ Брус.**
У ролях: **Крыстыян Кляўе, Жак Віерэ, Аньес Сараль.**
Уплывовы фінансіст Жак Марці захварэў на паталягічнае заіканьне. Але хутка знайшліся лекі ад нэрвовай пакуты. І не бяда, што «пігулка» — крытыкан–бухгальтар з пацешным тварам і звычкай разводзіць піраній…

**Менск, Кісялёва, 12, 643-21-08**

# Пакажыся, Дзед Мароз!

У Рэдакцыю зьвярнуліся бацькі, папрасілі вершыкаў, якія можна было б з дзецьмі развучыць да Каляднага ранішніку. З прыемнасьцю друкуем.

НОС ДЗЕДА МАРОЗА

На дварэ марозны ранак.
Хлопчык выскачыў на ганак:
— Пакажыся, Дзед Мароз,
Дай зірнуць мне на твой нос.
Ці ён сіні, ці зялёны,
Ці ён чорны, ці чырвоны?
Я цябе намаляваў,
Толькі нос не фарбаваў.
Двор Якубка абабег.
«Дзе ж той Дзед?» —
Навокал сьнег.
«Дзе Мароз той?» —
Невядома.
Зьмерз Якуб, пабег дадому.
Глянуў хлопчык у люстэрка:
— Дзе аловак, дзе паперка!
Зараз, зараз, Дзед Мароз,
Пафарбую я твой нос.

ЗІМА

Сёньня першы дзень зімы.
І сьняжынкі ловім мы.
А сьняжынкі — жартаўніцы:
На руках адна вадзіца.

ПЕРАД НОВЫМ ГОДАМ

Лыжы мчацца.
Што за крос?
Гэта едзе Дзед Мароз.
Дзед ляціць, як чэмпіён,
Бо сьпяшае ў краму ён.
Купіць футра там другое:
Закароткае старое.
Шапку, шалік, рукавіцы
Абнавіў Дзед у хімчыстцы.
Барада ў яго да пят —
Так ня пойдзеш у дзетсад.
У цырульню едзе Дзед —
Падстрыгуць яго як сьлед.
Дзынннн! — будзільніка сыгналы.
Едзе Новы год з вакзалу.
Дзед Мароз надзеў абновы —
Новы год страчаць гатовы.
І на ранішнік якраз
Прыйдзе Дзед Мароз да нас.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Няслабы хуліганскі кактэйль

**«Закахайся ў мяне, калі наважысься» («Jeux d'enfants»).**

**Бэльгія—Францыя, 2003, каляровы, 93 хв.**

**Жанр:** рамантычная драма з камэдыйнымі элемэнтамі.

**Адзнака:** 6,5 (з 10).



Маленькія Сафі й Жульен даводзяць дарослых да шаленства блазнаваньнем. Гарэзьнікі выпрабоўваюць адно аднаго на «слабо — не слабо»: «А слабо скінуць вясельныя пачастункі, заліць чарнілам настаўніцу ці сьпець на могілках рамантычную песьню?»

З узростам стаўкамі ў гульні становяцца жыцьцё й каханьне: стаць перад цягніком з завязанымі вачыма, сказаць нявесьце «Не» на вянчаньні, «закахацца, калі толькі наважысься».

За жорсткімі гульнямі хаваецца неабароненае каханьне, але героі так загуляліся, што сталі закладнікамі блазенскіх правілаў.

Рэжысэр Ян Самуэль прапануе гледачам хуліганскі кактэйль, настоены на іроніі «Амэлі», пашкуматаным «Любоўным настроі», чорным гумары і дзіцячым трызьненьні.

Камэра дыхае нязмушана, мантажныя пераходы лёгкія, іранічныя, колеры — чорна–белыя й стракатыя, як дзявочыя станікі, апранутыя паверх афіцыйнай формы.

Як і рызыкоўныя пэрсанажы арт–хаўсных «Дыска–сьвіньняў», Жульен і Сафі (Гіём Канэ і Марыён Кацiяр) выпрабоўваюць уласнае каханьне небясьпечнымі гульнямі, аднак сюжэт паўтарае, як заезжаная кружэлка, адзін матыў.

Для аматараў галівудзкага хэпіэнду фінал станецца цяжкім шокам — але гэта толькі чарговая гульня ў «слабо — не слабо».

**Андрэй Расінскі**

# Добрая навіна

ЛЕВЫМ ВОКАМ



Я, натуральна, маленькі мураш, якога кожную хвіліну можна па 153 артыкуле КК адправіць на нары, аднак асьмелюся прасіць Вашу Вялікасьць... Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

Апошнім часам стала прыкольна езьдзіць у тралейбусах. Цяпер на прыпынках пасажыры ўважліва скануюць надыходзячую машыну на прадмет бясьпекі. Быццам «тралейбус-забойца» павінен цягнуць за сабою жмут аголеных правадоў і зіхацець, як дыскатэка. У салёне людзі рухаюцца больш асьцярожна, намагаючыся трымацца выключна за ізаляваныя парэнчы, чым нагадваюць кульбіты Джона Сыльвэра на палубе карвэта, што трапіў у шторм. Выразы твару некаторых сьведчаць, што яны знаходзяцца ў экзыстэнцыяльным трансе: «Заб'е — не заб'е, а калі заб'е — чаму? Можа, таму, што няправільна жыў?»

Стаўлю зуб, што адзін з тых, хто міжволі стаў сьведкам надзвычайнага здарэньня, перад тым як сесьці ў тралейбус, выпадкова зрабіў нейкую экстравагантную рэч — напрыклад, выкінуў «Саўбелку» ў сьметніцу са словамі «Кітай, Кітай!.. Хіба той Ху… (Выразана цэнзурай. — **Рэд.**) Цзіньтао мне жыроўку аплаціць?!» Цяпер ён лічыць, што гэта выратавала яму жыцьцё, і, ідучы на транспарт, абавязкова скланяе імя старшыні КНР. А днямі я бачыў каргу, якая перад тым, як стаць кліентам «Менсктрансу», ахінула пэрпэтум мобіле крыжам. На нашых вачах фармуецца нейкая новая культура стаўленьня людзей да машын.

Мы назіраем першыя праблíскі ерасі, якая відавочна стане даміноўнай ірацыянальнай дактрынай XXI ст. Татальная залежнасьць чалавека ад тэхнікі правакуе этыку пакланеньня перад вышэйшым машынным розумам. Хіба не ад яго залежыць, ці ты будзеш нармальна жыць і зарабляць, ці твой комп лясьнецца, і табе давядзецца тыдзень бегаць па кампутаршчыках у пошуках нейкай WinFast PX6600 TD 256MB DDR2.

Дзіўным чынам беларусы апынуліся ў авангардзе трэндаў чалавечай думкі. Гэта ставіць перад намі цікавае пытаньне: што рабіць далей? Магчымыя адказы:

а) пусьціць справу на самацёк. Калі найбліжэйшым часам на тралейбусных лініях нічога не здарыцца, забабоны разьвеюцца, і мы зноў будзем бестурботна на халяву езьдзіць 29-м на Камароўку, выразаючы на сьпінках тралебуйснага крэсла «Шахцёр — чэмпіён» або «Луку на муку»;

б) выкарыстаць момант, пнуць Філарэта і ўвесьці культ галоўнай машыны (кампутара) па вэрсіі монатэістычных рэлігій, а тралейбусаў, якія мочаць токам, трактаваць як камісараў вышэйшай сілы накшталт арханёлаў.

Натуральна, апошняе слова належыць Яму. Калі заўтра «Саўбелка» паўмільённым накладам не абвесьціць, што 24 сьнежня — дзень нараджэньня сына паўправадніка, фіг што выйдзе.

Я, натуральна, маленькі мураш, якога кожную хвіліну можна па 153 артыкуле КК адправіць на нары, аднак асьмелюся прасіць Вашу Вялікасьць яшчэ раз усё ўзважыць.

Што лепей — заставацца нейкім славянскім Труворам ці стаць апосталам новай сусьветнай рэлігіі, якая позна ці рана запане на плянэце? Альбо чалавецтва праз 20 гадоў будзе пачынаць перазагрузку зь «Біл Гейтс іжэ ясі на небясі», альбо…

P.S. Калі вы зробіце выбар на карысьць другога варыянту, можна, я буду «Лёлікам Прадцечам»?



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**10 сьнежня ў катэдры кардынал Казімер Сьвёнтак каранаваў абраз Імя Марыі Беззаганна Зачатай, падараваны Менску Янам Паўлам ІІ. Падчас урачыстасьці зайграў новы арган, падораны біскупатам Аўстрыі. Пакланіцца іконе прыйшлі тысячы людзей. Авэ, Марыя.**

## АД РЭДАКЦЫІ

### Што калі «НН» ня прыйдзе?

**Яшчэ адзін нумар, і «НН» будзе выдавацца і распаўсюджвацца па-новаму.** У працэсе распаўсюду ня выключаныя збоі. Таму вельмі просім усіх тых, хто паведаміў у Рэдакцыю свой адрас і пераказаў ахвяраваньне на рахунак, але не атрымае першага нумару газэты за 2006 год да 6 студзеня 2006 году скантактавацца з Настай Бакшанскай праз тэлефон, э-адрас ці ў любы іншы спосаб.

**Спадары Ахраменка В.К, Жукоўскі К. і Аліна Н.,** калі ласка, дашліце Вашыя адрасы. Спадарыня **Н.Ч-ка з Баравікоў**, калі ласка, дашліце свой дакладны адрас. Дзякуй Вам за ахвяраваньні.

## ЖАРТ

Ноў-хаў беларускіх вытворцаў, вынік канвэрсіі ВПК. Уранавая патэльня з тэфлёнавым пакрыцьцём. Смажыць ня толькі без алею, але і без агню.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ


### ВІТАНЬНІ

**З Раством Хрыстовым** і Новым годам, шаноўныя беларусы! Зьдзяйсьненьня вашых плянаў і мараў! Б.Г.

**З 2006 годам Вас**, нашчадкі ВКЛ і БНР! Трубеце ў трубу парою маладзіковаю! Да Перамогі!

**Маладафронтаўцы** віншуюць Алеся Панцялея з днём народзінаў і жадаюць яму творчых і жыцьцёвых перамог. http://mfront.net

### КАНТАКТЫ

**Менчукі!** Калядкі блізкі. Гуртуймася ў калядную хеўру! Пойдзем разам калядаваць. Т.: 257–93–11, Алесь

**Кнігу** Паўла Севярынца «Нацыянальная ідэя» можна знайсьці на сайце www.mfront.net

**Выказваем абуранасьць** з прычыны выключэньня Тані Хомы з унівэрсытэту. Студэнты, чаму маўчыце?

### КНІГІ

**Прапаную**: «Беларускі клясычны правапіс», «Нашу Ніву» (факс. выд.), «Матэматычную энцыклапэдыю», дзіцячыя кніжкі, пісаныя клясычным правапісам, камплект падручнікаў па старабеларускай, старарускай мовах і іншае. Т.: 753–91–96

### ПРАЦА

**Французская мова:** заняткі, кантрольныя, пераклады. Т.: 616–93–29

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца пасьля 17-й. Т.: 235–18–72


Прыватныя абвесткі ў «НН» (ня больш за 15 словаў) дасылайце поштай (а/с 537, 220050 Менск), праз e-mail (nn@promedia.by) або разьмяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

М. **Валожын**, Віл. губ. Ашм. пав. Жыве ў нас адзін дужа працавіты і рупны чалавек, Міхась Маеўскі. Ён, не шкадуючы ні сваёй працы, ні здароўя, вось ужо колькі год працуе над тым, каб наладзіць добры хор пеўчых у Валожыне. Народны хор — гэта дужа важная рэч, і той, хто яго арганізуе, вялікую заслугу мае перад народам, асабліва калі разьвівае родную беларускую песьню, што дагэтуль была ў поўным загоне.

**Янка Зэрэцкі**

В. **Раўкуцевічы**, Віл. губ., Вялейск. пав. Небывалае надвор'е! Мікола [6 сьнежня] мінуў, а сьнегу ані відаць. Мокра, але цёпла. На лягчэйшых землях скранулася рунь. Людзі і з сохамі павылазілі, а бачыў я аднаго гаспадара, каторы праспаў восень, дык цяпер жыта сеяў. Дарогі — ані праехаць: урваліся заработкі. Пучкі бэзу разбухлі так, як бы думалі распусьціцца. Птушкі і тыя падурнелі: некаторыя прабуюць пяяць, вераб'і зьбіраюцца на гнёзды, але закладаць іх саромяцца.

**...ун**

**«НН» №51 за 1910 год**


**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**


© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.

12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

**Наклад 3434.** **Газэта выдаецца 48 разоў на год.**

Нумар падпісаны ў друк 20.00 14.12.2005.

Замова № 7136.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а